Дарогі, сустрэчы, уражанні... І вечны спадарожнік літаратара, памочнік яго памяці — блакнот. Год за годам, блакнот за блакнотам... Адно з запісанага ўвайшло ў аповесці, апавяданні, нарысы. Другое — чакае чаргі. А іншае — просіцца быць самастойным мастацкім творам.

І вось пісьменнік прапануе ўвазе чытача сваё захапленне жыццём, чалавекам, прыродай, сваю любоў, нянавісць і смутак, усмешкі і роздум.

Лірычныя нататкі Янкі Брыля падаюцца ў тым, амаль некранутым, выглядзе, як яны праляжалі ў непасрэдных запісах, — што год, што пяць, а што і дваццаць пяць гадоў.

Янка Брыль

Жменя сонечных промняў

Якія жудасна шчаслівыя гады і дні нашай любові, дружбы, і як жа часта мы марнуем іх на пустое!..

Дзіва, шчаслівае дзіва бярэ — колькі яе, прыгажосці, і як я мог жыць, не бачыўшы да сарака пяці... ну, скажем, возера Лукаўскога, з векавымі дубамі і шэрымі крыжамі на касе, або магутнай, ласкавай Гарыні?..

Прыгажосць назіралі мы спачатку з акон зялёнага «кукурузніка», які нас, трох следапытаў народнага слова, нёс над астраўкамі палёў, над лясамі і шчодра залітымі сёлета балотамі Піншчыны. Нізка ляцелі — адно любуйся. Але нядоўга. Толькі што ўзняўся, здаецца, наш ПО-2, а ўжо і садзіцца на прылясную паляну траскучаю птушкай. Уяўляю, што нават і «ногі» наставіў насустрач зямлі, нібы грак. Селі, ідзіце, нюхайце добрае жыта ды бульбу ў белай, густой квецені. Хоць ты з дарогі збоч ды паляжы ў іх ніцма...

Давыд-Гарадок.

Можна злятаць на Марс, зярнуцца адтуль і застаць над Гарыннію ўсё тую ж бабку з вудай. Стаіць старая, як і стаяла сотні гадоў, спакойна і абыякава. Закідае па-бабску смешна, цераз галаву, паплёўвае на чарвяка, зрэдку здымае ў вядро краснапёрку... Многа іх тут, рыбакоў жаночага полу, відаць, ад пяці і да ста, і нікому такое не дзіўна.

Светлая хата над самай ракой. У гародзе растуць толькі кветкі, якія тут здавён сеюць на насенне, і вельмі любяць, здаецца,— не проста гандлююць. «Анюціны вочачкі», — расчульвалася цётка над сітам з мікраскапічным россыпам несення. Гаспадар, талковы і ветлівы дзядзька, ахвотна даў нам за сходную плату маторнай лодкі, паслаў з намі хлопца, загарэлага дзевяцікласніка.

Так мы глядзелі Гарынь, а потым Прыпяць. Трохі вудзілі, прыпыніўшыся ў спакуслівай мясціне, а больш любаваліся, з бадзёрым грукатам летучы па празрыстай і ціхай вадзе.

Усе прыгожа, аднак жа белыя «гускі» ў Воўчым возеры, у якое мы неўзабаве ўвайшлі з чарнаводнай, спакойнай і крыху не цераз верх перапоўненай Прыпяці,— прыгожыя асабліва. На суцэльным зялёным насціле іхніх лістоў самі «гускі» — ну, проста гусіная ферма, вялізная, толькі без гогату, і мы пайшлі тут без грукату, на вёслах, марудна разганяючы лодкай зялёна-белы цягучы насціл. Зблізку кветкі напаміналі мне жывое яшчэ з маленства ўяўленне: разрэзанае крутое яйка... Не, гэтым разам,— можа, ад думак пра бомбы і дзяцей, ад цяжкіх думак, якімі закончыўся мой учарашні дзень,— «гускі» здаваліся мне складзенымі далонькмі ручанятак з гульліва настаўленымі, як пялёсткі, пальцамі...

А зверху — раскошнае сонца і белыя воблакі. Плывуць паволі, амаль не плывуць. і высока, высока!..

Потым, падвечар, нас калаціў на калдобах аўтобус. Нібы спецыяльна наняты, каб так калаціць. Але ўсё роўна мы любаваліся і полем абапал дарогі, і хатамі пад цяжарам буслянак, і сонечным лесам...

Душою нашай пасажырскай кампаніі была разбітная, яшчэ не старая, цыганка. Расказвала, добра па-беларуску, пра найбольшае шчасце свае валачашчае маладосці, — як яна, седзячы побач з бацькам на возе, праехала з цэлым табарам, дарагія начальнічкі, цераз усю Варшаву!.. Пасля ўспамінаў яна пусцілася ў тэорыю — пачала нам тлумачыць іх цягу да вандравання. Гаворачы, час ад часу пакрыквала на Гарасіма, свайго басаногага хлапчука, што ўсё лез, выхіляўся з акна.

Пасля ў аўтобусе спявала скрыпка.

Іграў стары цыган. Без шапкі, лысы, у салдацкіх галіфэ і цяжкіх з выгляду кірзавых ботах. Мы дагналі яго на выездзе з чарговай вёскі, шафёр сам спыніўся, а «бацька» адразу, толькі ўмасціўшыся на заднім сядзенні, сам пачаў іграць. За праезд. Па прывычцы.

Яна і спявала, і плакала, і рассыпалася смехам — ягоная скрыпка. І гэта было незвычайна да самай сапраўднай радасці — там, у глухім палескім лесе, на турботнай і пыльнай дарозе!..

Ды тут адзін з нас памыліўся... Проста не ведаў, што выйдзе з гэтага,— узяў свой фотаапарат і зняў музыку. Раз, пасля, для пэўнасці, яшчэ раз, і скрыпка змоўкла.

Цыган і цыганка загаманілі па-свойму, гучна і незразумела. Пасля стары палажыў скрыпку ў футляр, узяў мяшок, падышоў да шафёра, азірнуўся на нас і пакратаў яго за плячо. Аўтобус спыніўся. Музыка выйшаў, проста ў лесе, і, выходзячы, зноў азірнуўся...

Цыганка расказала нам, што жонку гэтага чалавека ў вайну расстралялі фашысты. Сам ён хаваўся з маленькім сынам. Пасля вайны малога забралі ў дзіцячы дом. А бацька ходзіць. Не проста ходзіць, а вось ужо васемнаццаць гадоў уцякае ад тых, што забілі жонку, што і яго шукаюць, каб забіць... Па фотаапараце ён «здагадаўся», што і мы — таксама ад тых, што шукаюць яго, і таму вось уцёк...

— Няшчасны чалавек, начальнічкі... А чулі, як ён іграе?.. А як ён танцуе нашы цыганскія танцы! Піша!.. Гарасім, не выхіляйся, дурніца,— зачэпіць галаву ды выцягне!..

У лесе — сонца і цені. Малы аўтобус трасецца па карэнні і па калдобінах.

А скрыпка спявае. Сардэчна і сумна. Хоць весела як быццам, але вельмі сумна!..

Хоць музыка, з мяшком за плячыма і з футаралам пад пахай, ідзе цяпер недзе далека за намі.

Такі беспрытульны ў нашым сонечным свеце!..

Парыж. Кафэ «Мадрыд».

За шкляною сцяной мноства хвалістых папугайчыкаў. Цалуюцца сабе пры людзях, як сапраўдныя французы. Афіцыянткі ў брэтонскіх нацыянальных касцюмах. Ветлівы малады дырэктар добра гаворыць па-нямецку; скромна хваліўся, што ведае рускую літаратуру, гутарку пра якую пачаў з Дастаеўскага.

Старая, кульгавая, з кіёчкам, у дарагім футры, хоць на дварэ пагодлівы, цёплы кастрычнік, мадам прыходзіць есці вельмі акуратна. Есць доўга, старанна глытаючы процьму вустрыц, старанна фарбуючы губы пасля яды...

Адной з афіцыянтак я падарыў некалькі маляўнічых паштовак з аўтографамі нашай турысцкай групы. Яна знайшла на адвароце паштоўкі серп і молат, паказала на іх пальчыкам, усміхнулася і ўзняла кулак: «Рот фронт!» Пры дапамозе дырэктара расказала нам, што брат яе, рабочы сцэны пры «Камэдзі Франсэз», быў летась у Маскве. Слова «брат» яна сказала па-французску, па-англійску і, за мной, па-нашаму... Мілая, баявая чарнушка.

Тым часам да старой мадам за суседнім сталом падсела другая. Гэтае «брат», «рот фронт!» і ўсё шчабятанне дзяўчыны з намі абурылі абедзвюх мадам. Яны паклікалі афіцыянтку да сябе і доўга, нудна скрыпелі на яе, дакараючы. Пасля паклікалі дырэктара. Злёгку і з годнасцю схіліўшыся, ён слухаў іх з прафесійна ветлівай цярплівасцю: кліенткі, мусіць, даўнія.

Дзяўчына — каля нашага стала — усміхалася, нават і падміргнула мне на тых, а на развітанне дэманстрацыйна ўсім нам паціснула рукі і зноў з мілай усмешкай узняла кулачок — «рот фронт!»

У клубе добрага калгаса сход. Больш за сто цётак і дзяўчат атрымліваюць медалі Усесаюзнай выстаўкі — за лён, якім славіцца гэты куток Наднямоння.

Смешнавата-ўзварушлівы шык. Людзі гэтыя лепш умеюць працаваць, чым браць узнагароды. Кожная, каго выклічуць, выходзіць з натоўпу, няёмка ўсміхаючыся, ідзе да стала прэзідыума і загадзя трымае руку, каб падаць яе старшыні райсавета; «так, як і ўсе», ківае галавой і кажа «дзякуй». Дзяўчаты не вельмі прызвычаены пастукваць высокімі абцасікамі святочных туфляў. Медалі ўсе начэпліваюць адразу, толькі сеўшы, і радасна, як дзеці, усміхаюцца.

Сухенькая, смяшлівая бабка:

— Ну вось, січас і я украшу сваю грудзь!..

Ідзе, а усе дабрадушна смяюцца.

Выступаючы, большасць стараецца гаварыць, як і бабка, культурна: «Клімацічаскія ўсловія нам не дазволілі...»

Толькі адна кабеціна — пасля даведаўся: жыве ўдавой, сын, лейтэнанг, у арміі, дачка, студэнтка, у Мінску — гаварыла коратка і пасвойму:

— Семсот пукоў абабілі, а пяцьсот яшчэ не. Але абаб'ём і гэты. Што ж я тут буду болей гаварыць! Стараемся, як толькі можам, бо трэба.

Пасля сходу, вядома, танцы, і ільнаводкі, і маладыя настаўніцы мятуць польку — аж люба глядзець!..

Здаравенны хлапчына, якога з маленства, дзеля смеху, называлі Пётр Пятровіч, пры буржуазнай Польшчы пяць год сядзеў у турме «за камуну», у вайну быў у партызанах, а пасля вызвалення — з вельмі лёгкай рукі мясцовага начальства — узышоў на цярністую сцежку кіраўнічай працы.

Амаль непісьменнага хлопца прызначылі спачатку кіраўніком раённай канторы дзяржбанка, пасля загадчыкам нарыхтоўчай канторы, пасля старшынёй сельсавета і, нарэшце, старшынёй сельпо.

Кіруючы банкам, Пётр Пятровіч толькі падпісваў паперкі, што яму ні падсоўвалі, вельмі цьмяна ўяўляючы змест пераважнай большасці дакументаў.

— Што ты мне тутака плявузгаеш! — грымеў ён на бухгалтара.— Я падпісаў — усё! А мала табе раз — другі раз падпішу!..

У нарыхтоўчай канторы ён сам, і вельмі ахвотна, быў часамі грузчыкам, памагаў сваім хлопцам.

Як старшыня сельсавета, пабіў аднаго дэпутата. Слухалі на бюро райкома.

— Ну, я ж усё ж такі яго начальнік,— апраўдваўся Пётр Пятровіч.— Усе мы ўжо сабраліся, сядзім, яго чакаем. Раз я паслаў па яго, другі раз — не ідзе. Пайшоў я сам. Сядзіць, гад, ды зацірку мурзае. Ну, узяў я тую міску ды надзеў яму на галаву. Падумаеш — так ужо абрамізіў!..

У сельпо Пётр Пятровіч вельмі хутка замурзаўся сам. Не так замурзаўся, як замурзалі памагатыя.

І вось ён памёр недзе ў турме. Падпольшчык, партызан, дый хлопец, урэшце, нядрэнны, калі б яго не ўздымаць без патрэбы і меры...

А маці, якой «бог смерці шкадуе», увесь свой век пакутніца пры такім сыне, ідзе цяпер за дваццаць кіламетраў у райцэнтр, каб, можа, пенсію якую за Пятра далі...

Пішу ў кубрыку кацера, на раскалыханай штормам Татарскай пратоцы.

Маладзенькі матрос Віця расказваў мне сёе-тое з жыцця свайго ніўхскага народа. Нібы дапаўняючы тое, што я назіраў тут сам,— на рыбацкіх заездках, у пасёлку, у Нікалаеўскім краязнаўчым музеі. Сімпатычны дзяцюк, акуратны, з харошай усмешкай.

— Мая матуля кажа мне... Я вось ужо хутка пяць год карміцель у сям'і. Мне — не семнаццаць, як вам здалося, а дваццаць першы. Прабачце, я не сказаў вам, што я ўжо жанаты, што ў нас ужо хлопчык, сем месяцаў... Мая жонка — настаўніца з Сахаліна, таксама ніўхка, але гаворыць яна трошкі інакш, чым мы, амурскія ніўхі...

Слухаю, любуюся ім, такім разумным і чыстым.

Успамінаю ўчарашнюю тутарку з пажылым прафесарам-медыкам, што паспяхова змагаецца з касцявым тубэркулёзам у ніўхскіх дзяцей. і заўважаю радасна, як натуральна ўспрымаецца тут яна — наша роўнасць людзей і народаў.

Жнівень. Ялцінскі пляж..

Тоўсты, лысы таварыш, са шрамам колішняй раны на спіне. Качаецца, нібы цюлень, у марской пене, спакойна, нават абыякава адпырхваецца ад салёнай вады... І здаецца, хоць я і не бачыў яго апранутым, што на гэтых магутных плячах можа быць толькі гімнасцёрка раённага рабацягі, а на пузе — рэмень з камандзірскага спражкай. Партфель пакуль што недзе далёка, у адным з куткоў неабсяжнай радзімы, дзе ён адклаў яго толькі на месяц...

Побач — хлопец, таксама нядаўні франтавік, без нагі да калена. Увайшоўшы ў ваду, а яшчэ лепш — плывучы, напэўна ж здаволены, што і ён — зноў, як усе!..

Каб я быў мастаком, намаляваў бы сённяшні чатырохбальны шторм, а ў пене, у пяску, у мокрым грукаце хваль — па-дзіцячы радасныя твары людзей працоўных розных нацыянальнасцей — шахцёраў, настаўнікаў, ткачых... І дзяцей.

На хутары, дзе садок і гарод, і навокал, як мора, калгаснае жыта, бачыў жывы прататып казачнага Іванькі-прастака.

Дужы, рахманы дзяцюк. З гонарам расказвае, што ён усё-ўсё ўмее рабіць. Хоць і робіць толькі тое, што не патрабуе трохі большай кемлівасці: не косіць, але падае на воз, не коле дроў, але валочыць вёдрамі ваду са студні, якая больш за кіламетр ад хутара, у вёсцы... Малодшы брат, гаспадар, вазіў летась яблыкі прадаваць — з Наваградчыны ў Маскну — і купіў яму шапку, якой вельмі ж хацелася

— салдацкую, з чырвоным аколышкам. Яна вісіць на сцяне, любоўна загорнутая ў маміну хустку.

Увечары «дурань» зняў яе са сцяны, разгарнуў і надзеў — як карону.

— Куды ты, Іване?—пытаецца цярплівая і ціхая жанчына — маці.

— У кіно.

— Позна, сынок, яно там недзе ўжо канчаецца.

— А пад канец яшчэ цікавей.

Ды з такой жа дзіцячай усмешкай адказвае!..

— Малому дарогу саступіць,— кажуць пра хлопца сямейнікі.

І шкадуюць яго ўсе — і брат, і братавая, і сястра-школьніца, і дзед.

Дзед — цікавы і сам. Яму ўжо за дзевяноста. Накрыўшыся старой цыратай ад дажджу, пасе ў зялёным яры дзве каровы і жменьку авец. І вельмі рад, што вось ізноў, як людзі, бачыць. Бо толькі нядаўна яму знялі катаракту

— Як на свет нарадзіўся, сынок! — расказвае ён мне, неяк надзіва молада смеючыся.— А тыя разы, сляпым быўшы, дзяржу дзве каровы на павадах, а малыя толькі камандуюць: «Дзеду, лявей! Дзеду, правей!..»

Дзед есць зацірку толькі з хлебам і злуецца на ўнукаву жонку, калі зацірка рэдкая:

— Сама, відаць, хадзіла па ваду!..

Увечары выпіў з намі — цэлую шклянку самагону — і пачаў успамінаць. Ну, спачатку — бліжэйшае. Як ён на ўнукавым вяселлі «ўзяў» трошкі не літар і нават яшчэ «барыню паскакаў». Як сын яго, Лёўка, насіў у млыне на другі паверх па два шасціпудовыя мяхі за раз, узяўшы пад пахі, а потым — булава, царства яму нябеснае, напіўшыся п'яны, прастудзіўся за ноч у канаве і памёр... Пасля гэтых успамінаў, цікавых, але звычайных, ідуць такія, ад якіх ажно неяк трошкі вусцішна. Што памятае жывы чалавек!.. У другой палавіне дваццатага веку — успамінае пра турэцкую вайну!.. Праўда, на Шыпцы сам ён не быў — па пашы бегаў яшчэ, але ж палонных туркаў бачыў многа. У графскім маёнтку.

— Шапкі высокія, чырвоныя. Снапоў накладуць у параконныя кары — толькі ў драбіны, не болей, палягуць туды шасцёх і паехалі!.. Яшчэ, кажуць, пазвальваемся! Ха-ха-ха!..— рагоча, аж хіхікае, як малы.

Уранні папрасіў мяне зняць яго на картачку,— пад яблыняй, з маленькім праўнукам на каленях. Табурэтку паставілі ў бульбе, якая цвіце.

Над Відзамі страляе ў неба готыка касцёла. Чырвоная цэгла, шэры бляшаны дах. І легенда,— калісьці туды вунь, аж на саменькі вільчык, пад крыж, залез у кірмашны дзень нейкі вісус, пачаў там выраблящь, як у цырку, людзі раты паразяўлялі і глядзяць, а тут яго сябры тым часам шныраць, ліха іх зладзейскай матары, па вазах!..

На скверыку — помнік вызваліцелям, вялікі і стандартны абеліск. На дошцы прозвішчы салдат і афіцэраў, якіх ваенны лёс зрабіў героямі ў гэтых мясцінах. Наводшыбе, у зялёным, зацішным куточку сквера — магіла з чорнай пірамідкай. Надпіс: «Андрэю ад А. Кудрынскага». У каго ні пытаўся, хто яны, гэтыя людзі, адказ адзін: «Не ведаю. Кажуць, што нейкі палкоўнік...» Сумна.

Пахнуць па-хатняму грады, сакочуць конікі, стаіць вялікі жніўеньскі месяц, яшчэ не яркі, бо ранні вечар. Бабуля, калі я пацікавіўся, што за кветкі ў яе гародчыку:

— Не ведаю, ірву, палю, сынок, а яны ўсё растуць. А гэта мак.

І дала мне чырвоную кветку з белаю абдямоўкай на кожным пялёстку.

У чайной літоўскае піва і смачная каўбаса, і нудны, ветлівы сусед,. няголены здаравіла, які паволі, шчодра расказвае, як у маленстве маці апаіла яго макам, і вось ён цяпер не можа працаваць на адным месцы больш за тыдзень...

Ноччу сядзеў на ганку гасцініцы, слухаў і думаў, што да ўсёй гэтай ідыліі — з прыродным росквітам і маладымі песнямі ды смехам — не хапае сардэчнай, ціхай гітары. І чаму яна «выйшла з моды»?..

Па дарозе на Браслаў — куток свянцянскай Літвы, З кабіны грузавіка, праз нізкія вербы, відаць прымятае дажджамі жыта, бярозавыя, неакораныя жэрдачкі агароджы, жураўлі без вёдзер, мнагавата абдрыпаных хат. А то — ліпы, белыя вокны, за хатамі будынкі ў шнур, з шырознымі, ледзь не да самай зямлі, стрэхамі. Назвы населеных пунктаў: Калянкішкі, Гадуцішкі, Каляндрышкі, а паміж імі раптам — прастадушна нашы, беларускія Пузыры.

У кузаве ў нас чарапіца. Дзве пярэднія машыны, з такім жа грузам, адарваліся далёка наперад. Негаваркі, дабрадушны шафёр даволі часта спыняўся, каб падняць на дарозе згубленую тымі чарапічыну. Цярпліва і спакойна. Гаспадар!..

Браслаў, калі пад'язджаеш з захаду, адкрываецца вельмі маляўніча. Над возерам сосны, дахі, замкавая тара, каля яе касцёл, царква. Гарадок чысты, з прахалоднай, утульнай гасцініцай, з аброслай плюшчам і мальвамі чайной, з трыма азёрамі, якія ўсе відаць навокал гарадка з высокай замкавай гары.

Над замчышчам, над касцёлам і царквой узвышаецца помнік «добраму доктару». Пры панах гэты доктар, ужо тым часам амаль легендарны, бясплатна, як кажуць, лячыў беднату, пабудаваў за свой кошт бальніцу, а мог таксама, лайдак, даць дзядзьку некалькі злотых, каб з'ехаць верхам на ім з гары... Помнік пастаўлены па яго запавету, з громаадводам, з горбай жалеза пад зямлёй, якое, калі ўдарыць гром, толькі «ляскоча над горадам...»

У рэдакцыі хлопцы далі пачытаць «Гісторыю Браслаўскага павета», аўтар якое і выдавец, польскі настаўнік, энтузіяст-краязнаўца, засакрэціўся ініцыяламі О. Н. Кніга даволі тоўстая, а фактаў яркіх ня шмат. Усё прыблізна такое: У Відзах калісьці паны бралі з яўрэяў, апроч іншага падатку, яшчэ і па два кілаграмы перцу і «вельмі пацяшаліся з гэтага тавару і яго пастаўшчыкоў». У тых жа Відзах гасцяваў калісьці, у свайго дзядзькі, Адам Міцкевіч, студэнт. Мясцовыя «маскалі», барадатыя стараверы, што аж сюды паўцякалі ад царска-царкоўнага прыгнёту, у 1863 годзе вельмі старанна дапамагалі цару распраўляцца з паўстанцамі... А вось яшчэ адна даволі пацешная дробязь. У браслаўскага калгасніка Сцяпана Рыжага, які — пра што я перад гэтым прачытаў у райгазеце — атрымаў днямі званне «лепшага пастуха» раёна, калісьці, ажно ў шаснаццатым стагоддзі, быў продак — браслаўскі войт Грэгар Рыжы...

На лузе над возерам садзіцца паштовы самалёт. Увечары стукае недзе маторка. Потым — ноч. Месячная дарожка, на якую так добра глядзець з гары, пад ціхую гутарку з добрымі хлопцамі.

І нечым не нашым, а старасвецкім, цвільм патыхае ад слоў, што адзін мясцовы дзеяч, калі ў лазні не хапіла дроў, загадаў спусціць на вуліцы дзве ліпы... У тую кнігу яго — да войта Рыжага, калі той настаўнік-аўтар узяў бы!..

На выпускных экзаменах у вясковай дзесяцігодцы.

Дзяўчынка слаўна адказвае пра сусветнае значэнне Горкага, пра вобраз Пячорына, пра «Падарожжа» Радзішчава... Стомлены, хвараблівы выгляд, у цяжкіх ботах, цяжка ўздыхае, прыглушвае кашаль. Вялікія цёмныя вочы. Прыгожая. І ўсё збіваецца з рускай на родную мову: «імкненне», «творчасць», «далонь»...

Дзе ты была у вайну, толькі чатыры маі таму назад,— у беднай, цудам не спаленай хаце ці ў партызанскай зямлянцы?..

Няхай жа ўсё будзе добра!.. Пасля ўсяго, што было.

Хлопец. Бывалыя салдацкія чаравікі, старанна наваксаваныя, лінялая гімнасцёрка і нехлямяжы, больш на куртку падобны, пінжак.

Усё, здаецца, бацькава ці старэйшага брата. Хвалюецца, крэсліць наском чаравіка па падлозе.

— Адказвайце, можа, на другое пытанне,— хоча паспагадаць настаўніца.

— Не, чаму ж, я буду адказваць так, як пытанні стаяць у білеце.

Хлопец дужы, палёгкі не хоча.

Уяўляю, як ён раненька ўстаў, чысціў чаравікі, не снедаў ад хвалявання...

Дваццаць іх, юнакоў і дзяўчат, з беларускім вясковым акцэнтам гавораць пра вяршыні рускай літаратуры. Моладзь — вельмі падобная да сваіх бацькоў і матак, але ж — з пячаццю культуры, духа на тварах.

Чым яны былі б, каб не прыйшоў сюды Верасень?..

Вясёлы лётчык, які выдатна папрацаваў для нашай перамогі над фашызмам, расказваў, па-хлапечы радасна смеючыся, як ён вяртаўся сюды, у роднае данское сяло, на трафейным «опелі»:

— Узяў, зараза, ды заглух. За тры кіламетры ад бацькавай мазанкі! Дзед Афоня мяне дацягнуў на быках. Часта цяпер хто скажа: а гэта ж тады было, у той год, як дзед Афоня Міколу прывёз. Гісторыя!..

Пасля вайны камандаваў палком. Уранні, перад вучэбнымі палётамі, сам вылятаў раней — «нюхаць паветра», і не мог устрымацца, каб не праляцець над роднай Пятроўкай, не памахаць крылом.

А маці, сгарэнькая бабка Нюся, абы заўважыла, што самалёт крылом махае:

— Цэ мій падлюка!..

Не для экзотыкі запісваю, а ловячы здаровае адчуванне сувязі з родным, з мудрай народнасцю.

Старэнькай маці, калгасніцы, адняло мову. Прыляцеў самалётам вучоны сын, два дні сядзеў над ёю, і толькі на трэці яна апрытомнела. І першае, што сказала — спыталася:

— А ці абедаў жа, сынок?..

Колькі яму — пажылому мужчыне, былому ваяку — каштавала, каб не заплакаць!..

Ідуць салдаты, і дзіўна, прыемна падумаць, што кожны з іх быў малы, што кожны з іх абцалаваны мамай.

У яўрэйскай сям'і, дзе я затрымаўся ў Маскве, старэнькая маці інжынера паказвае мне пусты «дзяржаўны» канверт ад міністэрскага пісьма і з гордасцю, нібы за першую сынаву «пяцёрку», кажа:

— Вось якіх пакетаў прысылаюць майму Мішу!..

А Мішу — пяцьдзесят другі.

Студэнтачка расказвае:

— Мы з мамай часта хадзілі ў грыбы. А першы год, як толькі я паехала вучыцца, яна адна выходзіла на нашу сцежку: «Можа, убачу...»

У глухой вёсачцы на беларускім Палессі спыніліся каўпакоўцы. Адзін з іх зайшоў у крайнюю хату і папрасіў бабулю памыць яму запасную пару бялізны.

А потым раптам — трывога. Пайшлі — як прыйшлі.

На трэці дзень адзін з атрадаў, што адпачываў у лесе пасля бою, затрымаў старую. З клуначкам бывалай бялізны, і памытай, і пакачанай, і палапленай рукою маці. Два дні шукала яна ў бліжэйшым і далёкім лесе, пад музыку далёкіх і блізкіх выбухаў, таго «прыгожага ды вясёлага, што камандуе цэлым атрадам, а называецца — дай, божа, памяць,— здаецца, Платон...»

І вось знайшла, аддала і пайшла дахаты. З адным толькі пачуццём, з адной радасцю: «Няхай здаровенькі носіць!..»

Слаўны хлопец, добры паэт, адзін з маіх украінскіх сяброў, ён мне расказваў пра гэта ў часіну харошай сустрэчы.

Мноства астрыжаных галоў, дапытлівых вачэй... Фабзайцы.

Жанчына, з выгляду падобная на старую настаўніцу, гаворыць з трыбуны:

— Мая дзяўчынка закрыла сваімі грудзьмі амбразуру варожага дота...

Колькі яна непакоілася калісьці пра здароўе тых кволых дзіцячых грудзей!..

А цяпер вось гаворыць спакойна:

— Яна зрабіла так, як зрабіў бы кожны савецкі чалавек... Вучыцеся, дзеці, будзьце сапраўднымі патрыётамі...

Пасля выступлення жанчына надзела паліто. ветліва развіталася з арганізатарамі сустрэчы і пайшла. Каб зноў дзесьці думаць пра сваю дзяўчынку, якая...

«Вось ён — сапраўдны гераізм!» — падумаў я.

Потым, за нейкі год ці трохі больш, яшчэ і яшчэ раз убачыў яе на трыбуне, пачуў яе ціхія, роўныя словы і... стала балюча...

Захацелася падысці да яе і, каб не чулі, сказаць:
— Хадзем дахаты, матуля! Не трэба. Мы самі раскажам пра гэта...

Старая ішла па абочыне. Сцежкай пад вербамі. Радая, што халадок.

Мы стаялі на паваротцы з гасцінца ў вёску, каля саўгасных майстэрняў. Ужо напіліся вады, пагаварылі са знаёмым, і можна было ехаць. Ды я заўважыў старую, пазнаў.

Я добра ведаю яе. Добра ведаў і сына, што не вярнуўся з вайны. Можа, і цяпер яна якраз ідзе з мястэчка, атрымаўшы чарговую долю пенсіі за яго? Рублі, якія кожны месяц, год за годам, напамінаюць ёй, што сынок быў адзін... Дачок было тры. Адна памерла таксама ў вайну. Уцякала ад паліцаяў, што рабілі аблаву на моладзь — вывозіць яе ў Нямеччыну. Паўцякалі амаль усе, але цётчына Маня прастудзілася недзе ў раўку, восень была, а яны павыляталі толькі ў сукенках,— пагарэла потым дзён некалькі і памерла. Другая дачка... Пра гэта гаварыла нядаўна ўся ваколіца. Страшна падумаць — дзявочая шыя і... брытва... Сама сабе. І невядома, чаго... Муж старое памёр так даўно, што боль адбалеў і забыўся. Прытупіўся ўжо боль і па Мані, нават — па сыне. Сілы таксама стала менш. А тут — такое ў хату!..

Што мне сказаць старой?.. Я не бачыўся з ёю пасля апошняй бяды. Няўжо хопіць адно павітацца, узяць падвязці?..

Ад глыбіні сваіх пакут, ад роздуму горкага яна магла б, здаецца, яна павінна была б сказаць нам штосьці незвычайнае, вельмі патрэбнае...

А яна папрасіла мяне «хвіліначку пачакаць», зайшла ў сельмаг, развязала памалу вузельчык хусткі, дастала капейкі і папрасіла крамніцу адважыць ёй дзвесце грамаў вунь тых падушачак.

— Бо як жа ж гэта я, старое заткала, ішла, ішла ды забылася ўзяць у мястэчку?..

Бо дома ж ёсць недзе ўнучак і ўнучка, дзеці найменшай, замужняй дачкі.

Калі мы пад'едзем да іхняй хаты, малыя заўважаць бабулю і закрычаць і пабягуць ад радасці да ўжо нямоглых, а такіх ласкавых рук.

Ну, дык як жа тады без цукеркі?..

«Лепш ужо, нечага, хаваць у пеляночках, чым у вяночках...»

Бабуля прыехала дамоў з далёкай вёскі, дзе пахавала дарослую ўнучку. І там змаглася ад плачу, і тут яшчэ плача, але ж і расказвае:

— Прывезлі фатографа, каб зняць нябожчыцу Ганначку. От сабе нейкі лахмач. Як убіўся ў нейкую рыжую торбу, дык калупаўся, калупаўся — ажно агоркла, чакаючы...

Шеснаццаць год прайшло, а я вось зноў успомніў гарачае лета сорак пятага і бабулю,-— салдацкую ці партызанскую маці,— якая, прыйшоўшы ў горад з калгаса, купіла ў піўным ларку кухаль рэдкага, несалодкага морсу і прысела каля плота, на зямлі, запіваючы гэтым морсам сухі кавалак чорнага хлеба...

Муж-камуніст хаваўся. Жонцы фашысты пастрэлілі рукі і ногі, каб выдала, дзе ён. Ляжала на дварэ ўвесь дзень. Назаўтра — зноў пыталіся... Яна не вынесла пакут, сказала. Яе дабілі. Мужа і дзяцей спалілі ў хаце. Хаваць — суседзі сабралі косці ў мех, ды поп і з гэтым не пусціў на могілкі...

Цяпер не месцы іхняй хаты вёска паставіла помнік.

Калісьці ў суседняй вёсцы была чума. З акружанай вёскі вырваўся адзін зачумлены. Мужчыны, вартаўнікі, прыглушылі яго дручкамі і закапалі амаль жывога.

На гэтым месцы стаіць цяпер каменны помнік з крыжам. Ужо і камень у лішаях, і крыж чыгунны парыжэў, а людзі ўсё яшчэ расказваюць пра тую страшную неабходнасць — як быццам просячы прабачэння, ціха і трошкі ўрачыста.

Восень сорак другога года.

Цёмная, мокрая ноч.

А мужчыны стаяць на загуменні і глядзяць, як — за сем кіламетраў адгэтуль — гарыць, дагарае падпаленая партызанская вёска. Глядзяць і сварацца.

Баптыст, гугніла з багатае хаты, даводзіць, што гэта ўсё — ад бога, што «збываецца пісаніе».

— Госпад недарма казаў: я — агонь усёпажыраючы!..

— Ну дык няхай жарэ, калі не нажорся!..

Успамінаюць потым і тое, што рабін, летась, калі ў недалёкім мястэчку стралялі яўрэяў, казаў тое самае. Нават талмудзіў над ямай, чытаў: «Збываецца воля Яговы, нічога не зробіш...»

Напярэдадні вайны хлопец з Дона стаяў дазорам на Бугу. Пасля, пад націскам ворага, ён адступаў, уведаў бяздонную горыч разгрому і палону. Уцёк з-за калючага дроту і прыпыніўся ў самай звычайнай

беларускай вёсцы. Небагатыя, ціхія людзі, з якіх і ён нядаўна пасмейваўся: «Бульба дробненькая, але многа!..» Яны накармілі яго і прыгрэлі. Разам з імі ён узяў неўзабаве вінтоўку, стаў партызанам. Разам з імі рабіў ён тое, што — збоку відней — і Радзіма, і ўвесь прагрэсіўны свет пачалі пасля называць гераізмам. Тут на гарачую кроў яго раны лягла халаднаватая чысціня палатна. «Кужэльненькага», як гаварыла беларуская маці, нястомная работніца, што плакала над ім. Замест ягонай — богведама, ці жывой? — мамані ў далёкай, таксама дзесьці зганьбаванай фашыстамі станіцы... Тут ён адчуў каханне,— наша дзяўчына палюбіла яго, пайшла з ім з роднае хаты ў сцюдзёную пушчу...

Пасля — перамога! І ён не вярнуўся дахаты, на Дон. Хлопец нібы толькі цяпер заўважыў, як ён прырос да гэтай слаўнай лясной старонкі, як пасябраваў з людзьмі, якія памаглі яму выканаць святы абавязак перад Радзімай. Вось ужо трынаццаць год узапар ездзіць ён у госці на ўсход, да роднага берагу, да родных душ, і вяртаецца адтуль у Беларусь з тым самым дзіўным пачуццём — з дому едзе дадому, з радзімы цягне яго на радзіму...

Дзве іх стала, ці што?..

Здраднік, адбыўшы пакаранне, вярнуўся ў родную вёску. Закуткі самыя патаемныя, ціхія, мілыя ў маленстве — і яны цяпер не свае. І там няма яму супакою, спагады. Там — на калодцы або проста на пяску ці на траве — сядзе які-небудзь дзед або дзядзька і скажа:

— Чулі, вярнуўся і Ганнін сабака!..

Старая цётка расказвае, як «у тую вайну», у 1918 годзе, немцы прымушалі вёску падпісвацца, што людзі хочуць быць пад Германіяй.

— А то, гавораць: «Скаціну ўсю пабяром!..» Дык Іван Рыгораў і кажа ім: «Хоць і дзяцей у нас пабярэце — і то не падпішамся!..»

Паказваючы кіёчкам на чэрап, які стаяў калісьці на стале ў фашысцкага каменданта, стары экскурсавод музея Вялікай Айчыннай вайны, просты дзядзька, былы партызан, гаворыць групе прыезджых жанчын:

— У вас, напрыклад, на стале стаяць кветкі, а ў таго крывасмока — вось што...

Чытаю гісторыю, думаючы пра змены фармацый, стагоддзі... і раптам яскрава, міжволі ўбачыў нястомную бабку Прузыну або Агату — як яна дробна, мільгаючы чорнымі, парэпанымі пяткамі, ідзе,

спяшаецца ў поле ці з поля, дзе толькі праца ды праца... Дзеля кавалка яшчэ ўсё не вельмі шчодрага хлеба.

Бабка прайшла, услед за многімі, Зямля ўсё круціцца, ідуць другія бабкі...

Віншуючы з днём нараджэння жанчыну, скромнага, простага чалавека, ён шчыра пацалаваў ёй руку. Апроч усяго іншага — ветлівасці, пашаны — ён успомніў у гэты момант, як яна калісьці наведала яго ў бальніцы. Раней за ўсіх самых шчырых сяброў... Сказаў бы нехта, што наведаць — гэта быў, урэшце, яе службовы абавязак... Дык ён адказаў бы, што вось і схіляецца перад носьбітамі такіх абавязкаў.

Гэта — не зорка Героя, не слава паэта ці касманаўта, а толькі простае слова «дзякуй» ад чалавека, якога ты паважаеш, і тое «дзякуй» — вялікае шчасце, узнагарода за шчырую працу.

Думаю так, лежачы на густой канюшыннай атаўцы, каля школы, абсаджанай кветкамі, чыстай і светлай.

За гэтую школу загадчыца, адзінокая жанчына, атрымала днямі падзяку... толькі ад інспектара раяна, пажылога настаўніка. І пра гэтую радасць, пра гэтую славу сваю расказала нават мне, сваяку, сарамліва.

Здаравенная цётка з ордэнскай планкай піша сентыментальныя апавяданнейкі для дзяцей.

А чалавек, што разам з ёю быў у атрадзе, з усмешкай успамінае, як яна — стоячы ў партызанскіх санях, у галопе махаючы лейцамі — гнула пры дзецях ультрамужчынскім матам.

Зусім без патрэбы — нібы і гэтым мацуючы абарону краіны...

У вялізным свеце — сціплы чалавек, які заслужана ганарыцца тым, што ўмее:

— Я навастру брытву — ніхто не паправіць!..

Вяселле. Усе, хто як можа і ўмее, вяселяцца: танцуюць, п'юць, гарланяць, цалуюцца. А ён, ціхі ды працавіты чалавек, маўчыць. Гаспадар непакоіцца:

— Як ты там, браце Юрка?

— Ды вось грушу ем. Усё — вельмі добра.

І харошая усмешка.

Плывём па Амуры. Гляджу на зялёную сопку. Успамінаюцца лапці — вялізныя, старыя, латаныя-пералатаныя, падбітыя нават раскляпанымі баначкамі ад ваксы. Лапці старога дзядзькі Івана. І яго расказы пра японскую вайну, якія я, так сама як і лапці, ведаю з маленства.

Цяпер выразна, з нейкай кінанагляднасцю, уявіў сутычку на схіле такое вось сопкі.

Белая кашуля, белая бесказырка, шынельная скатка цераз плячо, даўжэзная вінтоўка з нахабна-непераможным штыхом...

І так далёка ад дому, куды ён, дзядзька Іван, вярнуўся потым з георгіеўскім крыжам і са скрыпучымі да смерці ранамі. У тую самую беднасць, да тых самых лапцей. Так і не ведаючы, за што і навошта ішоў на кулі, штыхі і асколкі, за што і навошта сам забіваў...

Стары парабак, з рыжага сівы дзядзька Кандрат, адзінокі і трохі «блажэнны» чалавек, насіў з сабою — ад пана да пана — мяшок крамянёў, скалачак...

Хто смяяўся, што гэта вярыгі ў яго, хто думаў: «Што ты хочаш — от, проста дурны чалавек!..»

І вельмі нямногія ведалі, што дзядзька марыў пра ўласную хату, ужо збіраў крамяньчыкі — каб упрыгожыць, як добрыя людзі, цэментавы, высокі падмурак!..

Я ш ч э а д з і н у с п а м і н.

Чорны, цёмны «пакрыўджаны богам» бабыль доўга і нудна расказвае, як ён быў занядужаў...

Няхай расказвае — трэба ж яму знайсці хоць якую палёгку!

Верасень шасцідзесятага года. ...Колькі можа перацярпець чалавек?..

Пяць гадоў панскай турмы, уцёкі ў СССР, дзе яму, чыстаму сэрцам хлопцу, даюць дваццаць пяць без права перапіскі, як... польскаму шпіёну!..

А цяпер, калі чалавек вярнуўся, пасля дзевятнаццаці год зняволення, зрубіў хату, ажаніўся, сына нажыў, цяпер ён на хаду памірае ад рака...

І ўвесь акіян яго незаслужанай крыўды, і ўся яго, нягледзячы на гэтую крыўду, светлая вера ў родную савецкую справу, увесь свет яго перажыванняў, дум — «не тыповая з'ява», пра гэта мы будзем маўчаць... «дзеля агульнага дабра». І непрыемнае для нас само яго жыццё, як напамінак, прыкры напамінак пра вялікую крыўду, вялікі боль, незаслужана прычыненыя добраму, нявіннаму чалавеку, як напамінак

пра вялікую «памылку» — не сотую і не тысячную долю той жахлівай з'явы, што зашыфроўваецца лічбай «1937» або словамі «культ асобы».

Праўда, суровая, горкая праўда пра тое ўжо сказана.

Прыйдзе таксама вялікі мастак, які паўторыць гэтую праўду мовай вобразаў — зноў жа па-сапраўднаму — дзеля агульнага дабра.

А тым часам, калі б мая воля, дык я гэтым хлопцам і дзяўчатам, што без пары сталі дзядамі і бабамі, надломленымі жыццём, я ім даваў бы вялікія ордэны, як героям — за іх веру, не страчаную ў нялюдскіх выпрабаваннях.

Так думалася не раз за апошнія гады, так думалася ў мінулую нядзелю дома, у вёсцы, калі ён, Мікола,— прыцемкам, пасля не першай нашай гутаркі на лаўцы перад гародчыкам,— паехаў дахаты веласіпедам, павёз на раме свайго сарамлівага хлопчыка.

Там, дома, хлопчык гэты, напіўшыся сырадою, засне; маладая жонка пойдзе ў клуб або будзе ціхенька хліпаць пад коўдрай; а сам ён, Мікола, будзе далей памалу — у бяссонніцы, у горкіх думах — паміраць...

Чэрвень шэсцьдзесят першага.

...Гарачы, парны поўдзень. Ішоу каля новай Міколавай хаты і, як ні страшна, зайшоў.

Прасядзеў з ім, пры ложку ягоным, гадзіны дзве. Відаць, апошні раз...

Яго расказы пра лагеры.

Думы «о тайнах вечности и гроба»...

Жахлівая трагедыя, горкі скепсіс і светлы розум — усё гэта хутка знікне. На дзікіх могілках на ўзгорку гэтыя косці, абцягнутыя скурай, ператворацца ў зямлю. Назаўсёды. І не страшна. Мне, мусіць, таму, што не вельмі ўяўляю сябе на ягоным месцы. А ён гаворыць, што ад болю, ад жахлівых пакут гэтага года страціў ужо ўсялякі смак да ўсяго, і хочацца смерці, хацеў бы нават кончыць сябе, каб толькі не ў пятлі...

А ў чыстай, новай хаце — сонца, смалістыя сцены, заплаканая маладзіца і румяны, замурзаны хлопчык, які ўсё ные каля таты, трэцца, як коцік, і... не плача.

А на дварэ пахне толькі што скошанай канюшынай, пыляць на загуменні грузавікі з торфам, раскашуецца ў спёцы маладое жыта...

Ліпень шэсцьдзесят другога.

...З сынам і жонкай сядзім на зялёнай, духмянай абочыне палявой дарогі, паміж пшаніцай і жытам.

Шчаслівае шчабятанне жаўранкаў, першае для мяне ў гэтым годзе «піць-палоць!», ідылічнае рыканне каровы, людскія галасы з недалёкага лугу і неахвочы брэх сабакі з вёскі...

Зноў думаю, аберагаючы гэтыя думкі, не дзелячыся імі ні з кім, пра Міколу, які памёр тут, пакуль я ездзіў па Далёкім Усходзе, пра тое, як мне напісаць яму дастойны рэквіем...

Румяная, мілая госцейка, дзяўчо з дзіцячага дома, убачыўшы, колькі пісьмаў ляжыць у тумбе майго пісьмовага стала, здзівілася:

— І вы іх не паліце?.. Ганна Пятроўна, наша выхавацельніца, сказала, што пісьмы трэба паліць.

— Чаму?

— Ну... Яна нам такі прыклад прывяла. Дружылі і перапісваліся дзве сяброўкі. А потым адну з іх пасадзілі, а ў другое знайшлі яе пісьмы.

— Дык і што?

— Ну, і гэтую пасадзілі таксама.

Чорт ужо з ёю, калі так думае нейкая Ганна Пятроўна, але ж чаму і сёння яшчэ, у канцы пяцьдзесят дзевятага года, дзяцей калечаць такою дзікасцю?!.

«Часта ў сапраўднасці мы бываем лепшыя, чысцейшыя, чым у думках...»

Так думаў ён, успамінаючы ўчарашнюю госцю.

У гасцініцу да яго зайшла студэнтка-зямлячка, у якую ён, значна старэйшы, даўно быў... закаханы. Патаемным, міжвольным, нейкім журботным каханнем. Была яна воддаль, і вось прыйшла, і ён ніяк не здолеў бы пачаць нічога, пра што так часта думаў, пры ей ён адчуў сябе вельмі далёкім ад гэтага, яму было брыдка нават падумаць, успомніць пра ранейшыя «мары і сны». Адчуў, што проста любіць яе, разумную, душэўную дзяўчынку — любоўю «не для сябе, а для яе», што проста яму хочацца рабіць ёй добрае, глядзець на яе, любавацца — з харошай, чыстай любасцю старэйшага.

«І правильна»,— казаў ён у думках.

Але... з нёвясёлай усмешкай.

Новую настаўніцу, прыгожую, здаровую і сарамлівую яшчэ дзяўчыну па прозвішчы Бурак, у калектыве адразу сталі называць цукровым бураком.

Прыгледзеўся, пагаварыў каля акна, палюбаваўся ёю ў танцы — ох, і сапраўды ж цукровая...

Маладзенькая, сціплая мама. Красуня. І хлопчык вельмі прыгожы. Стракатая кепачка, смешна-салідны клёшык.

Гляджу і думаю: як яны дружаць, як яны любяць адно аднаго!..

І — грэшнаму — мне хочацца спытаць:

— Скажыце, хто мае шчасце быць бацькам гэтага хлопца?

Чарнявая, дужая прыгажуня, дзеўка на ўсю ваколіцу, нарадзілася ад манаха, што будаваў у прыходзе царкву і каплічку пры ўездзе ў мястэчка.

Тыя разы, казалі, маці гэтай дзяўчыны месіць хлеб, а ён — яшчэ калі падлашчваўся — пакратае за руку вышэй локця і ажно вочы заплюшчыць:

— Я кое нежнае цельца!..

Мужык бабін быў на мікалаеўскай вайне.

Абедаў у рэстаране гасцініцы за адным сталом з маладой, сціплай парай рабочых.

Ён «выконвае заданне» ў Ліепаі, а яна вось прыехала да яго з трохмесячнай дачушкай у госці. Ён выехаў насустрач, сустрэліся тут, у Рызе, чакаюць ліепайскага цягніка. Зайшлі паабедаць, і з малым яе ў рэстаран не пусцілі... Што ж, палажылі дачушку ў вестыбюлі, на канапе пад фікусамі, даручыўшы яе старэнькаму швейцару, латышу.

Маці — у просценькай сукенцы, бландзінка з далікатнымі рысамі твару і слядамі дзіцячасці ў гэтых рысах. Відаць, вясёлая была, любіла ўзяць ад жыцця, а цяпер — пацяжэла, парыхлела, пабрыдчэла часова, аднак не аддасць свайго новага шчасця за мінулыя радасці.

Бацька — чорны, стомлены, непрыкметнай знешнасці рабацяга, які «души не чает» ад шчасця сустрэчы, знаёмства з дачкой.

Шапталіся яны, шапталіся, і ён узяў усё ж такі сто грам і бутэльку піва.

— Испортился я у тебя,— сказаў з харошай рускай шчырасцю, з усмешкай, пра якую пісалі Талстой і Чэхаў.

Бацька выпіў гарэлку, а маці прыгубіла піва, і пачалі есці — проста, салідна, заслужана, як ядуць людзі працы.

Якой непрыкметнай, звычайнай бывае збоку — на фоне агульнага, грамадскага — гэта прыгожая асабістая радасць, асабістве шчасце!..

Ідылія. Назаўтра пасля вяселля яна — румяная, у светлым плацці, басаногк — гнала, ужо не са свайго двара, гусей на расу і, ідучы па вёсцы, усіх сустрэчных саромелася.

А ён, звыштэрміновы старшына ў адпачынку, з тоўстым гадзіннікавым ланцужком на поясе, у наглянцаваных ботах, ішоў побач, за гаманлівым статкам, і здаволена, больш дурнавата, чым салідна, усміхаўся.

Слякотны дзень, будзённы сум на местачковай плошчы. «Альтанка», дзе пасажыры чакаюць аўтобуса, Цяпер у «альтанцы» рэпіць пісклівая скрыпка, да болю ў жываце бухае вялікі бубен. А дзеўкі да сёмага поту, да адурэння кружацца ў бясконцай польцы.

Асабліва лютуе адна. З упартым ілбом і тоўстай губой, якой яна ледзь прыкрывае зубы. Дзесяць патоў, а ўсё ж нястомная. Бацька, відаць, больш за ўсіх можа парыцца ў лазні.

У будзень, у жніво — ды танцы?..

Кавалеры трох гэтых танцорак ідуць у армію.

Яны пакуль што недзе п'юць. Толькі адзін матросік-адпускнік даволі няумела і вяла топчацца ў польцы, ганьбячы свае гвардзейскія стужкі.

А пра заядлую з упартым ілбом будуць казаць пасля:

— Вельмі ж Ядзя тады танцавала!..

Дзяўчына-ўрач працавала летам у піянерскім лагеры.

Утапіўся хлопчык, сын бальнічнай прыбіральшчыцы. Дзяўчыну, як наймалодшую, паслалі перадаць пра няшчасце маці.

Колькі яна адпакутавала, колькі паездзіла па горадзе на таксі, возячы бедную жанчыну і ніяк не асмельваючыся ей сказаць!..

Пакуль тая не прыгразіла, што выскачыць на хаду з машыны, урач — баючыся сарвацца, заплакаць — цадзіла патрошку: то захварэў, то ручку зламаў...

На хутары ў лесе — прыгожыя дзеўкі. Ажно напіцца захацелася, калі ўбачыў іх у акне. Маці:

— Каб хлеба, дык не далі б, бо няма. А вады — чаму ж.

— Ой, мама, ну вас!..— перапыніла малодшая дачка.

Памыла шклянку, узяла вядро і каля студні, пакуль я даставаў ваду і піў, расказала, што скончыла дзесяць класаў, працуе ў недалёкай вёсцы піянерважатай. Косы — уразлёт. Шчырыя чорныя вочы,

І не пасмеў спытацца, ці праўда, што хлеба няма...

Над Віллёй — салаўіны перасвіст, камары, дарэмнае сцёбанне спінінгам і далёкі гул самалётаў, што рассяваюць угнаенні над палямі калгаса — хараша! — «Партызан».

Звычайным, няновым здаецца гэты гул.

Як і ўспамін пра іншы гул — тых самалётаў, што дзесяць год гаму назад бамбілі гэтыя вёскі...

Апаўдні сюды сабралася моладзь і дзеці. Падлеткі, што па памяці цытуюць Горкага, называюць імёны шахматных чэмпіёнаў і іншыя прагрэсіўныя рэчы. І лаюцца пры гэтым густа і агідна. Аж страшна за дзяцей, якіх тут многа...

Культура?

Учора дырэктар школы, спакойны, сімпатычны хлопец, былы баявы партызан, хваліўся, як яны з інструктарам райкома, таксама адным з партызанскіх гвардзейцаў, дамовіліся нарэшце са старшынёй калгаса пра будаўніцтва новай школы:

— Пілі трохі ў хаце. Угаворвалі. Ніяк, зараза, не згаджаецца. Папрасілі мы яго з Толем на двор ды як далі — адразу згадзіўся...

Не печанегі?!

У вёсцы многа дачнікаў.

Калі на вуліцы праходзіць статак, гарадскія дзеці кормяць коз хлебам і пячэннем.

Пастух, пажылы і падсухі мужчынка, злосна сцёбае коз пугай.

Мамы-дачніцы абураюцца. Ім «соль дастаецца лягчэй»...

Вясна спазнілася. Лісця і кветак чакалі доўга нават і тут, на поўдні. І таму, калі пры горнай сцяжыне зацвіла нарэшце японская ружа, многім хацелася спыніцца пад гэтым дрэўцам і пастаяць.

Кветкі японскай ружы маленькія. Павісне на нераскрытым бутончыку дажджавая кропля — амаль абое роўныя, абое ружовыя ў ранішнім сонцы.

Калі я, паднімаючыся ў горы або вяртаючыся ў горад, спыняўся на хрусткай дарожцы і любаваўся безліччу гэтых кветачак, яны мне здаваліся дзецьмі вялікіх сапраўдных ружаў.

І яшчэ адно. Праз голле і кветкі гэтага райскага дрэва вельмі добра было глядзець на далёкі Эльбрус — ненатуральна, дзіўна, радасна белы, як светлая мара!..

У мностве кветак урачыста і заклапочана звінела не меншае мноства пчол. Грэла доўгачаканае сонца. Зверху спявалі жаўранкі, у дрэвах гулліва перакліваліся берасцянкі. У сонцы раставала, як нябачны мёд, духмянасць новай вясны.

А пры сцяжыне — сімвалам вечнага абнаўлення — стаяла юнае, нікім не кранутае дрэўца.

Ды пасля тут прайшоў адзін «хворы»...

Я не бачыў яго каля дрэўца, ён сустрэўся мне крокаў за дваццаць вышэй.

Тоўсты, да пояса голы, у паласатых піжамных штанах, ружовенькі ад першага загару і апацелы тлушчам самаздаволенага здароўя,— ён нёс у зубах толькі што абламаную галінку нашай ружы.

Яна яму таксама спадабалася. І ён яе хутка кіне пад ногі.

У памяці маёй сам па сабе ўсплыў далёкі малюнак.

Сонца праз шкло. Румяныя піраміды яблыкаў. Адзін з павільёнаў усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі. Пад шклом, у сонцы, у духмянасці хадзілі людзі. Многа людзей — з усіх канцоў краіны, з-за мяжы. Дарослыя, дзеці. І толькі адзін працягнуў да піраміды руку.

Малодшы лейтэнант Адам узяў вялікае яблыка і даў яго сваёй, таксама маладзенькай, Еве. Ева з гуллівай прагнасцю ўпілася ў яблыка белымі, нядаўна такімі прыгожымі ў смеху зубамі. А да Адама падышла бабуля, што ціха, непрыкметна дзяжурыла каля дзвярэй. Яна яго сарамаціла, як дарослага, але яшчэ ўсё нясталага ўнука, а хлопец, раптам узмакрэлы і чырвоны, занароўлена, жалю варта апраўдваўся:

— Ну што вам — яблыка шкада? Аднаго толькі яблыка? Аднаго?..

За час, які прайшоў пасля гэтага выпадку, я пасталеў яшчэ на дзесяць гадоў. Аднак і сёння я разумею таго Адама ў першым золаце пагонаў, побач з прыгожай, модненькай і таксама наіўнай Евай. Разумею, бо сам памятаю, як гэта можна шчасліва, бясконца шчасліва дурнець ад пачуццяў...

А вось гэтага — голага, тоўстага, з галінкай ружы ў зубах — я не хачу разумець. Ён мне бачыцца сытым, леным катом, з рота ў якога матузном звісае хвост недаедзенай мышы.

Поўненькі, з прыемнай усмешкай ляснічы смяяўся калісьці, што з Масквы яму пішуць: «Колькі ў вас рабчыкаў на адзін гектар лесу?»

— Падумаў за сталом дый напісаў — дваццаць тры. Навука! Учот!..

А цяпер вось ён прыехаў да мяне шукаць ратунку,— падрабіў сабе атэстат сталасці, а нехта выдаў... З той самай прыемнай усмешкай раіць мне быць добранькім — памагчы яму схаваць канцы...

А дзе ж навука, «учот»?..

Пенсіянер шпацыруе з жонкай па могільніку і радуецца, што на помніках — «так многа маладзейшых» за яго...

Госці, людзі, што называецца, забяспечаныя, успамінаюць, колькі хто страціў на грашовай рэформе сорак сёмага года. І сёння яшчэ

некаторыя цмакаюць, шкадуючы леташні снег. Толькі адна, былая партызанка, урач, весела смеючыся, расказвае:

— У нас у інтэрнаце... ну, у нашым пакоі, была такая завядзёнка: хто з дзяўчат скажа грубае слова — дзесяць, пятнаццаць, дваццаць капеек штрафу. Ступень кары — у залежнасці ад ступені грубасці. А гэтага ў нас часам хапала. Што ж — хто з партызан вярнуўся, хто з фронту, хто з фашысцкага лагера... Штраф апускалі мы ў глінянага ката. Месяц канчаецца, стыпендыю праелі — высыпаем свой штрафны капітал на стол і давай!.. Так і перад рэформай. Перавярнулі мы свайго ката — хапіла на булку хлеба і каструлю журавінавага кісялю. Акружылі яе з лыжкамі і рагочам. Як мама мая гаварыла: «Няхай багаты дзівіцца, чым бедны жывіцца». Які быў цудоўны, божа мой, час!..

Абое сур'ёзныя, тоўстыя, габардзінныя сядзяць у кіно. І раптам яна захіхікала, як дзяўчо. Убачыла на экране — такія во! — «доўгія дудкі»... Трэмбіты закарпацкіх пастухоў.

Сумна стала, пераглядаючы стары фотаальбом. Пісалі людзі калісьці адзін аднаму: «На доўгую... на вечную памяць...» І ўжо даўно іх няма, і памятаць іх — няма каму...

Чаму некаторыя людзі бываюць такія важна-суровыя, нібыта ім не проста трэба жыць, пражыць свой век, а неяк суха, натужна, злосна ісці міма ўсяго вясёлага, а потым усё роўна, як і ўсе, памерці?

Успамінаюцца старыя вясковыя маці, бацькі — з іх нястомнай падзвіжніцкай жміндай, з іх бязлітаснай, аж да агіды, працавітасцю, з аскетызмам...

Лягчэй жывіце, людзі, весялей!..

...Тут часамі не толькі змаганне з галечай, адчайная барацьба за жыццё. Куды больш агідна стараннымі бываюць тыя, што ўжо маюць кавалак хлеба, і добры, але хочуць большага.

Старая мяшчанка, бацька якое меў калісьці тры выязныя тройкі, а ў самой — два трохкватэрныя дамы, цэлы пук, як радыскі, ключоў і ключыкаў ад розных каморак і шафаў... Страшнай зімой сорак першага — сорак другога года яна штодня, а то і па некалькі разоў на дзень — «пад ляжачы камень вада не цячэ» — бегала да гетаўскага дроту, каб «абмянядь» на некалькі бульбін яшчэ адно дарослае ці хоць дзіцячае паліто... Нават плакала над лёсам бедных яўрэяў, але ж прыносіла тое паліто і... бегла зноў,— нібы ратуючыся ад галоднай смерці!..

Дабрадушны, двухжыльны вахлак. На фронт, у мікалаеўскую вайну, ішоў ад дзядзькі з горада. Так разгубіўся, што пачаў, адыходзячы, хрысціцца перад вялікім люстрам у кутку, як перад іконай,— на самога сябе...

Цяпер, пасля другой сусветнай вайны, ужо стары, мнагадзетны ўдавец, расказвае мне, як малыя ў іх вёсцы бомбачку нейкую разбіралі, а яна ўзяла ды разарвалася... Суседняга хлопца забіла, а дзядзькаву малую толькі страшна пакалечыла.

— Так яно, брацe. Скаціну, дык чалавек або прадаў бы, або дарэзаў бы, а з дзіцем што будзеш рабіць?..

Ад люстра было мне калісьці смешна.

Цяпер — да болю, да жудасці — горка...

Бяда з культурнасцю.

У мястэчковай чайной, абедаючы з паважанымі гасцямі, былы настаўнік, якога нядаўна скарацілі з-за недахопу адукацыі, грунтоўна і дабрадушна расказвае:

— Прымерна, ведаеце, быў у мяне парсючок. Хварэў тожа панасам. І я пачаў лячыць яго сырымі яечкамі, Упатрабіў і — пачаў папраўляцца!..

І такая ж пры гэтым нявінная усмешка!..

У клініку з глыбіннай партызанскай вёскі прывезлі пасля вызвалення падлетка з прастрэленай дыяфрагмай. Бледны, нямоглы, і рана задаўнена.

Стары прафесар, рухавы сангвінік, зрабіў яму аперацыю, вельмі складаную і — удала! Гаварылі: «Дзевятую ў свеце, другую ў СССР!..»

Хлопец стогне, трызніць. Бабка не спіць пры ім каторую ноч...

А прафесар, як бог — у белым акружэнні анёлаў-студэнтак — грыміць радасна каля ложка:

— Дзякую, хлопчык, дзякую, мілы мой, за тое, што ты мне прывёз такую цікавую хваробу!..

Былы афіцэр-франтавік, пасля студэнт, дырэктар сярэдняй школы, цяпер — старшыня адсталага калгаса. Мужчына энергічны, падцягнуты, як спартсмен. Новы домік, асобны пакой, які ён лічыць сваім кабінетам, хоць сядзець тут яму не даводзіцца, Даволі цікавая бібліятэка, нават з рэдкімі кнігамі.

Лёгка можна падумаць, нават і напісаць:

«Ах, які культурны, які сучасны старшыня калгаса!..»

А гэта — добры настаўнік, які — заядла намагаючыся падняць грунтоўна развaленую гаспадарку — вось ужо чатыры гады, з кожным годам мацней, тужыць па сваёй сапраўднай працы.

Сябры едуць дахаты, з далёкай камандзіроўкі. Адзін вязе хваляванне другога. Вялікае. Учора яшчэ даведаўся, жонка пазваніла па міжгародняму, што сяброва дачка папала на вуліцы пад машыну. «Цэлая ўся, але траўма вялікая». І везці гэтую таямніцу — нялёгка. Асабліва гледзячы, як ён нічога не ведае і смяецца... Найцяжэй стала ўранні, калі ўжо блізка было. Сябар ідзе, памыўшыся, па калідоры вагона, смяецца, гледзячы, як дзяўчынка цікуе ў акно:

— Вось хто хвалюецца, відаць, найбольш! За ўвесь вагон!

А той, хто сапраўды хвалюецца — відаць, за ўвесь цягнік,— маўчыць, ківае галавой, згаджаецца. Нават з усмешкай...

— Аркестр, увага — Шапэн!..

Маладыя, вясёлыя хлопцы, салдаты, іграюць. Замкнутая ў нотах музыка зноў ажывае, падключаецца да новага смутку і жалю...

Цябе выносяць. Ідуць пад труной сябры. Сонца свеціць на твой, ужо адсутны, твар.

І ўсім гэта відно — апроч цябе...

Страшна бывае ад думкі, што родныя, сябры, што твой цудоўны сынок — толькі сустрэчныя на бязмежнай дарозе часу, паміж небыццём, што было, і небыццём, што будзе. Што мы не бачыліся з сынам, з другам мільёны год, і хутка зноў не будзем бачыцца — ніколі!..

Якія жудасна шчаслівыя гады і дні нашай любві, дружбы, і як жа часта мы марнуем іх на пустое!..

Ноч каля вогнішча над ракой. Камары, холад, птушыны канцэрт, і гутарка, і роздум — можна сказаць — філасофскага ўхілу.

Ох, недарма чалавек даўно ўжо назваў сябе толькі госцем на гэтай зямлі, і не соладка было яму прыйсці да гэтай думкі!..

Успамінаецца адзін з нядаўніх вершаў Маршака, дзе ёсць мудрыя і, відаць, таксама ж у пакутах народжаныя радкі (не памятаю даслоўна): «Калі мне было чатыры гады, калі я быў яшчэ несмяротны...»

Майму маламу пяць. Зімой, калі ў суседнім доме памёр дзядок, хлопец не даваў мне спакою доўга: а што, а як, а чаму?.. Аднак для яго гэта — самы першы пачатак пакутлівага роздуму над тым, што жыццё чалавека — ой, як далёка і як бязлітасна, жорстка не вечнае.

Малы будзе яшчэ вельмі доўга думаць, што людзі паміраюць, а потым прыйдзе час на думкі, што і я таксама памру...

А я ўжо думаю і за сябе, і за яго, і наогул за чалавека. І думаць так пад зоркамі, у адзіноце — бывае ўсё ж такі цяжка.

Упадак сіл? Можа. Што, гнаць такія думкі працай? Добра гэта! Але ж і пры камунізме, калі, нарэшце, чалавек будзе жыць як належыцца, думкі такія яго не пакінуць.

Яны і павінны былі б падказаць нам наймудрэйшую з думак — пра мір, у якім найбольш разумна было б пражыць тыя лічаныя гады, што адведзены кожнаму з нас прыродай.

І славы не было, а толькі адчуванне абавязку
Шчасце наша, відаць, у самой апантанасці

Што не забудуся з апошняй паездкі ў Маскву, дык гэта — Прышвін у труне. Прыгожа сівая галава на падушцы. Слёзы, калі Паустоўскі натхнёна гаварыў пра ягоную веліч як чалавека і мастака. Побач са мной, у збоі моладзі на галёрцы, плакаў юнак-аркестрант, з трамбонам пад пахай.

Я ўспамінаў мае знаёмства з Міхаілам Міхайлавічам,— над яго старонкамі, у страшным сорак другім годзе,— і думаў, што добра вось так: зрабіць усё што мог і адысці.

Латвія любіць Упіта.

Асабліва непасрэдна гэта праявілася ў словах калгасных дзяўчат, зямлячак юбіляра, якія падаравалі яму самадзельныя рукавіцы.

— Што, што яны сказалі? — пытаюся ў шуме воплескаў.

І сябар мой, латышскі паэт, перакладае:

— Каб цёпла было вашым старым рукам, якія...

Кнігі яго — іржаная, духмяная, туга замешаная проза. Часамі залішне грунтоўная, а то і проста сумная, але ўсюды разлічаная на сур'ёзнага, удумлівага чытача. Чытаць яго — і асалода, і праца.

Сапраўдны, моцны чалавек, нястомны работнік, ад знаёмства з якім і сам ты, здаецца; становішся лепшым. І не «здаецца», а так. Тут дорага само жаданне. Яно не праходзіць бясследна.

Дзіўнае супадзенне. У вагоне расказваў хлопцам пра нядаўнюю сваю сустрэчу з Юрыем Яноўскім. Пастаялі на вуліцы. Мне хацелася вельмі сказаць, што ён мне блізкі, што я шкадую яго, хачу, каб яму палягчэла... А ён, прыгожы, стройны, заўчасна пасівелы чалавек, выдатны пісьменнік, якога вось ізноў пабілі — жорстка, груба, несправядліва,— ён усміхаўся сваёй мудрай, журботнай усмешкай і гаварыў:

— Людзі адыходзяць, справы застаюцца...

Уранні, прыехаўшы ў Брэст, у першай газеце я ўбачыў некралог...

Юры Іванавіч пайшоў. Справа яго засталася. Сумная ўсмешка — таксама. Многае ён панёс, не паспеўшы, не змогшы аддаць. Не ўсё, вядома, па сваей віне...

Чытаю «Зачараваную Дзясну». І захапляюся — на ўсю душу, Зірнуў, калі напісана: 1954-1955 гг. Даўжэнку я бачыў і слухаў на другім з'ездзе пісьменнікаў, у снежні пяцьдзесят чацвёртага. і не ведаў як след, каго слухаю, бачу...

Чаму ж маўчу, не кажу, не пішу тым, што жывуць, пра сваё захапленне?..

Учора быў першы раз у Жупранах.

Магіла, помнік і, у касцёле, партрэт Багушэвіча.

Радасна, дзіўна, што ён — не легенда, не гістарычнае штосьці, а чалавек, які зусім паблізу жыў, памёр і пахаваны тут вось, побач з маці і сястрой, на звычайных вясковых могілках, дзе на кожным помніку па некалькі пацешных памылак...

І другое пачуццё. І здзіўленне, і недаўменне, і пашана да таго, хто блізу сто гадоў таму назад упарта, як парастак паміж плітамі тратуара, пралез паміж дзвюма стыхіямі, рускай і польскай, насуперак усім, уключаючы і сваіх найбліжэйшых, пралез і вырас са сваім і зрэбным, і глыбока, па-народнаму, пахлебнаму свежым беларускім словам. І славы не было, а толькі адчуванне абавязку.

Шчасце наша, відаць, у самой апантанасці.

Самаздаволены маэстра піша па-беларуску «шляпа», «укусна», «бракну», «кузнец»... У адказ на крытыку крычыць:

— Трэба смялей набліжаць нашы братнія мовы!

На невуцтве — «вялікая палітыка».

Люблю рускіх, Расію, люблю Украіну... Але ніколі яшчэ не пашкадаваў, што я — беларус, ніколі не захацеў быць некім іншым, таксама як ніколі яшчэ не прыходзіў да недарэчнай думкі... стаць жанчынай. Я беларус таксама, як я — мужчына, і проста не магу глядзець на свет інакш.

Добра паслухаць, як людзі гавораць пра літаратуру, зусім не падазраючы, што і ты — таксама маеш дачыненне...

У вагоне гутарыў з палкоўнікам медыцынскай службы. Сівы, бывалы, культурны чалавек, ён гаварыў пра аднаго з сталічных «класікаў».

— Мы яго доўга ў нашым Каунасе чакалі. А прыехаў — п'янага вынеслі з вагона, п'янага потым і вынеслі з рэстарана ў вагон... Ці можна ўявіць падобнае, скажам, з Уладзімірам Галакціёнавічам, з Антонам Паўлавічам, га?..

Так, добра часамі, што людзі не ведаюць, хто ты...

Бяззубы, бабнік, п'яніца і хам сварыцца з чарговай жонкай. Узяў ён гэтую свежую жонку з дачкой ад другога бацькі. Цяпер дзяўчынцы чатырнаццаць год. Піянерка, выдатніца.

Айчым:

— Ты ведаеш, хто твая мама? Ведаеш? Я яе з вуліцы ўзяў!.. Падняў з-пад ног...

І дзяўчынка маўчыць, унурыўшыся, глядзіць спалохана, глядзіць — разумнымі, журботнымі, вялікімі вачыма...

Ноччу ў пакоі гэтага чалавека стукае машынка: ён піша.

На маральныя тэмы — таксама...

Ужо немалады артыст папрасіў аўтара п'есы дапісаць у ягоную ролю... «Сам разумееш, чагосьці такога...» Словам — каб ён, па ходу дзеяння, мог цалавацца з маладой артыстачкай, наіўнай, чыстай дзяўчынай, што нядаўна прыйшла з інстытута.

І аўтар... дапісаў.

Чалавек, якога я паважаю, якога паважаюць многія, які «стварае каштоўнасці», ездзіць на ўласнай машыне, сядзіць у прэзідыумах, чалавек, упрыгожаны сівізной... а расказаў такі пошлы, такі бяздарны анекдот, што ўсім нам, маладзейшым, брыдка было глядзець на яго, пакуль ён... ад душы смяяўся...

Увішны і асцярожненькі крытык, я кому нядрэнна жывецца каля літаратуры, прыехаў з далёкага, дарагога курорта і хваліцца, што пахудзеў там адразу на восем кілаграмаў...

Ну, чым не тэма для народнай казкі?..

У доме творчасці пісьменнікаў стары «тварэц» наладзіў сабе проста бясконцы ды бясхмарны адпачынак. То спіць, то есць, то шпацыруе па лесе, сёе-тое без асаблівай натугі аддаючы ад свае сытасці народу...

Вечар. Некалькі маладых літаратараў глядзяць тэлевізар.

На экране — студэнтка чытае гогалеўскую «упоительную ночь», з лірычным прыплачам гаворыць: «Благочестивые люди уже спят...»

І, не змаўляючыся, моладзь здагадваецца, пра каго гэта, і выбухае дружным бязлітасным смехам.

Добра, што гэта ім смешна!

Малады прыезджы кінасцэнарыст. Піжама ёсць, апломб — таксама, дыеты трымаецца. Нажыць бы толькі яшчэ адну дробязь — талент і — пісьменнік гатоў.

Зрэшты, сёй-той абыходзіцца і без гэтага.

Пісаць, капіраваць жыццё «па клетачках» у наш час могуць многія.

«Калі ёсць людзі, якія за гэта плацяць, дык чаму ж не павінна быць людзей, якія возьмуць гэтую плату?..»

Так разважае сёння, на жаль, яшчэ не адзін «літаратар».

«От избытка сердца говорят уста».

Успомніў гэта ў рэдакцыі, спрачаючыся пра майстэрства, а потым успамінаў у дарозе, у зялёным тунелі брэсцкай шашы.

Як гэта правільна сказана! І якія там могуць быць «уста», дзе няма «избытка сердца»?

Тут, да евангельскага, падыходзіць і горкаўскае:

«Много сердца — лучшее средство писать хорошо».

Харошае, можа наогул найлепшае пачуццё — радасць новых ды новых сустрэч з людзьмі!..

Хочацца многа, бясконца доўга жыць, пакуль не пазнаёмішся з усімі, хто разам з табой... не, з кім разам і ты будуеш новае!..

Дзяўчаты ў хатах-чытальнях і ў клубах — прыгожыя і мілыя ў сваім жаданні працаваць на сувязь нашай заходнебеларускай вёскі з вялікай культурай. Басаногая дзетвара, якую савецкая школа навучыла глядзець на свет разумна, смела і даверліва, Вечна занятыя і вечна, здаецца, непаголеныя старшыні маладых калгасаў, па-гаспадарску важныя і хітраватыя. Падлеткі трактарысты і камбайнеры, што горш умеюць трымаць папяросу, чым кола руля. Бабулі і цёткі, што гасцінна сустрэнуць вас хлебам, якога ў многіх раней — так нядаўна яшчэ! — або зусім не было, або бывала ў абрэз.

Хлебам і малаком, а ўвечары — маладой, на двары згатаванай бульбай, з дамавітым, утульным пахам кропу... Хлебам і словам нашай шчырай гасціннасці...

Як гэта здарава — чытаць жывую карту роднай зямлі, напейзажвацца ў запас, зараджаць сябе жывой, вобразнай любоўю да гэтай зямлі,— каб потым пісаць, не выдумваючы пейзаж, а ўспамінаючы яго з запасу знятых памяццю кадраў.

Здаецца, упершынга адчуваў сябе так радасна і лёгка там... хачу сказаць — дома, бо ў родных мясцінах, пра якія мне хочацца пісаць, пра якія я пачынаю думаць — абы ўзяўся за пяро. Няма ўжо там таго ныцця, як раней, як быццам ужо цалкам закончыўся працэс сацыялізацыі вёскі, людзі прывыклі да новага, кажучы мовай Талстога — усё перавярнулася і легла на сваё месца. Гаворадь землякі адкрыта, калюча, але не варожа. Як быццам закончыўся ўжо, завершаны

першы этап барацьбы за хлеб. Цяпер, у пяцьдзесят сёмым годзе, няма тут яго, кажуць, толькі ў гультаёў. Пачынаецца новы, ужо не першы этап барацьбы за культуру. Плануюцца ды будуюцца клубы, школы, дарогі...

Адно, калі ласка, без лакіроўкі!.. За культуру ў нас трэба нарэшце пачынаць змагацца па-сапраўднаму, трэба нават біць у званы!..

Найбольш, здаецца часамі, актуальная праблема ў многіх — «дзе дастаць дражджэй?» Самагонка, «сталічная», нават каньяк. П'юць вельмі многа.

У мястэчку перад «забягайлаўкай» наглядаў сварку настаўніцкай пары.

Ён, п'яны, яшчэ ўсё рваўся да чаркі і груба лаяўся — прывычна ўжо, нават здаволены сабой.

Яна крычала, як звяглівая баба, выварочваючы «перад усёй грамадскасцю» хатні, сямейны бруд.

А дзве дзяўчынкі, што за чатыры кіламетры прыйшлі сюды па сшыткі, прагна прыглядаліся, прыслухоўваліся да гэтай «педагагічнай дыскусіі»...

Былы падлольшчык, адукаваны, сімпатычны рабацяга, таксама настаўнік, зусім сур'ёзна даводзіў мне, што алкаголь... карысны.

У старшыні калгаса — перадавога, раструбленага на ўвесь свет — нос сіні і ў цяпле. Адзнака асноўнага занятку, сімвала веры...

Спіс гэты можна прадоўжыць, хапіла б толькі ахвоты.

Трэба штосьці рабіць!.. А я яшчэ думаю: ці варта даць месца гэтай балючай і вельмі сучаснай праблеме ў артыкуле, які мяне прасілі напісаць пра новае ў вёсцы...

Жывучая ж яна — прывычка загладжваць!..

Не скажу, што я прыехаў сюды, у вёску, «вывучаць жыццё». Бо зацягалі, забрудзілі мы гэтыя словы. Я прыехаў пажыць у родным свеце майго маленства і маладосці, пажыць са сваімі людзьмі, пра якіх мне заўсёды найлепш пісалася. І мне, зноў акунуўшыся ў гэты свет, ва ўпор убачыўшы яго плюсы і мінусы, зноў бывае горка ад гладкапісу, ад несціханай, безадказнай балбатні некаторых дакладаў, артыкулаў, кніг...

Два паэты ідуць па палявой дарозе. Бабы і дзеўкі жнуць. Пасляваенны калгас благенькі, але настрой у паэтаў выдатны. Адзін пачаў дэкламаваць, прыпомніўшы чужы і даўні верш:

Зваявалі жнеі сваё ліха-гора,
Вострымі сярпамі зваявалі.

Жняя, бойкая маладзіца, пачула і ў тон яму, адагнуўшыся, дадала:

Ваявалі жнеі, ваявалі,
А ім хлеба не давалі, не давалі...

Пайшлі нашы хлопцы — стуліўшыся.

Калі «знаходзіць новае», «заглядваць у будучыню» так, як раяць некаторыя «рамантыкі», калі сёння пісаць пра заўтрашні дзень, заўтра — пра паслязаўтрашні і г. д., дык хто ж напіша пра наш час?..

Успамінаецца талстоўскае:

«Нам патрэбны літаратары з буйным талентам бытапісальніка, а ў нас толькі выдумшчыкі».

Мы іх часамі называем лакіроўшчыкамі.

Горка мне слухаць такое:

— Зрабіўшы вылазку ў жыццё, ты вернешся ў сваю кабінетную крэпасць і з-за магутных сцен яе будзеш далей ілгаць, бо адчуеш сябе ў поўнай бяспецы, бо ў гэтым — твой хлеб. І не падумаеш, мусіць, што слухаць цябе па радыё і чытаць бывае проста моташна...

Модная паэтэса пыталася на дачы ў гаспадыні:

— А скажыце, калі ласка, як гэта курачка нясе яечка?

Зусім сур'ёзна, вывучаючы жыццё.

У двух з сябрам у творчай камандзіроўцы. Навалачыліся па калгасах, а цяпер, у раённай гасцініцы, думаю перад сном:

«Як мы будзем дзяліць «мастацкія дэталі»? Як дзеляць, палазіўшы з таптухай, рыбную драбязу?..»

Няўжо такая беднасць, няўжо мы так адарваліся ад народа, што кожнае звычайнае слова якой-небудзь працавітай бабкі здаецца адкрыццём?..

Халаднавата ад гэтых думак...

Нарысіст — «для ўзмацнення канфлікту» — зрабіў героя свайго нарыса інвалідам вайны, з пустым рукавом. Сустрэліся потым — герой і кажа:

— Вось як трэсну вам гэтым пустым рукавом!..

І тыцкае пад нос пісаку здаравенны кулачышча.

«Веласіпеды, нікеляваныя ложкі» — як гэта шаблонна ўжо і як абрыдла у нашых творах пра калгасны дабрабыт!

Вельмі прыемна спажываць набыты сумленнай працай кавалак радасці,— калі там, дзе ты яшчэ ніколі не быў, цябе ўжо ведаюць па тым, што ты зрабіў.

Жонка «гаспадара раёна» расказвае:

— Летам да нас Тхаронак прыязджаў. Ведаеце — рэдактар з Мінска? Паехалі мы з ім да Сцёпкі... Ведаеце — старшыня «Чырвонага коласа»? Два дні гулялі там. А потым Тхаронак прыслаў да Сцёпкі сваіх карэспандэнцікаў, каб калгас яго апісалі...

Тон такі — у зусім нядрэннай жанчыны. Забываецца нават, што і я ж таксама «карэспандэнцік». Тон — запазычаны.

Рэмбрант. Ратэрдамская галерэя.

Многа партрэтаў важных, у той час знакамітых персон.

Сёння забаўна: ім здавалася, што яны робяць ласку мастаку, што не ён, а яны застануцца!..

Калісьці нехта выдумаў сякеру, песню, казку... Сам застаўшыся безыменным. Калісьці кітайскія літаратары пускалі ў жыццё свае творы без подпісу, ананімна.

Чытаў я пра гэта ў юнацтве і недаўмяваў, А цяпер ужо нібыта пачынаю разумець... Нядаўна нават усцешыўся, сустрэўшы ў Галчынскага:

«Працуйце — цудаў няма».

Гані мяне, доля, ад перакатных радасцей капрызнай славы да зямнога, ціхага шчасця вялікай, патрэбнай працы!

Бо як жа працуюць і працавалі мільёны безыменных творцаў жыцця,— у чым іх слава і шчасце?

Масква. Дэкада нашай літаратуры. Чарговы кіраўнік абмеркавання прозы пазіруе з прыкметнай грацыяй. Меншыя геніі, нібы стаўшы за ім у чаргу, дружна цытуюць: «Як сказаў у сваім цікавым і змястоўным слове Пётр Іванавіч...», «Пётр Іванавіч, пачынаючы нашу гаворку...», «Пётр Іванавіч справядліва заўважыў...», «Я не баюся, таварышы, паўтарыцца, сказаўшы, што акрэсленне, якое толькі што даў нам Пётр Іванавіч...»

І гэтак далей. З натуральнай сталічнай свабодай.

Якая мы, аднак, правінцыя!.. Што ў нас здаецца смеласцю, тое не толькі ў Маскве, але і ў Таліне—звычайнае. Як прыкра, балюча, што пакуль я думаў, у якую вату загарнуць мне сякую-такую смеласць,

сякія-такія думкі — і Салаухін, і Смуул пусцілі іх, кожны па-свойму, у людзі...

А ў нас адзін ніяк яшчэ ўсё не адхрысціцца за сваю былую, у іншых літаратурах — ужо даўно не смелую, смеласць.

Калі мы ўчора аглядалі вашынгтонскую нацыянальную галерэю, прыбіўся да нас малады амерыканец, што шукае дружбы з савецкімі людзьмі. Чалавек з вышэйшай асветай, а так і не ўспомніў, якую кнігу, перакладзеную з рускай мовы, ён аднойчы быў прачытаў... А што тут ужо заікацца пра нацыянальныя літаратуры?.. Трэба было бачыць, як ён — шчыры, мусіць, хлопец — здзівіўся, пачуўшы пра тое, што армянскі тэатр святкаваў нядаўна свае дзве тысячы гадоў!..

Не вельмі смешна з хлопца, а шкада яго,— не ведае.

Такія ж знаўцы, як наш гнуткі гід, «спецыяліст па рускай класіцы», адкалупваюць ад глыбы савецкай літаратуры толькі крошкі, патрэбныя ім, і крычаць, што гэта — не проста найлепшае, але ж і адзінае ў нас...

І мы не ведаем усяго, што нам трэба.

І тут, у Штатах, і ў Канадзе часта пыталіся ў мяне пра адносіны да адной з кніг, шго нашумела ў нас нядаўна, да яе аўтара. Пыталіся часам і добрыя людзі, без задняе думкі. А што я мог ім сказаць,— дзе яе прачытаеш?..

Пыталіся і пра адносіны да «светила русской эмиграции» — Набокава з яго «Лалітай». Ну, а пра гэтага я толькі ў Амерыцы і пачуў...

Варта б нам ведаць тое, супраць чаго паўстаём.

Над лугавой ды лясной палескай рачулкай пяюць, шчабечуць, крычаць птушкі — амаль зусім невядомыя, як у маленстве...

Тады, аднак, было не сорамна, што я іх не ведаю,— тады яны былі вялікай, цудоўнай таямніцай, і гэтага хапала.

Мы нават не можам толкам расказаць пра ўсе кветкі з таго букета, які нам часта дораць больш, чым трэба, удзячныя чытачы.

Ёсць і такія таварышы па пяру, што гадамі не паварушаць пальцам для грамадскай справы. Нічым ён не абурыцца, нікога не падтрымае, ні за кога не заступіцца... Сядзіць і напіхае аркушамі свой эпічны сяннік.

Чытаеш такі эпас і заўважаеш перш за ўсё адно — чалавек садзіўся кожны дзень за стол і, не зважаючы ні на што, гнуў лінію.

«Няма таленту, але ж затое які ахоп падзей!..»
Няма ў спевака голасу, але ж затое як ён шырока разяўляе рот!..

Угэтай кнізе вады і праўда няма,— толькі сухі, бясконцы пясок.

Многа чытаю па службе. Колькі да суму шэрага! І ў рукапісах, і друкаванага... І як жа хочацца, як у духмень, каб хтосьці ўсю гэтую шэрасць перакрэсліў маланкай сапраўднага таленту!..

Ён горача пакахаў, але яна адказала:
— Працуй лепш, можа тады я і адкажу табе ўзаемнасцю...
Прачытаўшы гэта ў новым рамане, крытык млява, бяззуба гугніць:
«У каханні яна аддала перавагу грамадскаму над асабістым...»

Пiлiпку-сынку гусі скінулі па адным пяру — ён паляцеў. Калі ж паддацца, каб кожны, хто крытыкуе, вырваў у цябе па пяру ці па два — далёка не заляціш.

— У цэлым вы напісалі добрую рэч. Але ж некаторыя старонкі я вам проста павыкідаў бы.
Таксама, гледзячы на гульню більярдыстаў, можна сказаць, што тых шароў, якія не трапілі ў лузу, не трэба было.

Пеўня спачатку рэжуць, а по тым скубуць. А аўтара на кінастудыі спачатку доўга і калектыўна скубуць, а нарэшце хто-небудзь зарэжа. Што выгадней — варта б спытацца ў пеўня.

Фізікі кажуць: штосьці знаходзім, а потым стараемся яго абвергнуць. Трымаецца,— значыць, жыве.
Такога б нам, літаратарам! Каб аўтар сам сябе правяраў абвяржэннем.

Раман — вялізны палац з яго шматлікім насельніцтвам, ён далёка відаць, але часта ў ім дрэнна з водаправодам, з ацяпленнем, не працуе ліфт... Тады вельмі ж цяжка паднімацца на высокія паверхі палаца і снаваць па яго бясконцых і няўтульных калідорах.

Назойлівы крык: дзе сюжэт?.. няма сюжэта!..
Гэта падобна на тое, каб гледзячы на прыгожую дзяўчыну — перш і больш за ўсё думаць пра яе шкілет.

Бабка, што «вылівае волава», і мастак-абстракцыяніст. Толькі ён і ведае задуму свайго твора, а бабка — часамі не менш натхнёна — сама толькі бачыць у форме расплаўленага і ўкінутага ў міску з вадой волава тую «карову», што напалохала дзіця яе пацыенткі,

За ўсе амаль што дваццаць год пры панскай Польшчы ў нашу забітую, цёмную вёску адзін раз было прывезена кіно. Паказвалі яго ў школе, яшчэ царкоўна-прыхадской, старой і невялікай. Карціна — нейкі галівудскі сераднячок — пра каханне. А духата ў школе — не прадыхнуць, гарачыня — да сёмага поту!.. Па частках, спакваля разгортваецца дзеянне, распальваючы гледача. Трохкутнік — ён і дзве яны. Адна пакінула яго, пасля другая. І вось ён ляжыць у труне. Чысты, харошы — хоць ты плач. І плачуць. Тыя дзве, вядома. Спачатку адна з-за рамкі выйшла, падышла да яго, потым, з другога боку, другая... Жалоба, слёзы, ах, рамантыка!..

І раптам у душнай, потнай, напружанай цішыні — расчараваны голас дзядзькі Ёсіпа:

— Ну вось, і пацалуйце яму цяпер абедзве ў...

Рогат. Абураны голас настаўніка:

— Ха-мы!..

Грубавата, вядома, але ж — здаровы рэалізм.

Аглядалі ў Небарове, каля Лодзі, адзін з радзівілаўскіх палацаў, дзе іх сіяцельствы жылі сабе і ў гады акупацыі.

Пажылы літаратар — у адказ на «аб'ектыўнае» захапленне гіда архітэктурай, мэбляй, бібліятэкай — сказаў пасля, калі мы гулялі па парку:

— Так, яны прыгняталі нашага брата мужыка з вялікім мастацкім густам...

Чытаючы добрую кнігу, падумаў: апроч усіх падтэкстаў, тут ёсць яшчэ і такі — гэта напісана ў дождж, гэта ў радасці, гэта ў горы... і шкада стала, што падтэкст гэты найчасцей адыходзіць разам з аўтарам...

Графаманскі ідыятызм.

Дырэктар дзіцячага дома — «паэт». Склаў песню пра іхні дзіцячы дом, і вучні спяваюць яе, пад яго кіраўніцтвам, на матыў... дзяржаўнага гімна.

Дурань быў бы той, хто пасмяяўся б з вялікіх квяцістых хустак, якімі ўпрыгожылі сябе дзеўкі, маладзіцы і бабы вясковага хору, едучы выступаць у сталіцу.

Малое не есць, і маці вымушана ствараць фальклор — расказваючы яму казку, многае прыдумвае сама. Неабходнасць стварыла і калыханкі і «Эй, ухнем!..»

Пішучы казку, трэба быць такім жа смелым у палёце фантазіі, як смела яна, фантазія, пануе ў снах. Там робіцца ўсё, што хочаш, і ты ўсяму верыш, бо ўсё там «складна і хораша».

Як у маладога танцора, так і ў нявопытнага аўтара прыкра заўважаюцца лішнія рухі. Каб падперціся лішні разок, падмацаваць сваю няўпэўненасць, запоўніць хоць чым-небудзь пустату.

У таварыша, які горача пераконвае цябе ў любві і дружбе, непрыстойна пытацца, ці чытаў ён што-небудзь з тваіх твораў.

Чытаючы тоўстую, сумную, але патрэбную кнігу, прыемна спаткацца, нібы з чалавекам у снежнай пустыні, з нейчымі паметкамі на кніжных палях.

«Пакуты слова». У паняцце гэтае трэба ўключыць іменна тыя пакуты, калі мне хочацца працаваць, а я не магу. Бо якія ж гэта пакуты, калі працуеш? Тады, па-мойму, радасць.

«У газеце, дзе вы надрукуеце мой некралог, няхай таксама будзе недзе побач жывы, таленавіты артыкул пра несмяротнасць сапраўднай паэзіі».

Як жа запахла мне Беларуссю!
Народным, петэфі-бёрнсаўскім словам!..

Сваты прыншлі, а дачка яшчэ маладзенькая. Бацькам — гонар:

— Ды што вы, людзі добрыя, яна ж у нас яшчэ ў рэшаце спіць!..

— І вы, бабуля, па гэтую рыбу ў чарзе стаіце? Адна душой жывучы?

— А што ж, мілы, і адно вока спаць хоча.

— Колькі яшчэ да Наваградка?

— Дзесяць.

— Ого!..

— А што ж ты думаў — ён стаіць на сваім месцы.

Памёр сусед, пажылы чалавек. На хаўтурах старэйшых мужчын запрашаюць пралазіць на покуць. Весялейшы:

— Ну што ж, кандыдаты, пайшлі!..

У лесе на Глусчыне.

Былыя партызаны прыехалі з горада і шукаюць свой лагер. Смешна, але трэба спытацца ў бабаў, што збіраюць ягады.

— Не ведаю,— кажа адна.

Другая — не мясцовая:

— Я і сама сюды не трапіла б, а вось з гатоваю бабай прыйшла.

Цешча вярнулася з юбілею зяця-пісьменніка.

— Ну ж і хвалілі яго... ну, проста ўсякімі словамі!..

— Цётка, а дзе тут у вас райсавет?

— А хвала яго, сынку, ведае, я нетутэйшая.

Сусед, вучоны хлопец, прыехаў з горада ў госці на сваей машыне. Ліслівая баптыстачка ажно рукамі развяла:

— А дзякуй табе, госпадзі мілы, што ты хоць аднаму нашаму чалавечку даў такую павозачку!..

Самаздаволены пашляк, пакуль што не выкрыты злодзей, прыехаў у сваю вёску на нядаўна купленай «Волзе». Выходзяць з жонкай— абое да ззяння перапоўненыя шчасцем і сваёй перавагай над гэтымі людзьмі, суседзямі...

Стары Паўлюк, які сёе-тое ведае пра іх, які самому богу ў вочы сказаў бы, што думае, нібы пугаю смагануў:

— Ну ж і раз'еўся ты, падла, як тая карова на бразе!..

Пры панскай Польшчы.

Дзядзька прыехаў з суда, дзе яго зноў пакрыўдзілі. Вячэрае і, нібы на пацеху самому сабе, расказвае жонцы:

— От жа ж адвакаты рэзаліся — як сабакі!..

Старая бедная баба, выпіўшы кубак паранага малака, якога ёй прынесла суседка:

— Вось я і ачалавечылася!..

Калгасны брыгадзір:

— Мала людзей у мяне. Работа авалодала народам.

Згружаюць штосьці цяжкае:

— Во, брат, людзей,— мне, нясмеламу, і ўляпіцца няма дзе!..

— Даўно я ў сваёй вёсцы не быў. Прыехаў надоечы, гляджу — як малыя павырасталі: хто па пяску нядаўна лазіў — ужо на плоце сядзіць!..

У прыгарадным цягніку. Салдат купляе ў бабы яйкі. Няма куды падзець... Адчыніў чамаданчык.

Цётка— усцешана:

— Ох, мілы, у цябе ж тут яшчэ гэтулькі памяшчэння!..

— Жыве ён бедна — рабіць лянуецца. Можа, кажаце, п'е? Не, ён, па-мойму, і піць таксама лянуецца.

— Хто тоненька, хто тоўсценька, а я і зусім маўчу, дык мне прыходзіцца ў апошнюю чаргу.

На калгасным рынку. Вясёлая, бойкая маладзіца-ўдава:

— Куплю, падгадую, прадам і зраблю выварат!..

Цётка, прадаючы калгаснуга расаду:

— Яна ж у нас — як рыба. Мінутку на паветры пабыла — і звяла.

— Ой, бабачкі, гарачыня! З ранку да вечара — ані зміргне!..

— Дзеці ў яго — розных нацыянальнасцей: адно на адно ні крышку не падобныя.

—Якія табе дакументы, калі ў мяне і кішэняў няма!..

«Вільня патане, а Кромань устане».

Пачуў гэта на Наваградчыне, ад вясковай цёткі. Прыпомнілася славутае: «Горы і долы зраўняюцца».

Другая цётка:

— У нас калісьці казалі: «Каб ты ў Бабруйску рабіў!»

Чаму так праклінaлі, не ведае. Цьмяна прыпомніў, што сустракаў недзе ў Герцана: «Лепш ужо Вятка, лепш Сібір, абы толькі не Бабруйск!..»

Мелася на ўвазе крэпасць.

Пажылы афіцэр, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, сапёр, які нядаўна страціў зрок пры размініраванні алжырскіх палёў, гаворыць з трыбуны, перад поўнай залай піянераў:

— Смерць я, дзеці, доўга насіў на руках. Каб другія яе не бачылі.

— Сам ад сябе ў бутэльку не ўцячэш.

— Ён не дзівак — не будзе чакаць, пакуль праспявае трэці певень!..

Праваслаўныя дзядзькі крытыкуюць баптыстаў:

— Што гэта ў іх за прычасце — хлеба накрышыць у віно... Бацюшка, дык той ж а ўсё-такі часціцы з хлеба выразае...

Не менш урачыста гавораць самагоншчыкі:

— Ну, будзем дрожджы ў брагу апускаць...

Памёр ужо даўно не толькі цесць, васьмідзесяцігадовы дзед Сцяпан, але і зяць, няўдаліца-каваль Мікола. А вершык, складзены цесцем пра зяця, жыве і ходзіць па навакольных вёсках.

Цяжка соп Мікалай,
аж гудзела гарно,
майстраваў, майстраваў,
ну, а выйшла ...

Няхітры вершык, але часта прыдаецца.

Як дабірацца да сэнсу мянушак?

На дзядзьку кажуць Кунила. Чаму? Аказваецца, бацька яго вельмі любіў песню:

Вот скоро, скоро поезд тронет,
звонок уныло прозвенит...

Імя калгаса — высокае, а на працадзень выдалі па трыста грамаў.

Стары пячнік, вылачашчы п'янчужка, звоніць туды з сельсавета па тэлефоне: — Скажыце, калі ласачка, гэта калгас «Няпоўны фунт»?..

Імглістая, парная раніца.

На сівым, старым частаколе пры студні — росны круг павуціння. За плотам — цёпла-барвовыя, буйныя кветкі канюшыннай атавы. Над імі — у мокрым лісці — цяжкія, спелыя, малінавыя слівы...

Прыгадваецца Лермантаў. Што, хіба гэта не бяссмерце?..

На рыжскім калгасным рынку — вясёлая процьма кветак, а пад сталамі спакойна ходзяць «никем не обижаемые голуби»...

Простыя словы, а — разам з воблікам Кацюшы Маславай — запомніліся на ўсё жыццё. Вось ужо трыццаць год прайшло ад першага — можа, нават і не зусім свядомага яшчэ — захаплення.

Талстоўскі Познышаў сказаў калісьці: «Цяпер я на поўдзень. У мяне там домік і садок».

А я вось хаджу па ўскраінных вуліцах ды завулках Кіславодска, гляджу з акна электрычкі, едучы ў Пяцігорск, і радасна ўспамінаю іх, тыя, вельмі звычайныя, словы.

Якая дакладнасць, і што яна азначае ў вялікім майстэрстве!.. Скажы ён «дом і сад» — нічога не было б.

Перачытваў Багдановіча. І ўжо каторы дзень... ну, проста не выходзіць з галавы:

...Нават сорам на хатніх зірнуць:
ці не ўцямілі, хвароба на іх,
ад чаго мой тварык смяецца,
ад чаго маё сэрцайка б'ецца.

А мой Міхась Васілёк, у якога жыта парасло на старэнькай хаце, які так здорава расказвае пра паляванні на дзікоў, пісаў чамусьці і такое:

Чорнай курыцай на стрэхі села ноч
і клюе, клюе рассыпаныя зоры...

Праўда, мы з ім пасля смяяліся з гэтых радкоў.

Слухаючы «Ой, не кукуй, зязюленька» ў цудоўным выкананні Шырмавай капэлы, мне шчасліва хацелася заплюшчыць вочы, працягнуць рукі і абмачыць сваё пальцы ў свежасць вясновай раніцы... Як у расу. Як у крынічную ваду. Каб пасвяжэла на душы.

Справа і ў музыцы, і ў слове.

У другой нашай песні п'яны мужык сам лёг спаць, а жонку паслаў шукаць у полі каня. І вось яна, маладзенькая, і дзе:

...Памажы ты, зорачка,
знайсці мне конічка!..

Які малюнак ночы!..

А што за дакладнасць, якое сілы зарад і крыўды, і жаласці — «хоць ты вазьмі разарвіся ад слёз!..» — у прасценькіх, наіўных і, нехта скажа, сентыментальных радках:

Ой ты, мамачка, мамка,
цябе кліча дзіцятка —
пашкадуй ты сіротку
ды памый мне галоўку!..

Ну, а размашысты задор у «Лявонісе»:

А пасынка дык і чорт не бярэ —
несалоную капусту жарэ!..

З прыемнасцю чую, як падпявае сабе гэта вясковы хвацкі танцор, слоў не знаходзячы ад весялосці.

У «Известиях» настаўніца абураецца тым, якой бюракратычнай мовай гавораць на камсамольскіх сходах школьнікі.

Пра двух хлопцаў, зусім розных, дзяўчынка расказвае аднолькава сухімі, бясколернымі словамі. І можна ўявіць гэтых хлопцаў, хто іх не ведае, сумна стандартнымі — як дзве новыя парты.

У старанна апрацаваным рэдакцыяй выступленні заходнебеларускага дзядзькі ацалела фраза: «Адзінаццаць год паноў няма, а рукі мае яшчэ ўсё баляць».

Хоць ты дзякуй скажы, што захавалі гэтую залацінку, не заграблі яе ў слоўным пяску.

Чытаю прозу Петэфі. З той самай асалодай, «на той самай струне», як перачытваў нядаўна Бёрнса.

Перапыніўся, каб пазваніць старэйшаму, даўно любімаму сабрату па пяру, што занядужаў.

— Ну, як ты там сябе адчуваеш?

— Ды ўжо, брат, за сталом. Не пішацца... Сяджу, уздыхаю, як конь над пустым цэбрам...

Як жа запахла мне Беларуссю! Народным, петэфі-бёрнсаўскім словам!..

Мастацкае слова намякае, ажыўляе ў фантазіі чытача адпаведныя вобразы. Гаму часамі, калі на нейкі момант выключаецца фантазія, вельмі дзіўна, ледзь не вусцішна бывае чытаць,— застаюцца толькі літары, толькі словы, толькі радкі...

Перачытваў «Палату № 6» і міжвольна спыніўся на думцы: а ці не меў ён на ўвазе ўсю Расійскую імперыю — шостую частку Зямлі?

Бабуля:

— Укленч за сталом і еж!

Унучка:

— Калі ж бо мае кленчы баляць!

Слесараў сын, пяцігадовы, даволі распусны хлапчук, не любіць бабулю:

— Яна такая пагнутая, памятая...

Ляжыць на канапе і крычыць раз-поразу «Ура!»

Маці з другога пакоя:

— Што ты там робіш, Андрэйка?

— Уракаю!

— Што ты спяшаешся? Яшчэ ж не вясна. Надзень зімовае паліто. Падумаеш — паненка, пяты клас!..

— Зімовае... Буду як памідор на дзвюх запалках!

Паліто шырокае, а ножкі тонкія.

Хлопчык са шклянкай недапітага ліманаду:

— П'еш — салодкі, а вып'еш — салодзенькі!..

Малая, што пяты месяц ходзіць у першы клас:

— Было ў мяне трохі двоек, але ўжо ўсе звяліся.

І так можна акрэсліць валютны курс:

— Тата, а з крэйцэра многа рэшты?

Стаміўшыся на вуліцы або ныючы дома, хлопчык, чатыры гады, вельмі любіць гартаць перакідны каляндар.

Пасля неяк маці, вярнуўшыся з працы, ласціцца з ім:

— Вось і вясна. І як жа я цябе ў вёску да цёці адпраўлю? А сама буду плакаць?..

— Я без цябе не паеду. І цяпер не паеду, і на другі каляндар не паеду!..

У хаце — першы сынок, першы ўнучак. Ён увайшоў у жыццё ўсёй сям'і паўнаўладна, як рэфарматар. Нават граматыку сваю ўвёў. Пра сябе ён, напрыклад, гаворыць звычайна так:

«Валодзя хочаш спаць». «Валодзя не хочаш есці». «Валодзя пойдзеш на двор».

І ўсё гэта важна ў яго, неабвержна. І ўсё гэта міла.

У паліклініцы.

— Здарова, Зойка, што ты тут робіш?

— Я — па пытанню зубоў.

Гэта — не жартам: дзяўчына на кіруючай рабоце.

Маладая кладаўшчыца дома адпачынку смяецца, гледзячы ў накладную:

— От дзе графа: «Наіменаванне грузу — супрацоўнікі»!..

Бухгалтару, старой і стомленай за век жанчыне, гэта зусім не смешна.

— Машына ідзе у горад і штосьці вязе. Значыцца,— тлумачыць яна з усёй сур'ёзнасцю,— гэтае штосьці павінна быць паказана ў адапаведнай графе.

Партрэт знатнай даяркі і артыкул на такой — і горшай — мове:

«Даярка Ганна Н. сваей самаадданай працай развянчала гнілую тэорыю пра тое, што кожная фуражная карова, калі яе адпаведна карміць...»

Што падумае сама тая Ганна Н., атрымаўшы газету,— ці зразумее, што яна ды калі развянчала — пра гэта як быццам ніхто і не дбае.

З газетнага нарыса:

«Тут яна праявіла ўвесь свой незрасходаваны розум простай сялянкі...»

Пачатак дамскага рамана:

«Бацька ляжаў на ложку і ціха змагаўся сам з сабой...»

На нарадзе маладых пісьменнікаў адзін з арганізатараў гэтага мерапрыемства, салідны, акулярысты таварыш, чытае сваё апавяданне, ужо надрукаванае ў «яго газеце»:

«Заходзіла сонца. На калгасным двары чуліся галасы, дзявочы смех і прызыўное ржанне жарабца...»

І доўга трэба тлумачыць яму, чаму гэта дрэнна.

З даклада «масцітага» крытыка пра вядомага празаіка:

«Гэта быў пісьменнік ільвінай працавітасці...»

А землякам, хто памятае вясёлага, простата, людскага аднавяскоўца, што выбіўся ажно ў «пісацелі», сядзі, слухай такое ды думай:

Што ж там ужо ў ільва за працавітасць?..

Пры панскай Польшчы. Моцна начытаны палітвязень, просты і не дурны вясковы хлопец, піша з турмы дахаты:

«Правільна разважаючы, з пункту гледжання палітычнага, гістарычнага, маральнага і беручы абстрактна, мае вяртанне да вас, дарагія тата і мама, з'яўляецца поўнай утопіяй...»

Стары бацька даў адвакату два злоты, каб растлумачыў, што тут да чаго. Бо вельмі напалохаўся. Ну, што абстрактна — дык гэта ж яму не першы раз па той беднай с... даюць, але ж якая там была ўтопія — завошта хацелі хлопца ўтапіць?..

На тэлеграфным слупе ў калгасе прыбіты чырвоны трохкутнік з заклікам:

Сейте больше кукурузы,
Твердо помните о том:
Благодатная корова
Вам заплатит молоком!

Райпракурор:

«Грамадзянін К. заняў у сваім агародзе чужую карову І пасадзіў яе ў свой хлеў».

Тыя пачуцці, што былі маёй радасцю, маім зліццём з прыродай, маёй малітвай яе прыгажосці...

Над зямлёй — красавіцкае неба: ахапкі белых воблакаў, халаднаватая просінь і жаўранкі.

Зямля то светла-шэрая, дзе не хадзіў яшчэ сёлета плуг, то сакавіта цёмная,— і там, дзе ўлонне яе толькі што раскрыта для новых зярнят, і там, дзе ўжо затоена грэецца безліч аўсяных парасткаў.

Сёння ўранку ўжо значна смялей, як учора, ажывае зяляніна руні. Лагодныя шэрыя ўзгоркі ўдалечыні пацягнуты смугой. Паміж вёскамі, па лугавой даліне, цячэ апетая ў сардэчнай песні рэчанька...

На шэрых коціках вербаў гаспадарліва завіхаюцца пчолы. На бярозах над стрэхамі хат ад радасці разводзяць крыллямі шпакі.

За ўзгоркам з ночы грукоча трактар. Араты.

Іду на гэты гул. Па чыстай, маладзенькай пасля снегу сцежцы.

Пад раніцу быў дождж. Бубніў па блясе даху, шамацеў па зямлі...

І вось — арэшына пусціла, дзеля свята, белы цвет; лаза прыкметна, весела пазелянела; бярозкі і асінкі шчодра акроплены расой і чыстыя ды цёплыя — хоць ты скажы ім:

— З лёгкай парай!..

На фоне заўсёды шчодра зялёных ялін святлеюць асіны, яшчэ ўсё голыя, ды ўжо, як кажуць, вось-вось на выданні. Стаяць яны навакол бруднай, а ўсё ж люстранай вады азярца, над якім я пішу.

Спявае салавей:

«Людзі, людзі! Ідзём! Ідзём! Віцязь, віцязь! Па-лі-клі-ні-ка!..»

Адзін, другі. І добра, молада — так расшыфроўваць іх перасвіст.

Думаў: каму ж ён спявае? А я — каму пішу? Сабе?.. Такі павінен быць настрой, такая шчырасць. А чытача, вядома, трэба бачыць.

Халаднавата пахне прэллю. Снег — плямамі, чэрства хрумсціць пад нагамі. На арэшніку—коцікі; днём, калі пацяплее, і падвечар на іх ажыве пылок; кранеш галінку — успыхнуць, як бенгальскія агні, клубочкі-выбухі зеленавата-жоўтага колеру.

Птушыны гоман... Ужо другую ноч мяне праз адчыненую фортачку будзіць пугач — зусім, здаецца, блізка ад акна і неяк па-фальклорнаму вусцішна. Цяпер недзе за лесам, з хутара, чуваць па-хатняму празаічна-дзярлівае, а ўжо таксама вясновае, іншае кукарэку.

І радыё бубніць адтуль. Таксама ўжо даўно і вельмі звычайны... здаецца нават — голас прыроды.

Дубы, азімыя дубкі стаяць у леташнім лісці, арэхава-жоўтым і лішнім. Падсада малюсенькіх, пяшчотных, як у казцы, елачак і непакорны брусьнічнік, нібы барвінак у дзявочым гародчыку.

З сямі да дзевяці хадзіў па просеках ды сцяжынах, шукаў фіялак, ірваў пралескі. Дахаты.

Ранішні перасвіст берасцянак і салаўёў, Разгублены, ці што, зязюлін сум. Высока над лесам — стрымана-радасны гул самалёта. Трактар — бліжэй, нібы нават вось-вось за дрэвамі. Здалёку, ад жылля — сабачы незаядлы брэх...

Як родным дымам, як пахам першых пракосаў, дыханула маленствам, паэзіяй...

І няўжо я пайду, не апісаўшы усё гэта як след, не пасеяўшы на радкі ўсе тыя пачуцці, што былі маёй радасцю, маім зліццём з прыродай, маёй малітвай яе прыгажосці?..

Стаю над паплаўком.

Навокал — над ракой, над кустамі і лугам — нястрымныя, утрапёныя жаўранкі і салаўі. Таямнічае, поўнае глыбокага сэнсу пагрукванне грому.

Цымбальныя скокі дажджу на вадзе. І тады — нарэшце! — вялікая, першая плотка...

А маланка ўсё хрысціцца. І сапраўды — як спалоханая маладзіца.

Мокры, халодны чэрвень.

Каля поўдня выглянула сонца, мацней запахла летняй гразёю і зялёнай вільгаццю. іду ў сваю вёску. За грэбляй — сухая «сценка», абапал якое яшчэ няраслае, але ўжо каласістае, сіва-зялёнае жыта. З яго ўгару, у нізкае хмарнае неба расце, як калоссе, бясконца, здаецца, шматлікая песня жаўранкаў.

Паехалі на рэчку. Гразь. Матор грузавіка ідзе на суцэльным рыданні. Нёман, як і заўсёды, быстры, прыгожы, жывы, У лазняку на тым беразе б'юць салаўі...

Думаў, пакуль сядзелі над паплаўкамі:

«Так усё проста гэта, здаецца, і так глыбока, вечна, неразгадана. І добра!.. Хоць і журботна думаць пра смерць, неўміручасць. Колькі іх, гэтых салаўёў мінулася, а ўсё, здаецца, тыя самыя яны — пяюць, нясуць жыццё!.. Што ж, так і мы».

Знаёмая партызанская кузня. Колькі яна працавала тады на кавалёву сям'ю, а колькі на нас?.. Цяпер абкідана калгасным інвентаром. Гудзе горнам і звоніць кавадлам, як і заўсёды, неяк загадкава хвалюючы... І каваль, як заўсёды, замурзаны, з усмешкай:

— Няўжо ж гэта, хлопцы, ужо шэсць год прайшло пасля вайны?..

Вёска яшчэ не зусім акрыяла ад трох акупанцкіх пажараў. А ўжо відаць і рысы новага — будынкі брыгаднага двара, антэны радыёпрыёмнікаў...

Нёман. Гаючая, родная прыгажосць. Успамінаецца той час, калі яна, гэтая прыгажосць, адчувалася і паколатымі, патрэсканымі нагамі. Маленства з вечнай аскомай ад няспелых яблыкаў, з назіраннем жыцця ў дробязях, знізу, калі многае, чаго не заўважаеш сёння, заўважаў і многае адчуваў мацней, без наўмыснага падыходу, без прывычкі запісваць, хаця б толькі вачыма.

Дзікі дзень на рацэ. Са спінінгамі — уніз па плыні, да краю пушчы. Печаная ў прыску, па-першабытнаму смачная шчупачына. То дождждык, то сонца, то вецер, што згортвае хвалі ў баранчыкі. Пясчаная сцежка ў мокрым лазняку. Крыўдна, недаравальна запусцелыя партызанскія магілкі... Халаднаваты, быстры брод.

Ад гэтага броду, ад пушчы хмары гналі нас у другую вёску. На ўсходзе весела ззяла вясёлка, як сімвал ціхага жыцця, што так па-свойму адчуваецца ў гэтых шматпакутных мясцінах...

Першыя мэндлі. Шпакі пачынаюць лётаць чародамі. На выгане — басаногія пастушкі і дамавіты пах торфу ад іхняга вогнішча. Заходзіць сонца. Бусел вяртаецца з купінай у дзюбе. Век жыві — век будуйся. З гнязда на загуменным вязе бусліха вітае яго гаспадарлівым клёкатам.

Бязмежныя, як неба, прасторы жыта. Дзе так нядаўна яшчэ стракацелі палоскі. Абозы сена. Навінка тут — трактары, грузавікі...

Ідылія вечнага і сучаснасці.

Адзін з нашай рыбацкай валачашчай тройкі, навічок у гэтых мясцінах, казаў, што на Свіцязі ён адчувае нейкую незвычайную лёгкасць, як ні на адной іншай вадзе, якіх ён, дарэчы, аплаваў ды абязрыбіў нямала. Пад яго кіраўніцтвам і Свіцязь раскрылася для мяне яшчэ адным сваім бокам. З лодкі, заякаранай каля легендарнага трысніку, мы вылавілі за раніцу мноства бойкіх акунёў. І паплаўкі, жывыя паплаўкі на невыказна лёгкай і светлей вадзе, пойдуць за мною дзіцячымі снамі.

...Узгоркі Навагрудчыны, калі глядзець з гары, ледзь не ў шахматным парадку ўкрытыя пералескамі. Дубы і грабы. Жытнія мэндлі. Грэчка ў пахкай красе. Жніўная песня. Рупліва махае рукамі жняярка. На гасцінцы, уздоўж бруку, над раскварчаным адхонам — добрая сцежка для нашага брата-веласіпедыста. І цянёк ад прысадаў, і голле трохі зачапаецца лістотай. У цяньку каля хутара, на траве, да чорнага хлеба вельмі добра падыходзіць свежае малако.

...Пасля ўзгоркаў ды пералескаў, ад Карэліч на Любчу пачынаецца лагодная роўнядзь, з часцейшымі мэндлямі, светла-зялёнымі прасторамі слаўнага лёну, усыпанай кветкамі канюшыннай атавы, густых, зярністых аўсоў. Вёскі цягнуцца амаль неразрыўным ланцугом, дружна чапляючыся адна за адну, злучаныя звонка ўкатанымі дарогамі, абапал якіх густа стаяць то нізкія каржакаватыя вербы, то велічныя красуні ліпы, з якіх яшчэ ўсё асыпаецца духмяны пыл. Рэшткі апетага Міцкевічам: «ціхія грушы» на межах... Хаця — межаў няма. Навокал стаіць густое, каласістае жыта, спакойна дыхаючы смачным, гаркаватым пахам. І на ўсім гэтым фоне — сведчаннем часу — працуе камбайн.

...У Любчы — ужо шырокі пасля нашых Ярэміч, падкормлены водамі некалькіх рэчак Нёман. З яго адвояў — мы бачылі — сетка вымае на сонца шыраказяпых, выпасеных шчупакоў. За ракой, на зялёнай прасторы, што канчаецца на даляглядзе цёмнай сцяною лесу, ходзіць калгасны статак. Ад саламянага будана над Нёманам, дзе збіраюцца ноч нанач каровы і куды прыязджаюць з бітонамі даяркі, увечары чуваць дзявочыя жарты і смех, а бліжэй — дзюрчанне ў звонкія вёдры духмянага сырадою. Блізкасць пушчы адчуваецца не толькі над ракой, берагі якое завалены падрыхтаванай для сплаву драўнінай, але і ў самым гарадку. Новыя домікі стройнымі і шчыльнымі радамі закрылі ваенныя пажарышчы. З вялікіх асветленых акон грыміць радыё, праз белую павалоку фіранак відаць зеляніна вазонаў... Вузкакалейныя рэйкі заўсёды здаюцца яшчэ меншымі, чым яны ёсць у сапраўднасці,— хоць ты вазьмі іх з сабой, каб парадаваць дачок новай забаўкай. Фанабэрысты паравозік цягае свае тры вагончыкі ўздоўж платоў і варотаў, з блазенскім, задзёрыстым свістам, чапляючыся комінам за лісцё вішняку і двойчы на дзень акурваючы яго чорным дымам. Многа пяску, што асабліва адчуваецца ўвечары, калі з-за Немана вяртаюцца каровы.

...На ціхай вадзе рэк і рэчак, над як імі сям-там грукочуць бяссонныя млыны,— раскашуюцца сытыя, міла-стракатыя свойскія качкі, водзячы па люстранай паверхні вады, нібы накрэсленыя цыркулем, кругі.

...Ад Немана да Кромані — пяскі, па якіх вельмі цяжка каціць наўючаны веласіпед. Лясная глухмень і раптам — «модрае вока» ў сасновым кальцы!.. Асабліва хараша выглядае светла-зялёная падцянёўка сітняка — паміж цёмнай сцяною лесу і агромністай шыбай вады. Дно Кромані светла-карычневае. Пройдзеш — доўга відаць вялізныя сляды і падымаюцца наверх бурбалкі. Многа ракаў, якіх мы лавілі «сакаўкай», а пасля оптам пяклі ў прыску вогнішча. Безліч

малявак, асабліва відных на захадзе сонца. Шчупакі і акуні палююць зусім нахабна, глытагачы плотак ледзь не ў паветры. А куні — гарбылі. Добра выглядае такі, узброены пілой калючак, прыгажун, наструнены на спінінгавай жылцы! Вельмі прыемна адчуць яго першы рывок і супраціўленне, як доказ, што ў сіняй бездані — не пуста. У завадзях, адгароджаных ад берагу сітняком, раскашуюцца — тут ужо дзікія — качкі, мноства качак і ўсе без горкага вопыту,— лодку яны падпускаюць бліжэй, чым на стрэл. Добра слухаць іх гоман і фуркатанне крылляў пры ўзлётах. І тут матылі залятаюць на самую сярэдзіну возера. А паверхня вады, замест свіцязянскага ліпавага цвету, пацярушана сівым пылком насення сітнякоў.

Пішу раненька, у буйным, росным садзе, на лаўцы каля пагрэбніка.

Адгэтуль, са старога саду з пакрыўленымі яблынямі і магутнымі грушамі, відаць спрадвечнае — спелае жыта на неабсяжнай слуцкай раўніне і новае — капры калійнага камбіната. Удзень адтуль сюды даходзіць гул матораў, ноччу—музыка. У сад прыйшоў і стаў высокі слуп з пявучымі драгамі — зноў новае ў старым. Шпак высвіствае сабе на гэтым слупе, «смажыць сала», як на шпакоўні ці проста на голлі.

Я ж не магу без хвалявання думаць пра тое, што і я быў, нарэшце, у цудоўнай падземнай казцы беларускай рэчаіснасці — хадзіў па бясконцых і зіхатліва прыгожых тунелях, сам перад сабой, як блазен, фанабэрыўся курткай, каскай і ліхтаром шахцёра, неяк вельмі ж свабодна і молада, па-марскому, з соллю на вуснах, дыхаў паветрам Салігорска,

Ціхая рэчка ў спякотнай данскай станіцы.

Садзіцца сонца — недзе за высачэзным трысцём.

Лазім з волакам па прахалоднай, мутнай вадзе, ранячы ногі на патайных «чарапашках» і старчаках.

Рыбацкія «прыстані», сцежкі-праёмы ў трысці, дзе на дасвецці, падаслаўшыся ахапкам сена або старою курткай, сядзяць над паплаўкамі мясцовыя аматары ціхага і цярплівага хвалявання. На дзень праёмы пазакладаны калючым цёрнавым голлем. Доступ у гароды закрыты; гусі і качкі гамоняць на вадзе, не вельмі баючыся нас.

Мы прыпыніліся каля трысця — перадыхнуць перад новым, можа, бог дасць, шчадрэйшым заходам.

І вось на «прыстань» на супрацьлеглым, светлым беразе выйшла з вёдрамі маладая казачка.

Ёй гэта — проста работа: яна, высока падаткнуўшыся, палівае капусту.

А нам — як падарунак нейкі або цуд — засвяціла проці захаду раскошна сонечнымі, стройнымі нагамі.

Хмарная ноч. За акном шуміць мора. Быццам нехта бязмежна дужы хоча ўзабрацца на бераг, злізаць з абрыву наш дом. Ён, гэты нехта, не злосны,— у перакатах яго наступу чуваць хутчэй нейкая нават туга, да нуды аднастайная, шматгалосая жальба на лёс, што асудзіў вось так, для нейкай незразумелай мэты, шумець і шумець... Ласкавы, цёплы, пеністы шум. Калі ты дужы і сам, ён пагайдае цябе на хвалях. Калі ж ты слабы — лепш не лезь, як блазен, угрудкі да здаравеннага дзядзькі, бо ён цябе толькі патрэпле вялікай рукой за чупрыну — заплюе твае ногі жарствой, паваліць і выкаціць разам з галькай на бераг. Наваг скажа, здаецца: «Ну, ну!..» Так і гаворыць, так і чуваць у ягоным шуме панурая, нязлосная пагроза дарослага, які сумна заняты сваей невясёлай справай і не любіць, каб яму перашкаджалі.

Днём яно, мора, пяшчотна, сонечна бірузовае.

Горы — цёмна-зялёныя. Ідзеш па беразе, забудзешся, дзе ты, і вось —праз зелянiну дрэў у садзе — убачыш, здаецца, хмару. Дождж будзе, ці што?.. І раптам успомніш, што гэта — Каўказ!..

Снегавых не відаць. Да самай вяршыні зялёнай гары ўзбіраюцца дрэвы, якія адгэтуль, з марскога берагу, здаюцца кустамі.

Хмары над гэтай зелянінай, ці, лепш сказаць — на гэтай зелянiне, здаюцца дымам вялікіх вогнішчаў, раскладзеных дзесьці ў гарах. Вогнішчы тыя доўга гараць, лена і безупынна падпускаючы адтуль на мора дым. Ды ён ніяк не хоча разлучацца з зелянінай гор...

Бязмежная паэзія, якую нашай лыжачкай не вычарпаць да дна.

Цясніны з сухімі, камяністымі рэчышчамі. Горная дарога, абапал якой то бамбук, то гранатавыя дрэвы з чырвонымі і пругкімі, як з воску, кветкамі, то дубы і грабы, то кусты ажыны. Каменныя домікі на высокіх падмурках. Дзіўна маленькія вуллі. Ослік стаіць на ўзбоччы гары, ніяк не могучы прыдумаць, дзе б гэта напіцца... Карова звоніць бляшаным іржавым званном. Высвістваюць дразды. Козы пасуцца з мяшэчкамі на вымі, каб казляняты не ссалі іх без ведама гаспадынь. Стары абхазец, пастух у чувяках, падобных на скураныя лапці нашых пастухоў. Босыя хлапчукі ў цюбецейках. Загарэлыя, абавязкова вусатыя мужчыны волакам цягнуць на валах з гары тоўстыя, грымучыя бярвенні...

Радуле Сціјенскі, паэт не толькі за рабочым сталом, расказвае мне пра сваю далёкую Чарнагорыю. Цікавы чалавек — з яго прыемна калечанай рускай мовай, з яго маладосцю ў шэсцьдзесят год, з разумным гумарам і веданнем гор.

Сардэчная паэзія далёкага маленства!.. Як ён, Радуле, калісьці прабіваў браню чарапашкам, звязваў іх, запрагаў у малую сошку і «арау». Як яму пахне адтуль пастушыная яда — авечы сыр, ляпёшка і дзікі часнок...

Мы ідзём па камяністай, вузкай дарозе, апіраючыся на доўгія бамбукавыя посахі.

Далёка ўнізе — мора з каёмкай пены каля берагу.

Зялёныя вяршыні гор, абмочаныя знізу ў рэдзенькі студзень сівых воблакаў,— што раз бліжэй да нас, а ўсё ж — высока!..

— Добры дзень!— з натуральнай прыязнасцю вітае мой спадарожнік сустрэчную абхазскую бабулю. Засушаную, лёгкую, усю ў чорным. І зусім сур'ёзна пытаецца ў яе: — Скажыце, а ці далека яшчэ да Царграда?..

Ноччу была навальніца: гром над морам і стук дажджу па вялікіх лістах смакоўніцы.

Зранку хмары, яшчэ ўсё цёмныя, ішлі з мора на горы. Там, над вяршынямі, неба святлейшае, нават не-не ды пакажацца сонца. На захадзе — рэзка акрэсленая лінія марскога далягляду. На цёмнай вадзе — белыя баранчыкі, на цёмным небе — белыя чайкі.

Свежа, духмяна, прыгожа.

Апаўдні хадзілі ў горы.

У калючым ажынніку — чорныя, спелыя ягады. Назбіраеш жменю, глынеш — нібы глыток вясёлага віна. У засені магутных букаў, на вышыні шэсцьсот метраў, ляжаць сівыя, папярэшчаныя зялёным мохам камяні...

Добра закурыць над абрывам цясніны. І гутарыць «о временах грядущих...»

Добра гайдацца, учапіўшыся за пруткае голле бука.

Добра знайсці сцюдзёную крыніцу і прыкленчыць каля яе гаваркой вады.

Добра ўспомніць, што ўчора ты стаяў на носе імклівага кацера і — паміж ціхім морам ды спакойным небам — адчуваў сябе вольным, як чайка!..

За вялікімі шыбамі параходнага салона — сонца, амурскія хвалі і сопкі, якія і нам, навічкам, ужо здаюцца аднастайна экзатычнымі.

Зблізку яны шэрыя сваёй камяністасцю і жыва — проста, здаецца, адчуваеш яе — парослыя зелянінай, вечнай і некранутай. Здалёк — чым далей, тым больш засмужаныя.

Зрэдку трапляюцца вёскі, каля якіх наш «Калінін» паволі, грунтоўна становіцца на якар і спускае шлюпку.

Ноччу гэта было цікава. Святло пражэктара паўзло па шэрым беразе, па шэрых, крытых драніцай хатах, па шумным натоўпе дарослых і дзяцей, што беглі да прычалу. Якая навіна!.. Ад парахода да парахода — вось і жывая сувязь са светам. У крузе пражэктарнага святла — усхваляваная чародка людзей; над імі — былінны, васняцоўскі месяц; Да іх ад борта парахода паўзе поўная шлюпка. Звычайна, нудна, усюды адну і тую ж польку рыпае прывітальна мясцовы гармонік. З лодкі высядаюць мамы, таты, сёстры, браты і дзеці, што вярнуліся з далёкага Камсамольска, з гарадскімі пакупкамі...

А навокал — тайга. На многія сотні кіламетраў. Ужо не толькі ведаю гэта з чужых слоў, але ж і адчуваю...

Сумна тут жыць?

А што я думаў часамі ў родных мясцінах, праязджаючы каля самотнага хутарка? Вярнуцца з горада, ад вялікай культуры — у такую хатку?.. Нават у родную вёску, з яе непралазнай восеньскай гразёй, з адчайна сумнымі вечарамі?.. Гэта парой здавалася немагчымым, як немагчыма пеўню вярнуцца ў яйка. Аднак жа мне не толькі ў гады маладосці было там не сумна: і цяпер мне часта хочацца ўцячы туды, і ўцякаю,— каб палячыцца зямлёй, цішынёй...

Успамінаю пакінуты Камсамольск. Нуднаваты Бабруйск на вялізнай раўніне, паміж далёкімі сопкамі, на беразе ракі, шырынёй — не верыцца! — сем кіламетраў. Было сумнавата часамі, у пыльнай і суровай аднастайнасці, было б яшчэ сумней, каб не сустрэчы з людзьмі.

Добра было з чытачамі-студэнтамі ў адной з гарадскіх бібліятэк. Яшчэ цікавей — з рабочымі «Амурсталі». Каля іх вогненна-велічных мартэнаў, у Ленінскім кутку, за гасцінным сталом. У маладзёжных інтэрнатах неяк вельмі ж па-свойску лёгка было і расказваць пра Беларусь, пра нашу культуру, і чытаць сваё, калісьці, у адзіноце, народжанае натхнёным болем і шчасцем...

На амурскіх выспах расце высокі зблізку тальнік і радасна рассцілаюцца пляжныя пяскі.

Пазаўчора мы здорава адпачывалі на адной з такіх выспаў, гасцюючы ў мілай беларуска-ўкраінскай сям'і. З юшкай, чаркай,

купаннем і беганінай. З вогнішчам і песнямі — увечары, калі мы чакалі кацера, што спазняўся.

З тальніка капала — нібы вось-вось пачнецца дождж. Амур заціх магутнай цішынёй. А на тым беразе ўспыхнула, нам у падтрымку, другое вогнішча. Відаць, рыбацкае: заўтра нядзеля. Сіпла, прапітым басам рыкаў з таго боку, з далёкага статка бугай. Пясок, з якога сышла вада, разрысаваны быў хвалямі на дзіва аднолькавым, рытмічным узорам...

У вячэрняй халаднаватай свежасці, на кацеры, які забраў нас нарэшце з вострава, па-хатняму люба было выпіць далёкаўсходняга сырадою. Пастаяўшы ў чарзе да бітона за белагаловым беларуска-ўкраінскім хлопчыкам, што ўжо закончыў першы клас і добра іграе на скрыпцы. Мі ж іншым — і татаву родную «Перапёлачку»...

Што да прыгажосці прыроды, дык і тут, на параходзе, мне даволі часта ўспамінаецца Чэхаў. Асабліва на захадзе сонца і зорнай ноччу. «Апісаць гэтую прыгажосць я ніяк не магу, я прызнаю сябе жабраком...» І другое: «Усё было б вельмі прыгожа, каб не блізкасць катаргі...»

Цяпер — для мяне — каб не расказы мясцовых людзей пра нядаўнюю катаргу «культаўскіх» дзён...

Нарач.

Сонца на захадзе. Зірнула з-пад хмары, як спадылба, і хвалі, неспакойныя ад халоднага ветру, неяк адразу сцюдзёна, нявесела заблішчалі пад чорнай столлю нізкага неба.

Дажджавая хмара раздзялілася на два крылы. Левае — цяжкае, навальнічнае — пайшло на поўдзень, дзе балоты над Нарачанкай і Гатаўскі бор. А правее — рэдкае, прасвечанае сонцам — пацягнулася сеткай дажджу па драбналессі, дачах і хутарах.

На ўсходзе — дзве вясёлкі: ніжэй — ярчэйшая, вышэй — слабая. Калі пагусцеў дождж, ніжэйшая вясёлка, з хмарай, якую яна абдымае, наблізілася да нашай лодкі, а вышэйшая засталася на месцы, з канцамі, утопленымі ў возеры далёка, каля самых яго, паўднёвага і паўночнага, берагоў. Калі правае крыло хмары працягнулася, прайшло дажджом па драбналессі, дачах і хутарах, вясёлкі раскалоліся папалам,— левая палавіна іх паблякла і знікла, а правая, на фоне густой хмары, нібы надзейна ўбітая канцом у паўднёвы бераг, датлявае паволі...

Бліжэй да берагу хваля паменшала, нас перастала заліваць, і матор наш заварушыўся весялей. Пацяплела.

Каля дач нас выйшлі сустракаць.

Прапала ўся наша грозная паэзія,— мы засталіся проста няўдалымі, мокрымі рыбакамі, якіх — пад кепікі — адагравалі чаем.

Старэнькая лазня ў гонкім, густым бярэзніку, у якой звычайна цэлы тыдзень гаспадарацць чэрці, у суботу напалена прышлымі цеслямі, што рубяць хату на ўскраіне вёскі.

Запрасілі памыцца. Пасля страшэннай па́ры — сцюдзёная вада з крыніцы. Па пяць-шэсць вёдраў — з галавы да ног. Нават бярозкі сталі прыгажэйшыя, і ўсё на вокал пачысцела!..

Іду ўздоўж грады сасняку, па расе. Справа — сонца. Нядаўна ўзышло. Яно — праз дрэвы — мільгае па твары, і я адчуваю сябе пастушком, што ідзе каля плота. Дадому, паснедаць. Хоць тарахці па соснах кійком — як па штакецінах.

Хлебна-сасновая цішыня. Над цішынёй — ад возера — ляціць варона. Гудзе вялікая паляна грэчкі. У белай, духмянай кашы — высокая, самотная сасна і нізкі, каржакаваты дуб, здалёк — нібыта грушадзічка.

Здымаў гэта, стоячы на каленях у роснай, высокай грэчцы.

Рыга. Пагодлівы ранак. Над сажалкай — стары латыш, а на вадзе—лебедзі, нібы прыгажуні з ансамбля «Бярозка». А так яно, відаць, і нарадзілася народнае: «как лебедушка»?.. Стары крышыць рукамі і зубамі булку, кідае лебедзям, а вакол яго, маўчуна, скача, чырыкаючы, верабей,— як бы найбольш урваць.

Хораша! Хоць чалавек і не адказвае чамусьці на мае прывітанне ды загаворванне...

Дауней, у самым пачатку, глядзеў на сонечнае, бела-воблачнае неба знізу ўверх, і гэтак добра было, шчасліва!..

А цяпер вось успамінаю, што нядаўна быў на цэлых дзесяць кіламетраў угары, зверху глядзеў на аблокі і... што ж — нічога, як быццам нават менш цікава было, менш хвалявала...

Можа, таму, што тады, у пастушыным далёкім маленстве, усё і для мяне было — толькі наперадзе?..

Румяны ранак над возерам. Пад соснамі, у кустах ядлоўцу, выбегшы з вады, выціраецца маладзенькая, стройная, загарэлая студэнтачка. Ажно спыніўся я на сцежцы, каб не спалохаць...

Пасля, падвечар, убачыў яе — не такая прыгожая.

Канадскі бок Ніягары пакінуў бы вельмі няпоўнае, ледзь не проста курортнае ўражанне... Але, пакруціўшыся перад вадаспадамі па набярэжнай пехатой і ў аўтобусе, мы пераехалі мост, апынуліся ў ЗША, прайшлі, нечакана не вельмі складаныя, паліцэйскія фармальнасці і зноў паехалі да вадаспадаў.

Ужо само пераапрананне ў сінія піжамы і светла-жоўтыя непрамакальныя плашчы настроіла ўвесь наш турысцкі піпл[1] на малада-вясёлы лад. Спусціліся ліфтам на блізу дзве сотні футаў і апынуліся на драўляных кручаных лесвічках ледзь не пад самымі вадаспадамі.

Спачатку толькі глядзіш ды слухаеш — здалёк, а потым яно пачынаецца!..

Вырваўшыся з-пад вадаспаднага душа, дабраўшыся па коўзкіх, забраснелых сходках да ліфта, адтуль — да вопраткі і блакнота — пішу:

Іду, сагнуўшыся пад гэтай небывалай навальніцай, вяду перад сабой і за сабой па сто вясёлак, і ў гэтым шуме вечна маладое радасці хочацца спяваць, смяяцца, пісаць выдатныя вершы!.. Божа мой,— і падумаць адно, што так адбываецца тут безупынна, заўсёды!..

Пачатак жніўня.

Зранку цярушыць дождж. На пожні — росная, дробненькая канюшына. Ад мэндляў — жытні пах. Дацвітае бульба. У градах яна, пасаджаная раней, пачынае жаўцець, смачна пахне. Каноплі — таксама. Сытыя галасы варон і перапёлак.

Усю ноч гула за вёскай малатарня. Цяпер ад калгаснага свірна пайшла на станцыю машына з новым жытам, прыкрытая брызентавым палотнішчам. І фурманкі, на якіх, нібыта ўкормленыя парсюкі, мяхі пад свежаю саломай.

У гародзе сінія вуллі хаваюцца ў ягадніку і кветках — знізу, а ў зяляніне голля, цяжкага ад яблыкаў,— зверху.

Маладая, сопкая бульба. Густое, з пограба, кіслае малако. Маласольныя агурочкі. Процьма садавіны.

Апоўначы — ціхі месяц на ўсходзе.

Поўня.

Вецер будзе кудысьці гнаць аблокі, месяц — хавацца за соснамі, калі і мяне ўжо не будзе. І нехта іншы стане думаць-прадумаць, што так і суджана, мусіць, яму сумнявацца, горка тужыць і плакаць без

---

[1] Піпл — людзі (англ.); тут — у значэнні — усю нашу турысцкую кампанію.

слёз, і часта шукаць апоры, і горача любіць — жыццё, дабро, людзей, паэзію!..

Так думаецца ў полі за лясною вёсачкай, над Віллёй, дзе ў пятнаццатым годзе была передавая — кроў, туга і акопныя вошы... Акопы не зацерліся, хоць параслі сасоннікам.

Тут і пішу, стоячы на пясчанай дарозе, перад вячэрняй зарой, што яшчэ ўсё ніяк не патухне, пад гулам высока-высокага самалёта. Пішу ў паўцемры, наўздагад, каб не адкладаць і гэтых думак-пачуццяў, як многае, што я чамусьці ўсё адкладаю...

Да ўсходу сонца здавалася, што свет — гэты кавалачак зямлі, дзе стаіць наша вёска, наша поле і нашы могілкі — увесь накрыты шкляным матавым каўпаком. Потым сонца прабілася праз росную муць, заіграла на пазалочаных вершалінах клёнаў, ліп і бяроз, на гронках спелых рабін, прыгалубіла сумныя, ужо безгаловыя сланечнікі, ружовыя кветкі насеннага тытуню, жорсткія касачы кукурузы, апошнія кветкі ў гародчыках і капусту на градах...

У галубятніках пад капяжамі прачнуліся ды ўстрапянуліся галубяняты. З цікаўнасцю і боязю пачалі глядзець на двор, тоўхаючыся ўперад мілымі галоўкамі.

Увішна тэпаючы трохкутнымі лапкамі па густой, нізка пагрызенай траве, стракатыя, сытыя качкі подбегам паківаліся на выган, да рэчкі. За імі — гусі. Гэтыя не спяшаюцца. Пра штосьці дружна гамонячы, пайшлі памалу па абочынах ды па самой дарозе, разварушваючы асаджаны расою пыл.

Стары калека-кравец, што выгнаў іх са двара, стаіць ды ўсміхаецца сам сабе, відаць, разумеючы іхнюю гутарку.

На ўскраінах неба, ужо ніяк не могучы засланіць далягляд, стаяць занавескі празрыстай смугі.

Якая раніца для засевак!.. Так і хочацца стаць на калені — з сявенькай, каля меха зярнят — у пухкай, цёплай раллі, што добра падышла, як падыходзіць удала расчынены і замешаны хлеб!..

На ўзбоччах яраў, на ўзмежках палеткаў чырванеюць буйныя ягады шыпшыны, густа чарнее ажына, якую няма каму абіраць, падзіцячы міла вабяць вока ружовыя цацачкі — ягады брызгліны.

Палавіна верасня, а ў садзе яшчэ ўсё лена перасвістваюцца шпакі.

Яблыні выпростваюць замлелае пад яблыкамі голле, а яблыкі, на дзіва сёлета ўрадлівыя, ружовымі, духмянымі сонцамі кладуцца ў скрыні са свежай дранкі, на свежую жытнюю салому.

У раннім сонцы рабіна рдзіць цёмна-аранжавымі шышкамі церпкіх, аскомістых ягад. А ўвечары, калі на захадзе сонца сцяной устануць хмары,— палахліва шуміць магутны явар, паблісквaючы сівай падкладкай лісця.

Кастрычнік.

Пагодлівая раніца. Пахне марозікам. На ўсходзе — сінь, хмары фіялетавыя або шэрыя. І агнявая, распаленая чырвань сонца, якое ўзыходзіць.

Туманнае ранне на ўзлессі. Лес мяшаны. Гледзячы на жоўты вяршняк бярэзніку, здаецца, што гэта з-за туману ўзыходзіць сонца.

Сыры, халодны ранак. Рунь — хоць выціскай яе ад вільгаці. На ржышчы — прыхоплены марозікам асот, а на дарозе — адна пушыстая, апырсканая расой галоўка дзьмухаўца.

Ад вёскі, што засталася ў даліне, белае поле ўздымаецца на захад спакваля вышэй, вышэй — аж да самых Балканаў.

Такую гучную назву далі гэтым узгоркам. Відаць, у мінулым стагоддзі, калі нашы дзяды вярнуліся з-пад Плеўны...

Думаю пра гэта, ідучы па іскрыстым, хрусткім снежным цаліку.

Сям-там, вельмі ўжо рэдка, стаяць старыя, спрад веку цярплівыя дзікія грушы.

Кусты шыпшыны трапляюцца на схілах яраў ды на ўзлобках, ніколі не араных, падобных на агромністыя боханы, У калючым сярэбраным голлі яшчэ ўсё трымаюцца, таксама заінелыя, аранжавыя зморшчаныя ягады.

Як светлы сон, успамінаецца тут, каля іх, матылінаая ружовасць пялёсткаў, пчаліны звон і ласкавае сонца... Успамінаюцца і радкі:

О Беларусь, мая шыпшына!..

Ваўчыны след. Шэры пайшоў над абрывам і, выбраўшы месца, спусціўся ў яр, грузнучы на глыбейшым незаскарынелым снезе.

На дне яра зеленавата-сінімі плямамі пракідаецца зусім свежы, яшчэ не пераможаны снегам лядок неўтаймаванай крыніцы.

Высока на поўдні — пакуль што няспелы, бледны акраец месяца. Спачатку, пакуль ідзеш, толькі як быццам адчуваеш яго прысутнасць над сабой, а потым так і не вытрываеш — азірнешся ўгару. З нейкай дзіцячай прыемнасцю.

На гары за вёскай, любуючыся родным, даўно знаёмым і ўсё яшчэ новым светам — белым, чысценькім у вячэрнім святле,—

міжволі, жыва і радасна ўявіў сябе мурашачкай на неабдымна агромністым гарбузе Зямлі... Успомніў, як бачыў яе пад крылом высокага самалёта. Уявіў, як бачылі яе, у ціхім ззянні, нашы касманаўты...

Цяпер у вёсцы ноч. Выйшаў на двор і зноў падумаў, што прыеду, буду тут добра, многа працаваць. Каб святло маіх акон так вось лажылася на новы снег...

мясцовы рыбак, што сядзіць на вёслах, ажно адкінуўся назад, - смяецца хіцім, справядлівым смехам...

Вялікая, брукаваная плошча ў мястэчку. Позняя раніца. Спёка. Рэпрадуктар грыміць са слупа — перадае бясконцы нарыс пра жніво. А слухаць няма каму. Калгаснікі ў полі. Малыя — хто на пашы, хто каля возера. Толькі тры курыцы ходзяць па плошчы ды каля ганка зачыненага сельмага, дзе некалькі разоў на дзень спыняецца аўтобус, проста на санцапёку сядзіць дзядок. Доўга сядзіць, бо спяшацца няма куды...

Потым сюды падыходзіць другі. Таксама з вёскі, ехаць кудысьці сабраўся. Сівы, прыгорблены, з кульбай.

— Здаецца, Тодар Яцына? Здароў, калі так!

Той, што сядзіць, прыглядзеўся.

— Ты, Стасевіч? А бо-о-о!.. Сядай, браток, ды хоць, як людзі, пагаворым...

Старыя вітаюцца за руку, садзяцца побач і пачынаюць высняць, колькі ж гэта гадоў яны не бачыліся. Нешта так будзе — ці ўсе пятнаццаць, ці толькі чатырнаццаць...

Яшчэ і да палавіны гэтай тэмы не дабраліся, калі на плошчу, нібы нечакана, выкаціў і спыніўся гарачы, запылены аўтобус.

— Паставы? Гэта мой!.. А ты, браток, куды?

— Я ў Вільню. Мой гадзіны праз дзве, а то і больш...

— Ну, дык бывай, Яцына! Дасць бог — сустрэнемся, пагаворым.

Гул матора — уцёк. Пыл слакваля аблёг. На плошчы зноў цішыня.

Толькі нарыс па радыё... Ён таксама, здаецца, разлічаны на стагоддзе.

Пажылы, з залатымі зубамі дзядзька ідзе падвечар па вуліцы і з кожным весела загаворвае, крычучы на ўсю вёску.

Сядзіць на лаўцы настаўнік.

— На сонейка выйшлі? Добры вам вечар!..

Едзе з поля калгаснік, з ім пад'язджае раённы ўпаўнаважаны.

— А што ж гэта ён вас, таварышок, ды так неганарова пасадзіў? Хоць бы дзяружку я кую... А-я-яй!..

Пасе баба козы.

— Здарова, Агата! Каровы пасеш? Нічога, вырастуць козы — каровы будуць...

І так — ад хаты да хаты.

У праўленні калгаса, дзе вырашаюцца жыццёва важныя справы, дзе сядзяць у шапках, плююць на падлогу, густа лаюцца самым непрыкрашаным матам — жыве белы коцік.

Маўклівы дзядзька, рахункавод, штодзень, з гаспадарскай акуратнасцю, корміць коціка малаком, якое прыносіць з дому і ставіць у шафе з паперамі.

Коцік садзіцца да яго на стол і час ад часу падсоўвае лапкай костачкі лічыльнікаў, думаючы, што гаспадар яго, калі лічыць — таксама гуляе.

У сорак пятым годзе дзядзька прывалок з Нямеччыны трафей — насценны гадзіннік.

У шэсцьдзесят трэцім даў яго ў пасаг меншай дачцэ.

Калі назаўтра пасля вяселля ў дом маладога прыехалі бацькі, гадзіннік гэты быў урачыста павешаны на сцяне.

А збоку, на яго светлай дошцы,— запісы хімічным насліненым алоўкам: калі, у які дзень, за ўсе пасляваенныя гады, пабегала карова.

Увішна працавітага і даволі-такі гарластага бедняка, георгіеўскага кавалера з мікалаеўскай вайны, вёска выбрала старшынёй толькі што арганізаванага калгаса. Неўзабаве свайго старшыню мужчыны празвалі Палітаддзелам.

— Абы што якое, дык сам не хоча рашаць, а на каня, мяшок пад сябе і ў эмтээс,— хай думае палітаддзел...

Праз лета Палітаддзела знялі.

— За што ж вас, дзядзька Сцяпан? — пытаюся.

— Даў людзям сена накасіць. Пабілі на дзялкі і накасілі.

— Ну, а навошта ж так?

— На прымер падняція духа.

Жніво. Будні дзень. У ціхай, сонечнай вёсцы над возерам спыніўся старэнькі «Масквіч». Тры дачныя мужы, што прыехалі з горада, яшчэ як быццам не нацешыліся сваёй кампаніяй — закурваюць, стоячы каля машыны.

Раптам — з-за ўзгорка пачуўся незвычайны шолам, бабскі гвалт. Ужо хацелі кінуцца туды — як на пажар, ды тут з акна хаты, насупраць якое яны стаялі, пачуўся прыглушаны голас:

— Уцякайце, таварышы! Хавайцеся! Будзе бяда!..

Пакуль яны не верылі, з-за ўзгорка паказалася чарада баб і дзевак. Крык, стук качалкаю па вядры, абрыўкі песень, рогат, віск!..

Стары, што папярэджваў дачнікаў, знік у акне.

Убачыўшы машыну, жанчыны загалёкалі і рынуліся да яе.

Дачныя мужы паспелі ўскочыць у свой «Масквіч» і зачыніцца...

І пачалося! Жанкі абляпілі машыну з усіх бакоў, сталі выманьваць пасажыраў выйсці.

— Тэмпературу пагляджу! — крычала адна, трымаючы, як стэтаскоп, чарку на доўгай ножцы.

— Дабром просім — выходзь! — крычала другая, з намалёванымі вугалем вусамі.

— Бабкі, ану — перакінем!— прыйшла нарэшце шчаслівая думка.

І бабкі сталі пераварочваць «Масквіч».

Магло б, вядома, і такое здарыцца: але ж яны ўляпіліся з усіх бакоў, галёкалі на ўвесь свет, а машына толькі прыпаднімалася, як жук, што лянуецца ўзлятаць...

І бабкі спакваля ашляхлі. Яшчэ пастукалі кулакамі па шыбах, па кузаве — каб ты лопнуў! — «доктарка» зноў пагразіла ў акно:

— Ну, гады, ваша шчасце!

І вось чарада, зноў з ваяўнічым крыкам падалася па вуліцы далей.

Зноў адчынілася акно, і дзед, што палярэджваў дачнікаў, растлумачыў:

— Сёння, таварышы, чацвер. Дык гэта бабы каравай сабраліся пячы. Стася ў нядзелю замуж ідзе. Выпілі трохі, халера, бушуюць. Сёння яны могуць мужчынам рабіць, што хочуць. І порткі з вас, выбачайце, сцягнулі б, і крапівы туды напхалі б, і пяску насыпалі б!.. Абычай! Банда! Мужчыны, усе — хто куды!..

У гарадскім тэатры — вечар па запрашальных білетах. У першым радзе сядзіць вясковая бабуля, у валенках без галёшаў, у хустачцы «пад бараду». Сядзіць — не паварушыцца, не азірнецца,— хаця ж каб сыну сораму не нарабіць, ці што?.. Сядзіць і ў час дзеяння, і ў антракце, калі вялікапышны сын выходзіць з жонкай у фае.

Ды вось на трэцім перапынку бабка раптам чхнула, як мыш, і — божа мой! — спалохана азірнулася.

У лодцы на возеры трое. Спінінгіст-тэарэтык дакучліва павучае госця, як трэба лавіць. Тэорыю падмацоўвае прыкладамі. Найболыш, як водзіцца, з уласнай практыкі.

— Навешаў я раз добры такі кукан шчупачкоў і прычапіў за кармой. Дык што ты думаеш? Усе паўцякалі праз горла найбольшага...

Госць у тон яму дадае:

— А найбольшы, раней чым таксама ўцячы, крыкнуў: «Хадзяін, вазьміце вяровачку!» І тады ўжо нырнуў.

Бяззубы мясцовы рыбак, што сядзіць на вёслах, ажно адкінуўся назад,— смяецца ціхім, справядлівым рогатам.

Адзін сынок, дый той у горадзе. Летам старому бацьку яшчэ сяк-так — на сонцы пасядзіць, карову папасе. А зімой занясло двор снегам — роўна са студняй. Рэдка хто зойдзе, сядзіш адзін, як воўк.

У кухні, дзе цяплей, на стале мармыча рэпрадуктар. Дзед ляжыць на печы і слухае. Перадаюць нейкую казачку для дзяцей. Разышліся ў тым радыё раптам сабакі брахаць, гусі гегаць, куры кудахкаць... Дзед ведае — гэта артысты. Рагоча да слёз:

— А каб на вас нечага, каб на вас!..

І ўсё цяплей на душы.

Рыбакі вярнуліся з начнога лову. Стомленыя, няголеныя, вялыя, яны чакаюць каля рыбгасаўскага магазіна; хутка павінны прывезці хлеб. Возьмуць і пойдуць дахаты, у недалёкую вёску.

У магазіне дачніцы купляюць капчоную сяляву. Спынілася праезджая легкавая машына. Яшчэ адна дама ўзяла. Пакаштавала:

— Ах, любата!.. Дайце яшчэ кілаграм.

І ўсміхнулася да рыбакоў, якія бліжэй за парогам:

— Гэта я мужу, ён у нас мяса не есць.

Малады, загарэлы рыбак, прыгажун,— нібы знаёмы з дамачкай, нібы нават бачыў таго яе мужа:

— А чаго ж ён у вас так і тоўсты?

— Ну што вы, таварыш, ён хворы.

— Цукровая хвароба,— спачувальна ўздыхае хлапчына.

Харошы і здаровы, грубаваты рогат.

Заслужаны чалавек прыехаў у родную вёску.

Спраўная, хітраватая маладзічка, пляменніца, просіць у яго за малодшага брата. Сяк-так закончыў вячэрнюю школу, валочыцца толькі.

— Каб гэта яго, дзядзька Валодзя, у фельчарскую хоць?..

Вядома, дзядзька — абы захацеў — прапіхне.

Ды ён вось абедае і расказвае Ганначцы прытчу:

— Сабраліся раз яўрэі, мужчыны, і вырашылі добра выпіць на свае кучкі. Каб танней абышлося, надумаліся прыкаціць у сінагогу бочку і кожны раз, прыходзячы маліцца, прыносіць кожны па шклянцы віна. Вось і падумаў адзін бедны Янкель: «А што там вельмі пазначыцца, калі я ўлію адну-другую шкляначку вады?» І стаў

прыносіць ваду. Прыйшлі тым часам кучкі, адкрылі хлопцы бочку, а там — адна вада!.. Ты мяне зразумела?

Відаць, зразумела. Маўчыць.

У перапоўненым вясковым клубе — таварыскі суд. Злавілі самагоншчыка.

Худы, насаты дзядзька, па мянушцы Албанец, сядзіць збоку, у якасці падсуднага. Старшыня суда — п'яніца-брыгадзір; члены суда — сябры падсуднага па чарцы — участковы і бухгалтар.

— Адказчык, вы давяраеце складу суда?

Ківок галавой і невыразнае:

— Угу.

У зале — выбух рогату.

Пасля бухгалтер просіць:

— Таварыш старшыня суда, можна задаць адказчыку пытанне?

— Можна,— з не меншай важнасцю адказвае брыгадзір.

— Адказчык Піліповіч,— урачыста звяртаецца бухгалтер да Албанца,— скажыце суду, дзе вы ўзялі апарат?

У зале — зноў выбух рогату. Хто чуў, а хто і сам бачыў, як пазаўчора адказчык з членам суда, гэтым самым бухгалтарам, адвозілі на хутар усю самагонную тэхніку.

Прыгавор: Піліповічу— найвышэйшая мера — дзесяць рублёў штрафу.

Абедалі ў Албанца.

Суд — па форме.

Скупому, калі ён быў яшчэ пастушком, дакучалі на пашы: «Дай дзічкі ўкусіць!..» І не даваў. А кавалерам быўшы, выйдзе з дому на вуліцу з кветкай. Вахлак, а вяргіню трымае, Аднойчы суседняя дзеўка, каб трохі разварушыць яго, схапіла гэтую кветку, дык ён ажно кінуўся біцца: «Аддай!..»

Спакойны, целюкаваты дзядзька, які вярнуўся з вайны паранены ды з ордэнам і медалямі, расказвае ў гасцях:

— Перакусіў я ў Міры, еду дахаты лежачы. І здаецца, што гэта Масква, а я з бальніцы выпісаны, іду сабе па вуліцы, прадукты на дарогу палучаць...

Вуліца доўгая, доўгая, доўгая!.. А потым конюх штурхае: «Уставай, завала п'яная, а то з возам у адрыну закачу!..»

Бабка з кошыкам. Кошык абвязаны.

Малады зладзяйчук пільнаваў яе на вакзале, сесці ёй памог, а толькі цягнік крануўся — выхапіў кошык і пабег.

Паўза.

Потым з акна паказалася бабка:

— Еж, еж на здароўе, сынок!

У кошыку быў хрэн. Не цёрты, карэньчыкі.

Таўкачаваты дзяцюк з багатай хаты. Гадоў пад сорак, а яшчэ ўсё кавалер. Многа сватаўся, скрозь адмаўлялі. Нарэшце адна згадзілася, але... адмовіўся ён сам.

— Чаму?

— Дурная. Бо за мяне адразу йдзе.

Калгасны брыгадзір расказвае, пасварыўшыся з гультаём, што вельмі доўга запрагаў:

— Быў такі парабак у папа, што сам ніколі не ўставаў, а поп яго будзіў. А неяк сам устаў. «А мой жа ты Зміцерка!» — узрадаваўся поп. А той: «Нічога, бацюшка, я сваё нацягну абуванейкам!..»

Стары вясковы байдун, што любіць кнігі, расказвае:

— Ішлі раз Пушкін, Лермантаў і яшчэ адзін, каб паглядзець, каб было пра што пісаць. А насустрач ім едзе цар Петр (не Пётр, а Петр) і Сталыпін. Сталыпін кажа: «Давай спытаемся, чаму таўстадумы пехатой ідуць».— «Лепш ты іх не чапай»,— кажа Петр. А Сталыпін не вытрываў і спытаўся. Дык Пушкін кажа яму: «Бо цар усіх аслоў саноўнікамі парабіў, няма на кім ездзіць». А Петр Сталыпіну: «А што, маць тваю, не казаў — не чапай!..»

— Нажыў я, браце, напільнік!..— кажа пра сваю бабу дзядзька. Худы, падчапісты, шапялявы.

— Чаму ж напільнік, а не рашпіль? — пытаецца другі, чырванашчокі рагатун.

— Зуб у яе мяльчэйшы, усё бярэ.

Вясковыя начлежнікі ў гарадскога земляка, што частуе іх вельмі ж, падла, па-панску:

— Добра з дарогі чаю папіць...

Гэта — адзін. А другі, не менш сур'ёзна:

— Дзіва што! Чай — гэта ж самая лепшая пішч!..

П'яны нарачанскі рыбак расказвае пра зяця-крамніка, што ён— баязлівец. Ішоў па лесе з грашыма, запынілі «нейкія смаркачы», напалохалі — аддаў, а сам цяпер захварэў на сухоты.

— Які ж ты пасля гэтага беларус? — абураецца цесць перад выпадковымі слухачамі.— Даруйце маю няскромнасць і дурату, але, як быўшы ў разведцы мікалаеўскай арміі, я лічу, што мясцовы наш беларус павінен быць такі. З куста гаворыць: «Я воўк, я цябе з'ем».

А ён павінен адказаць: «Калі ты воўк, дык я леў, і я не баюся цябе!..» А то што!..

Студэнты праходзяць у клініцы практыку. Хворым не вельмі падабаецца быць аб'ектамі назіранняў. Раз, другі, і нарэшце старому абрыдзела. Разбурчаўся перад урачом:

— Глядзець — няхай сабе глядзяць, а свае гіяграфіі больш расказваць не буду!..

На сямейным застоллі малады гасладар, вясёлы калгасны шафёр, расказвае гасцям пра свае пчолы:

— Паабсякаюць яны трутням крылы — ляжаць тыя ўхаджоры, як збанкі. А раней як ж а іх хораша запрашалі туды!.. От дзе, браточкі, наша мужчынская доля!..

Стары рыбак, пад чаркай, раіць маладому дачніку:

— Калі, не дай бог, што здарыцца, дык не бяры ты, браток, удавы. Ведае яна, зараза, усе ходы і выхады!.. Бяры лепш зноў маладую.

Старшыні калгасаў у раённай цырульні. Адзін сядзіць ужо намылены, другі чакае чаргі.

Намылены:

— Федзьку Капусніка мы вывучылі на баяніста.

З чаргі:

— Ну і колькі ж ён вам дае на сто гектараў ворыва?

Дама-ўрач, прыкметна закаханая сама ў сябе, вальсуе ў доме адпачынку, лёгка і важна носячы вакол кавалера свой здаровы, выдатна вядомы ёй арганізм.

Хлопец танцуе не толькі культурна, але і скульптурна,— без усякага выразу твару, з аднастайна і нудна правільнымі рухамі. Так будуць весяліцца робаты?

Стары яўрэй, кравец у майстэрні, заваленай маладымі порткамі, якія хочуць стаць вузейшымі і — як мага хутчэй.

— Вы ведаеце, што такое мода? Вазьміце бочку і кладзіце туды порткі — год, два, тры... А потым, калі яна ўжо будзе поўная, перавярніце бочку і даставайце порткі — год, два, тры...

У Доме творчасці. Маладая сястра-гаспадыня сустрэла пажылога пісьменніка, што вярнуўся з праходкі па лесе:

— А да вас, Іван Анатольевіч, прыязджалі нейкія маладыя людзі. Машына нумар ЖТ 89-62.

— А хто яны, вы не спыталіся? Не? Ах, Зіна, Зіна, як тут у вас не пазнаць, што муж — шафёр?..

Калі знялі рэдактара газеты, сакратар — таварыш рухавы ды з паслухмянай усмешачкай — тры дні хадзіў на працу ў новым гарнітуры, повен затоенай, хвалюючай надзеі...

Пасля надзеў старэйшы гарнітур і... радасна сустрэў новае начальства.

На скверы, каля газетнай вітрыны, вясковы дзяцюк чытае, стоячы, нейкі артыкул і ціха — каб лягчэй чыталася — рыпае на гармоніку вальс.

Загадчык базы, пакуль папаўся на недастачы, закладваўся з жонкай, хто з іх з'есць больш шакаладных цукерак.

Гаворка пра гэта ідзе на судзе.

Мешчанін, які «ўмее жыць». Поўны буфет бутэлек і закусак. Частуе з паўзамі:

— Можа яшчэ адкрыем гэтую кансерву?..

Еж, значыцца, і адчувай: усё гэта — грошы.

Пасля вайны ў адным з райцэнтраў і гасцініца, і чайная — усё было напісана на шыльдах у двукоссі.

Гаваркая, прыемная гаспадынька, палячы ранёнька ў печы, расказвае праезджаму начлежніку:

— Пляменніца мая, Анюта, сястрына дачка, у вайну была ў Германіі. Вывезлі іх, усю сям'ю... Потым амерыканцы іх аслабанілі. І Анюта ледзь не выйшла, кажа, за аднаго француза. Таксама вывезены быў, толькі што з Францыі... Цяпер ужо Анюта замужам. І

чалавек, здаецца, нішто сабе, і дзеткі харошыя. А яна ўсё шкадуе, што за таго свайго Жана не выйшла. Ніхто, кажа, не ўмее так хораша ўхаджваць, як французы... Можа быць.

Кавалер з другое вёскі, каб паказаць сябе, насыпаў у кішэню портак дробязі. Скача польку са звонам.

А падшыванцы бегаюць, хіхікаюць, крычаць;

— Дзядзька, дай цвік!

— У Мікалаеўшчыне, браце, і бабы баявыя,— успамінае дзядзька.— Неяк там нашы мужчыны ішлі ды прылеглі над Нёманам адпачыць. іхнія бабы раку з таго боку ўброд пераходзілі. Пападнімаліся, вядома. А наш Сёмка Самусік — аж вылупіўся, так глядзіць. І сораму няма, нібы блазнюк. Адна, што першая ішла, выйшла на бераг — ледзь не да самага пупа паднятая.

— Ну што,— пытаецца ў Самусіка,— як, хараша?

— Ого,— кажа ён,— яшчэ як хараша!

А тая павярнулася кругом:

— Дык на яшчэ і барыша!..

Шафёры сумуюць на ганку райвыканкома. Гарачыня. Начальства пакуль што нікуды не едзе — нарада. Лена перабрэхваюцца, мала рагочуць.

Вось грукоча брукам на матацыкле нейкі хлопец або, можа, і дзед... Не пазнаць — даўно не голены, ледзь не да самых вачэй абвязаны хусткай. Ленае слова самага весялуна:

— Гэты ўжо, хлопцы, лішняга слова не скажа.

І вялыя ўсмешкі.

Вясёлы дзядзька, калгаснік:

— Калісьці маці мая ішла замуж, дык не магла дастаць панчох пад вянец. Паперы накруціла беленькай у хадакі... Спадніца доўгая — яно і не відаць, як там вышэй. А цяпер у аднаго мяне тры дзеўкі модныя. Дальбог, братко, мяхі старым капронам завязваю!..

— Яшчэ пасля вайны, як толькі калгасы арганізоўвалі, быў у нас конік Аршын. Збракавалі яго потым і прадалі на беражэнскія хутары. Аднаасобніку. Дык ён назад уцякаў, у калгас. Дзядзька, што купіў,— верхам на суседскага каня і наўздагон. Пёр, пёр наш Аршын, а потым, хлопчыкі,— брык! — і інфаркт! Са страху, што трэба вяртацца на хутар. Саз-на-цяль-ны!..

Пра прымака, які ўзяў у хаце ўладу:

— Учора купалі яго. Жонка шаруе плечы, цешча грэе каля грубы споднікі, а цётка стаіць каля дзвярэй, каб дзеці холаду не напусцілі...

Мужчыны-калгаснікі на вячорках.

— Лось, казалі, ішоў цераз поле. Падвечар. З-за Грыбавага хутара і проста загуменнем...

— Які табе лось! Гэта ж Аўдоля барану калгасную ўкрала ды тарабаніла на сабе!..

Назаўтра пасля вяселля ў свёкра пытаюцца:

— Ну, як нявестка?

— Дай бог усім добрым, ого!..

Усе рагочуць.

Сталічны тэатр на гастролях у глыбінным калгасе.

У час спектакля нейкі дзядзька ўсё ўставаў,— устане, пастаіць, зноў сядзе, пачакаўшы, зноў устаў...

Усхваляваны рэжысёр спектакля падышоў на пальчыках і шэптам спытаўся:

— Што, дзядзька, падабаецца?

— Не, проста задніца забалела.

Грандыёзная дама, што пабывала ў адказнай замежнай камандзіроўцы, дакладвае з трыбуны пра сваё падарожжа. На выдатным узроўні спеласці:

— Пасля, таварышы, мы паехалі глядзець Елісейскія палі. Факт застаецца фактам — яны даволі прыгожыя... А вось амерыканскія цукеркі і торты—зусім, таварышы, не смачныя, і гэта — факт...

Муж у хоры, а жонка ў танцавальнай трупе ансамбля. Сёння зноў пасварыліся, ды так, што яна аж не спала, прыйшла заплаканая, як ніколі дагэтуль. А тут адказны канцэрт!..

Хормайстар і балетмайстар разбіраюць справу. Асабліва абураецца другі:

— Праз гадзіну ёй выступаць. Што — яна зможа мне сёння забяспечыць належную усмешку?!.

Два работнікі Акадэміі навук, суседзі па дачах, сварацца за градкі. Сварка ідзе на высокім інтэлектуальным узроўні. Па дапаможніках.

— У вас, магчыма, ёсць нават Даль?

— А што ж вы думалі — няма?

— Ну, дык ідзіце паглядзіце там на літару «г». Адно слова. Яно вас датычыць!.. Яно адпавядае вашай гнюснай сутнасці!..

У пуставатым вакзальным рэстаране джазгае аркестр. Барадаты, абшарпаны аматар класікі не вытрываў, крычыць з-за століка:

— Не наганяй на душу таямнічы змрок — іграй Чайкоўскага!

Таварыш, якога ўжо трыццаць год кідаюць то на дзёгаць, то на оперу, усюды разбіраецца аднолькава. Але ж усюды кіруе. Цяпер, кіруючы выхаваннем будучых жывапісцаў ды графікаў, прыехаў праверыць, як паводзяць сябе студэнты-мастакі на летняй практыцы.

— Чаго сядзіце тут, а не рысуеце?

— Натуршчыкаў чакаем, Аляксей Міхайлавіч.

Суровы, важны позірк з-пад капронавага капелюша:

— Ну дык пакуль што рысуйце фон!..

Вусаты, салідны дзядзька, калгаснік, хваліцца прыезджаму інжынеру:

— Мой пляменнік таксама ў Мінску вялікі чалавек: іграе ў оперным тэатры на трубе нумар адзін.

Рэдактар забракаваў фальклорны зборнік з-за прадмовы, дзе гаварылася, што і да Кастрычніцкай рэвалюцыі нашы фальклярысты мелі пэўныя поспехі.

— Як гэта так! — абурыўся «падкаваны» таварыш.

Калі ж яму падсунулі, як прыклад, Шэйна і Карскага, гэта яму «нічога не сказала». Свае рашэнне ён абгрунтаваў:

— Талстой, Леў Мікалаевіч,— вялікі пісьменнік? Бясспрэчна, вялікі. Але ж мы гэтага не падкрэсліваем.

Артыстка і на пляжы іграе — выконвае ролю прыгожа, пяшчотна адпачываючай. Пачне ў ваду заходзіць — проста танец німфы па каменьчыках!..

Атрымаўшы званне заслужанай, яна пакінула свайго старога мужа, рэжысёра.

Матылёк выпырхнуў, а кокан недзе застаўся.

Стары прадавец у кніжна-газетным кіёску ніяк не можа знайсці фота кіназоркі, якое просяць дзве школьніцы. Пачынае іх далікатненька адгаворваць:

— Яна, вы знаеце, такая шчупленькая... Нічога асаблівага!..

У трылогіі Сянкевіча крымскі хан, слухаючы паслоў, жаваў бананы.

Потым вялікі меў ласку загаварыць. Ён выплюнуў недажаванае на далонь, падаў яго бліжэйшаму візіру.

Той з паклонам прыняў, стаў з глыбокай пашанай дажоўваць...

Пры кульце гэта напаміналамне некаторых «філосафаў».

— Начальніка гэтага трэба яшчэ ўмець пачаставаць. Ён табе правай курынай лапкі есці не будзе!..

— Чаму?

— Бо курыца ж сядзіць заўсёды на правай лалцы. Дык левая — мякчэйшая.

На экзаменах у вясковай дзесяцігодцы.

Здаровы хлопец, басам:

— Старая Ізергіль была ў маладосці маладой цыганкай і нічога не рабіла, толькі кахала. Цікава паставіць пытанне і разглядзець, каго яна кахала. Аднаго папа кахала, але ён быў вельмі тлусты...

Другі — жвавы, бойкі хлапчына:

— Чычыкаў, гэта быў такі чалавек... такі памешчык, што ездзіў па Расіі са шкатулкай і займаўся шпікуляцыяй.

У Маскве, на Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы, з павільёна ў павільён хадзіў пенсіянер і ўсюды пакідаў у кнізе водгукаў запісы вершам. Накшталт гэтага:

Электротрактор — не кобыла,
Сильней кобылы в сотни раз.
Наш курс направлен к изобилью,
Исполним родины приказ!..

Далей быў подпіс, прафесія, дакладны адрас, дата.

Радыёканцэрт па заяўках. Дыктар вяшчае службова-расчулена:

— Іван і Марыя Акулёнкі з горада Гродна просяць перадаць іх музычнае прывітанне маці-калгасніцы, у сувязі з яе сямідзесяцігоддзем. Слухайце, паважаная Сцепаніда Васільеўна, гэтае прывітанне.

Паўза і — бас Міхайлава:

Мой горький час!..
Мой страшный час!..
Мой смертный час!..

Былы старшыня сельсавета:

— Пасля вайны гэта штосьці было... Ну але, я толькі другі год як дэмабілізаваўся. З пазыкай бяда — не дацягнуў ажно пятнаццаць тысяч!.. Сяджу, бядую, а тут прыходзіць Сівы... Тып у нас адзін такі ёсць. Я — чалавек нетутэйшы, людзей яшчэ добра не ведаў, «Хачу,— кажа ён,— падпісацца, таварышы, на заём. Дваццаць тысяч». Я ажно вочы вылупіў. І рад, вядома!.. Падпісаў я яго, унёс ён дваццаць пяць рублёў, а рэшту, кажа, у панядзелак. З перавыкананнем вас, думаю, Ілья Іванавіч!.. А потым паехаў я да таго дзядзькі: «Гані, браток, астальныя дзевятнаццаць тысяч дзевяцьсот семдзесят пяць рублёў». Ляжыць, падла, на печы, рагоча: «Вам мала, што я вас выручыў з бяды? Яшчэ і грошы вам давай?..»

Баба-гром, «старшыніха» калгаса, тры месяцы пабыла дэпутаткай.

Пасля пасяджэння да яе падышоў малады карэспандэнт і ветліва папрасіў пяць мінут.

— Не, не магу вас сягоння прыняць. Я очынь фстала.

Дзядзька-малакавоз, у якога на пункце не прынялі пракіслага малака, прыйшоў у райком, да першага сакратара.

— Скажыце мне, калі ласка, якім малаком мы будзем план даганяць — толькі салодкім ці і кіслым таксама?

Сакратар быў у вясёлым настроі.

— А гэта як хто любіць. І прастакваша таксама добра.

— Ну, дык пазваніце вы, таварыш сакратар, тым абармотам, каб прынялі маю прастаквашу.

Сын вярнуўся дахаты ў пяць гадзін раніцы, «пад мухай».

— Разбудзі мяне, мама, заутра як найраней.

— Калі заутра, сынок,— заўтра заўтра ці сёння заўтра?..

Унук:

— А я, дзеду, болей з'ем за цябе!..

Дзед:

— Я ўжо, браце, за век наеўся.

Беларускія турысты ў парыжскім аўтобусе. Як звычайна бывае далёка ад дому, у адпачынку: «Таварышы, давайце будзем пасля прыезду дружыць, сустракацца!..» Згода і захапленне. Старшы трупы і тут адчувае сябе адказным таварышам.

— Арганізацыю гэтай справы бяру на сябе. Мне гэта проста: вазьму ў БРК прафсаюзаў вашы адрасы, даручу свайму сакратару абзваніць усіх, і збяромся.

Малады, вясёлы скептык:

— Міхаіл Сямёнавіч! І я на гэты час найму сакратара. Каб ён дагаварыўся з вашым.

Вясёлы хлапчына, калгасны шафёр, расказвае мне за рулём грузавіка:

— Учора ў нас, на камсамольскім сходзе, сам выступаў, старшыня. Хлопцы нашы, дзяўчаты— хто ў вячэрняй, як я, хто на завочным, хто сама меней сем-восем класаў мае. А ён... Мы загадчыка клуба мянялі, бо засядзеўся, лайдак, зазнаўся, работы — ніякай. Дык сам наш узлез на трыбуну: «І праўда, мяняць цябе трэба, Крэнь. За цябе ўжо, як за старую карову — толькі дзвесце даюць, а маладая, нябось, чатырыста! Гы-гы-гы!..» Вярзе ды гыгае, а нашы некаторыя — за ім, смяюцца, нават апладзіруюць. Аж брыдка!..

Упаўнаважаны:

— Крычым, крычым за план, а ўвечары сяду вячэраць і... масла есці не магу. Здаецца, усё яно нашым матам насычана.

Ціхі, стары чалавек, пакуль хлапчукі латошаць ягоныя грушы:

— Ірвіце, ірвіце! Паглядзім, што вы будзеце рваць, калі яны паспеюць!..

Толькі ж гадоў са два гаму назад гэта бы цуд наша й тэхнікі — ТУ-104. А цяпер ужо бабка,— сам бачыў у Хабараўску,— стаіць у чарзе на пасадку і маракуе:

— Білеты ўзялі на сто чатырнаццаць, столькі чакалі, а вось ляцець даводзіцца на гэтай дрэні...

Малады, сімпатычны в'етнамец, студэнт нашага інстытута, заходзіць у цырульню і, павітаўшыся шырока-ўсмешлівым «дра-туйце», звяртаецца да адзінага ў чакальні кліента:

— Каму канец? Вам? Ха-га-сё. Я за вам.

У вагоне прыгараднага цягніка фабзаец частуе аднавяскоўца лімонам. Абабралі яго, як апельсін, і смокчуць, жуюць.

— Не магу, брат,— кажа нарэшце аднавясковец.— Кіслоцце нейкае, аж сцепае...

— Трэба прывыкнуць,— сур'ёзна, з пачуццём перавагі кажа юнец, гараджанін з гадавым стажам.

На вясковых вячорках:

— Будзем, хлопцы, спяваць. Скінь толькі, Сцёпка, гумовыя боты, а то рэзанансу не будзе.

— Яна «пяцёрку» за дыктант прынесла. А ты? — крычыць маці.

Бацька, як больш памяркоўны;

— Далі б ёй, дык і яна прынесла б. Чаго ты крычыш?..

У міжгароднім аўтобусе — элегантная дамачка з мужам-афіцэрам. Наша, мясцовая моладзь. Ды ўжо толькі па саломінцы на яе паліто можна і здагадацца, што на аўтобусны прыпынак бацька са свёкрам прывезлі іх у развалах.

У маскоўскім кафэ.

Загарэлы, стомлены палкоўнік глядзіць на тоўсты карак і азадак маладога афіцыянта і, уздыхнуўшы, з прыціскам кажа:

— Эх, паганяць бы хоць тыдзень!.. Яны тут — усе сардэчнікі. А пражыве такі трыста гадоў, як крумкач!..

Даўно было.

Карчма над Нёманам, на ўскраіне маленькага заходнебеларускага мястэчка.

Стары Абрам-Эля прыехаў са станцыі, прывёз сякі-такі тавар. Нашылася суседскай дзетвары. Просяць, каб расказаў, як ён бачыў цягнік. Расказвае, з добрай усмешкай у барадзе:

— Машынке хап а пружынке, пружынке хап а машынке, машынке хап а паравоз, паравоз хап а калёс, калёс хап а вагон, вагон хап а пасажыр, пасажыр хап а чамадан, чамадан хап а вешч... Кандуктар — а грэйсэ пуза, а клайнэ дудочке — фю-ю-ю! І ўшо!..

Чалавек гэта быў настолькі... культурны і чысты маральна, што саромеўся адчуваць сябе дзедам — з-за непрыстойных паводзін сваіх дзяцей.

— У самалёце, абапал століка, сядзеў я са здаравенным, нахабным кандыдатам навук. Увесь час ён таптаў мае ідэальна начышчаныя туфлі і не прасіў прабачэння. Так і хацелася спытаць: «Скажыце, у вас дзве нагі ці чатыры?»

Можаш напісаць эпалею, зрабіць незвычайную хірургічную аперацыю, выдумаць звышвадародны цуд — усё адно не будзеш такі здаволены сабой, як дама-мяшчанка, калі яна едзе ў тэатр ці на рынак ва ўласнай машыне.

У вагоне, убачыўшы першую горную рэчку, дзяўчынка ўскрыкнула:

— Ах, мама, Церак!..

Дзябёлая мама ў раскошнай піжаме, паблажліва:

— Гэта не Церак. Церак я ведаю; у Цераку я мыла мае ножкі.

Таўкачаватая рыжая маладзіца, што прыйшла ў вёску замуж з калісьці багатага хутара, з «ганаровай сям'і», расказвае:

— Урбанок хацеў нашу Маню ўзяць. Вельмі ж хацеў дастаць нашай пароды

Дзве «святыя сям'і» вельмі дружаць. У адной — сын жаніх, разумненькі, адкормлены, вясёлы здаравяк; у другой — дачка на выданні, мілавідная, з тоўстаю залацістай касой. Дачы побач. Купацца ходзяць павольненька. Там перакусваюць. А падвечар — таксама ціха і радасна — ідуць з гарадскімі сумкамі... у калгасны гарох.

Шырокая дачніца ў шахеразадным халаце велічна праплыла па вёсачцы з трыма лісічкамі ў манерна ўзнятай руцэ. Сама знайшла!..

За ёю — муж. З кошыкам. Сухашчавы, у паласатай піжаме. Як вязень канцлагера.

Разбрыджаная пры немцах мяшчаначка, амаль нявеста пажылога дырэктара райкамунгаса, былога партызана, калі ён працверазіуся і парваў з ёю адносіны, напісала яму вялікае, поўнае сілы і прыгажосці пісьмо:

«Ты ведь разбил хрустальную вазу нашей любви!,.»

Пра другога мужа яна, нарэшце, слравілася ў народнага артыста:

— Ці вялікая будучыня ў майго Васіля?
— Не думаю,— адказаў ёй народны.
Яна сабрала мужу чамадан, правяла яго да дзвярэй, абняла і ледзь не заплакала:
— Праводжу цябе, Васілёчак, як на курорт...
Гладкая, энергічная, адна дачушка ў разумненькай мамы — яна цяпер шукае трэцяга.
А Васілёчак, сяк-так таленавіты малады акцёр, вялы вясковы целяпень, пад чаркай бубніць знаёмым пра сваё гора...

Афіцэрская жонка, красуня і модніца. На людзях — ну, проста флакончык з духамі, а дома грызе свайго капітана:
— Ах, ты мне зарплату прыносіш!.. Думаеш, гэта яе табе даюць? Мне, мне даюць! За тое, што я штодня гляджу на тваё паганае рыла!..

Бывалая і важная курортніца хадзіла ў шторм па беразе. Адна.
— Мора так шуміць, так шуміць!.. Проста станеш ды думаеш... Ах, ды хіба ж гэта хто-небудзь зразумее!..

Упасвены пудоў на сем, а на курорт паехаў. Жонка звоніць пасля па аўтамату, хваліцца:
— Лёва не ўзяў ні кілаграма. Толькі вельмі пасвяжэў.
А Лёва, стоячы побач з тэлефоннай будкай, толькі пацее ды аддзімае,

П'яны, усадзіўшы ноччу галаву ў чужое, адчыненае акно:
— Людзі, устаньце, скажыце мне, дзе я і хто я?..

Чаму – падумалася цяпер – за сімвал міру ўзяты голуб, а не дзіця? Замурзанае, рассмяянае дзіця!..

Ляцім над акіянам. Дзесяць тысяч метраў.

У версе — блакіт, унізе — цьмяна-попельныя хмары. Паміж блакітам і хмарамі — ззаду за намі — вячэрняя зара. Чорнае крыло самалёта. Успамінаецца Рэрых.

Ноч. Непраглядная бездань за акном. Толькі нашы адлюстраванні на шыбе.

Пасля — звястунка раніцы — адзінокая зорачка. Зноў рэрыхаўская зара, ужо з усходу. Зноў чорны меч — крыло. Унізе — зноў шэры насціл хмар, пад якімі яшчэ ўсё акіян. Меч, бліжэй ад акна, спакваля пачынае паблісква́ць. Зару замурзваюць воблакі.

Светла-попельны колер хмар пад намі нагадвае то густы шарош на вадзе, то нядаўна астрыжаную аўчыну.

Зара разгараецца.

Стала ўтварацца вялізная ракавіна — з неба ўверсе і мармуровых хмар пад намі.

Сонца!

У падвясной калысцы прачнуўся чарнавокі французік і, зваласатай галоўкай на маміным плячы, паплыў па праходзе над галовамі пасажыраў. Чорныя вочкі ўсміхаюцца...

І хочацца на ўсіх мовах адразу сказаць яму:

— Добрай раніцы!

Навокал лісце і кветкі, а на руках у маладога бацькі — яго першая незабудка. Яна яшчэ ўсё маўчыць, відаць, ніяк не могучы пераступіць той парог, за якім, побач з разуменнем жыццёвых з'яў, будзе яшчэ і магчымасць падзяліцца з кім-небудзь першымі ўражаннямі і зародкамі думак. Яна маўчыць, наглядае ці проста глядзіць, час ад часу захоплена махае ручкай і вымаўляе нейкія дзіўныя, таямнічыя, смешныя падабенствы слоў. А потым, нібыта прагнаўшы ад сэрца шчаслівы, але цяжкаваты зарад уражанняў, зноў пачынае маўчаць...

Таму, што ў кожнай хвіліне нашага існавання бацьку хочацца бачыць няспынны рост яго дзяўчынкі, яму здаецца цяпер, што маўчанне і задуменны позірк яе — гэта першыя, ледзь бачныя адзнакі сталасці. І хлопцу чамусьці хочацца быць больш дзяцінным, чым яна. Ён прысядае з ёю на руцэ і з роснай травы ў сасновай засені паднімае на сонца фарфорава-белую кветку рамонка. Ручка працягваецца да яе, і смешна маленькія пальчыкі заціскаюць у жменьку зялёнае каліва. Заціскаюць і — так жа пацешна! — падаюць кветку ў рот, на першы, таксама фарфоравы зуб. Што ж ты зробіш,— такі ўжо спосаб праверкі на трэцяй сотні пражытых дзён!..

І вось ізноў яму радасна ад думкі, што яна, яго наступніца, пачынае жыццё ад пачатку, што ён паможа ёй пачаць яго лепш, чым сам пачынаў.

Чырванашчокі, вочы блішчаць, рукі ўсе падрапаны да крыві. Шчаслiва хваліцца бацьку, як забаўляўся з катом:

— Ён мяне лапкай, а я яго — люцькай!..

І столькі радасці, смеху!..

Ад новых непрыемнасцей па радыё, ад думак пра пагрозу новай вайны — сон быў цяжкі, кашмарны. Здаецца, я за горадам, у лесе. На Мінск упала атамная бомба, там ужо нікога няма, а мы тут толькі паслеплі. Таўкуся паміж дрэў, крычу. І гэта — горш за смерць!..

Прачнуўшыся, думаў пра сына: што я сказаў бы яму, калі б пачалася вайна, як растлумачыў бы ўсю яе страшную недарэчнасць?..

А потым ён абудзіўся, прыбег да мяне — доўгі, шчарбаты, цёпленькі — і ў перамежку паміж двума сваімі шчаслівымі снамі паведаміў:

— У Ірачкі паслязаўтра дзень нараджэння.

— Ты яе любіш?

— Ага.

— Мы ёй купім з табой шакаладку і ты занясеш?

— Ага.

Ірачцы, што гуляе з бабуляй на нашым двары,— два гады.

І ўсё гэта, вядома, вельмі важна.

Дзяўчынка так і пільнуе, калі той тата зноў будзе закурваць. Яна тады тушыць запалку. Пацешна і тое, як яна хукае, не могучы сагнаць з канца танюсенькай палачкі пушынку полымя і, яшчэ больш — яе ўпэўненасць, зусім сур'ёзная, у тым, што яна — памагае.

Уранні, як толькі ён, малады паэт,— калі з прыемнасцю, калі бязлітасна памыўшыся да пояса халоднай вадой,— заходзіў у свой рабочы пакойчык (яшчэ ўсё смешна было называць гэты куток кабінетам), адразу яго сустракала дачка. Партрэт на акне за пісьмовым сталом.

Падперла кулачкамі твар і зажурылася. Такія сур'ёзныя вочы. А губкі ўмеюць так пацешна надзімацца. Не злосна, ад клопату.

І подпіс пад фота: «Памагаю тату думаць».

У кіслым настроі ён нават фыркаў: «Сентыментальнасць, бабскія штучкі...»

Часцей, аднак, вітаўся з «сааўтаркай», і працавалася весялей.

Хлопчыку пяць гадоў. «Як мужчына мужчыне» — бацька расказаў яму, што такое ў сапраўднасці Дзед Мароз. І малы паверыў. Аднак, калі яму мама вярнула Дзеда — сказала, што тата пажартаваў, што Дзед прыходзіць, прыносіць пад ёлачку падарункі — хлопчык быў рады яшчэ больш.

Дзецям патрэбна казка. Яна не разбураецца сапраўднасцю.

На піянерскую ёлку хлопчыка ўзяла старэйшая сястра. Найбольш уразілі яго вялікі мішка і ліса, што разам з дзецьмі танцавалі вакол ёлкі. У перапынку ён убачыў, як ліса — зняўшы маску — піла ў буфеце піва. Спацелы дзядзя!.. Цягне з кухля, ажно лісіны хвост падрыгвае... А ўсё ж і пасля гэтага малы расказваў пра лісу — як яна з імі весела, пацешна выраблялa ў карагодзе!..

Гаварыў па міжгародннім тэлефоне з сынам.

У яго вялікі клопат. Заўтра трэба ехаць з мамай у грыбы, бо яго няма з кім пакінуць дома. І трэба вельмі раненька ўставаць... Голас — амаль праз слёзы.

А прычына, вядома, не ў гэтым. На суседні двор, месца іхніх баталій, прыйшоў экскаватар. І так жа добра глядзець, як ён капае канаву! Глядзець — не так сабе, не як-небудзь, а з даху гаража. Хоць мама і крычыць за гэта, хоць бацька — па тэлефоне цяпер — угаворвае быць асцярожным ды паслухмяным.

Пагаварылі мы з ім пра ўсё гэта, і так мне міла, і смешна, і пасур'ёзнаму добра было ад нашай дружбы!..

А назаўтра — званок. Мой друг, аказваецца, не вытрымаў саліднасці. Знайшоў адзін баравік і годзе: «Буду сядзець у машыне». Прыйшлі грыбніцы, глядзяць — яго няма. А потым голас — куды там ужо да геройства! — «Ма-ма» з самай верхавіны сасны... Страшна, вядома, страшна было, пакуль ён злазіў адтуль, і ручкі дрыжалі, і мама з цёткамі заміралі ўнізе, з усёй сілы трымаліся, каб не ахнуць ды не спалохаць яго...

— Ты што ж гэта, стары, экскаватар убачыць хацеў?

Разумею становішча, стараюся пытацца весела. Ды ў трубцы голас — поўны належнай пакоры, і вечнае:

— Я больш не буду.

Будзеш, хлопец! Будзь, хоць і страшна, хоць я і павінен казаць, што не трэба!..

Яна яшчэ спала б, хоць мухі роймя гудуць, дакучаюць, кусаюцца, хоць Васіль разроўся ў калысцы, што ледзь бабуля яго супа-

коіла, Ды вось прыйшоў Шурыкаў дзед. З бядою — учора малыя гулялі на іхнім двары і зацягнулі кудысьці аброць. Мілачку будзяць і шмат разоў, на ўсе лады гавораць ей пра аброць. Вочы малое сонна моргаюць, і гэтак жа клоніць зноў на падушку! Але Шурыкаў дзед яшчэ ўсё пытаецца:

— Ну і што, дзе аброць?

Прыходзіцца ўсё ж такі ўспомніць, што яна, «гэты во», мусіць там, на прыгуменні, дзе ляжыць перавернуты воз, дзе кошка несла вераб'я, а яны, «гэты во», пабеглі за ёю, забыўшыся пра гульню ў «коні»...

— Вось і ўсё, маладзец,— кажа Шурыкаў дзед.

Міла сядзіць у нерашучасці: ці спаць яшчэ, ці ўжо ўставаць?

— А ўжо ж,— кажа бабуля,— разбуркалася трохі, дык і уставай за адным скрыпам.

Памыкаўшы трохі, малая даецца апранаць яе. Рукі старое дрыжаць, а ўнучка ўжо шчабеча. Нібы здагадваючыся пра тое, што і удзень, і уначы мучыць яе бабулю, Міла расказвае сон:

— Я сплю, бабка, ляжу сабе і сплю, і сню — здаецца, нашы дзверы рры-ып і адчыніліся, а дзядзька Хведар — тыц у хату!..

Старая глядзіць на сваю шчабятуху, сумна ўсміхаецца і кажа:

— Ах ты, Ганулька!..

Міла ўжо ведае, што Канцавая Гануля — старая лгунка. «ілжэ і не круціцца,— кажа пра яе бабуля.— Нібы казку табе расказвае. Прыйшлі, кажа, надоечы сем ваўкоў, пад'елі на нашым двары са свінога карыта з рабым кныручком і палеглі на возе паспаць... і сон яна табе сасніць на ўсякую патрэбу — толькі слухай...»

Унучка сарамліва аблізваецца і моргае, ужо не соннымі вачыма.

Але, відаць, не каецца, што салгала,— яна ж хацела зрабіць сваей бабцы прыемнае.

Потым старая мые яе, выцірае, ставіць голымі каленкамі на падлогу і пачынае «маліць». Міла і сёння зноў памыляецца, за што цяпер дзякаваць бабінам у «бозі» — за «шчаслівы дзянёк» ці за «шчаслівую ночку», А баба зноў злуе:

— Нябось, пра рэпку дык ты не забудзешся!..

Па снеданні пачынаюцца гулі — сонца, трава, вясёлыя вочы, прыгажэйшы за ўсякую музыку смех, Ды вось зімой нарадзіўся Васіль, і трэба яго калыхаць, пільнаваць... Спяваючы яму пра ўсё тое стракатае, рудое ды вусатае,— пра курачку-рабку, пра лісічку, што падмятае хату, пра Ваську-ката, пра ўсё, што Міла навучылася ад бабы,— малая нянька часта думае, як гэта добра будзе, калі іх Васіль сам навучыцца тэпаць. Яна тады выведзе яго з сабой на вуліцу, як

Жэнька іхнюю Зосю. А часта яна, не могучы супакоіць свайго разяваку, кліча бабу ці маму з двара і з прыплачам крычыць:

— І што мне рабіць з гэтым дзіцёе? ідзі сама ды глядзі!..

Таксама лёгка, як салгаць бабулі, што сніла пра дзядзьку Хведара, Міла ўмее ўцячы ад Васіля, пакуль ён спіць або мармыча каля маміных грудзей.

Так яно выйшла і сёння. Пакуль мама карміла малога, нянька ціхенька шмыганула за дзверы.

Дзе ж гэта наша бабуля?..

Хутка поўдзень. Каровы з ранак прыйшлі. За гумнамі — кветкі цвітуць у высокай траве. А ў небе — хмаркі калмыкамі, белыя, як пух.

Колькі тут трэба для ціхага шчасця!.. Старая вырвалася ад унукаў ды гаршкоў, ужо зацяжкіх на спрацаваныя рукі, узяла даўгаваты кавалак тычкі і пагнала за гумно Падласку. Карова галодная, як звер,— паша ўжо голая, вытаўклі,— і старой вельмі добра глядзець, што тут трава — любата, што скацінка пад'есць. Сама ж прысела ў траве, каб не пускаць карову далёка, і думае, глядзіць, адпачываючы душой...

Ды Міла і тут яе знайшла.

— Бабо-о, го-оў! — гукае яна ўсцешана і — эх, чык, чык, як верабей — бяжыць. Абышла асцярожна Падласку, зайшла ў траву і павісла ў бабулі на шыі.

— А дай ты мне свет! — бароніцца тая. І ўжо смяецца, а потым пытае пра Васіля.

Міла кажа, што ён сабе спіць, а мама ў хаце... Але робіцца брыдка, што мама, можа, у грады пайшла... Нянька аблізваецца і слёзна моргае вейкамі.

Бабуля добрая. Яна кажа, што маці паглядзіць там малога і сама,— заплача, дык і з гарода можна пачуць. Нічога ёй, пані, не зробіцца, пакалыша.

— А дзе наш тата?

Ну дык і што, калі яна ўжо, Міла, ведае пра гэта?

— Пайшоў канюшыну касіць,— спакойна адказвае баба.

— Куды?

— Куды ж, туды — у поле.

Старая нават рукой паказала.

Далёка, мусіць, тое «туды»? Вунь аж дакуль трава, а потым поле, потым лес... Усё ў лёгенькай, зыбкай імгле, ажно лень пазіраць — не паднімаюцца вочы на сонца. А тут вось — кветкі!

— Бабка, я кветачак нарву?

— От калі хіба, нарві!

І пачалася Міліна сапраўдная малітва.

У мутнаватым блакіце звоняць, не сціхаюць жаўранкі. А нізам, па густой і глыбокай траве сігае цыбатымі, загарэлымі ножкамі бабіна Міла, збірае кветку да кветкі і моліцца песняй. Словы просяцца самі.

— Кве-та-чач-ка ма-я,
ха-ро-шань-ка-я!..—

дрыжыць над травою песня, трошкі падобная да звону жаўранкаў.

А потым — эх, матыль! Вялікі, жоўценькі, ён лятае з кветкі на кветку, садзіцца, зноў ляціць...

— Ма-ты-лё-ча-чак,
ха-ро-шань-кі!..—

дрыжыць песня ўдагон матылю.

Міла ўжо вунь як далёка ад бабы. А кветак у яе руцэ — усё больш ды больш.

Хлопчык гасцюе ў вёсцы, у дзядзькі-мастака. Бацька прыехаў адведаць малога. Вудзяць у рэчцы рыбу.

— Ну, як табе падабаецца дзядзька Іван? Што маўчыш? Добры ён, дзядзька, ці не?

— Дзядзька Іван бывав на літару ф спачатку і на літару і ў канцы.

— Як гэта?

Пасля вялікай паўзы:

— Фсякі — і добры, і не.

Рыба не бярэцца.

— Эх,— уздыхае малы.— Надаела. Як тады, калі мяне дзядзька Іван пасадзіць і рысуе.

А праз тры месяцы, ужо як першакласнік, ён прыходзіць дахаты і радасна паведамляе бацьку:

— Буду хадзіць у палац піянераў вучыцца рысаваць. Нарысую тады дзядзю Івана!

Смяецца — рад, што адпомсціць.

У хаце вечарынка. Хлопчыкам — па шэсць, па сем гадоў — дазволена любавацца з печы. Наглядзеліся, насмяяліся, і пацягнула на філасофію. Гавораць пра ікону «нараджэнне Хрыста».

— А, думаеш, было гэта?

— Было!

— Ты ведаеш!..— з пагардаю да меншага.

Той, раззадораны:

— Майго бацькі дзедаў дзядзька быў там і сам бачыў!..

Ён пакрыўдзіў яе, сваю дзяўчынку, і горка думаў, што цяпер трэба будзе знайсці нейкі ход, каб памірыцца.

А яна паплакала трохі і ўвечар, вяртаючыся са школы, купіла там, у школьным кіёску, два аркушы зялёнай паперы. На ягоны і свой пісьмовыя сталы. Чыстай, зялёнай, як маладзенькая рунь.

Што гэта, ад чаго — ад думак яе, васьмігадовага чалавека, ці проста пачуццё, любоў?..

Зіначка ледзь не трапіла пад машыну. Чула сігнал з-за павароткі, але ж ніяк не спыніла веласіпед. Ездзіць яна яшчэ не на сядле, а «ногу пад раму», і так не вельмі зручна тармазіць.

Шафер разгубіўся. Ірвануў улева, зламаў плот і паехаў у бульбу. Ужо і спыніцца не мог,— сябар, што побач сядзеў у кабіне, націснуў на тормаз...

Бываюць цуды! — і дзяўчынка жывая, кудысьці ўцякла, і веласіпед цэлы, і машына — потым убачылі — цэлая. Плот паставілі — проста ў момант. І плакаць хацелася дзядзьку-шафёру, а ён усміхаўся...

Толькі Зіначку не адразу знайшлі. Дый не знайшлі б — сама яна прыйшла аж з трэцяга гарода. Калі ўжо і тая машына даўно паехала, калі ўжо і баба крычала, крычала ды сціхла. Баялася, распусніца, што баба будзе біцца. За тое самае, што «лётае на гэтым лісапедзе, як шалёнае».

Зіначка есць малако з хлебам і ўжо расказвае:

— А я, бабка, у Сымонавай бульбе ляжу і ножкі свае гладжу, а яны ўсё дрыжаць!.. А яны ўсё дрыжаць!..

Жнівеньская раніца.

У рэдкім лесе — заліты сонцам папаратнік.

Пад адным такім парасонам хітра схаваўся вялікі падасінавік.

Дзяўчынка хадзіла, хадзіла па лесе і надарэмна толькі стамілася. Прылегла адпачыць, пасля расплюшчыла вочы — ён!.. Прыгожы, любы, як казачны прынц!..

Гразь сцягнулі нарэшце першыя прымаразкі. Надвор'е сёння яснае, здаровае. Сад падасланы жоўтым лісцем. На клёне яго ўжо амаль што няма, а бяроза яшчэ усё калыша ад ветрыку доўгімі залацістымі косамі.

Я абкопваў яблыні, ціха мармычучы ў добрым настроі...

А потым да мяне — вядома ж, цераз плот — прыйшоў сусед. Худзенькі, абадраны Сашка, з рэдкімі, светлымі валасамі, з-за якіх яго і празвалі Лысым.

У Сашкі нямоглы бацька і тоўстая сястра, гультайка Марта. Маці памерла — як на памяць шасцігадовага хлопчыка — вельмі даўно.

Сёння Лысы таксама ў добрым настроі. Можа таму, што ўвечары «дзяды» — поліўка з пеўнем, капуста, яечня, аладкі... Дванаццаць страў! І ўсё трэба есці — ад «кануны», накрышанай булкі ў салодкай вадзе, да густой пансаковай кашы, якая ставіцца на стол дванаццатай. Хоць лыжку адну, а вазьмі. Спрадвечны звычай памінак, «дзядоў», на ядзе ўжо толькі і трымаецца. Хіба што бабка якая ў каго і памоліцца за душачкі ўмарлыя, а так — садзяцца людзі і сапуць над місамі — за ўсё недаяданне — у дванаццаць столак!.. Ну дык як тут і Сашку не цешыцца?..

Лысы выняў з кішэні падвойную костку пеўневай нагі, адцягнуў кавалак сырамяткі, прывязанай за гузік, пакланіўся і пытаецца:

— Можа вам што сыграць, пане Сцяпане?

— Ну, ну...

— Січас, пачакайце, настрою гармошку.

Сеўшы на камені каля плота, ён заіграў. Шморгаў, як смыкам, косткай па сырамятцы і, пераймаючы не скрыпку, а гармонік, галёкаў:

— Тува, тува, тува-ва!.. Тува, тува, тува-ва!..

Так паўтаралася бясконца. І на кожным «тува-ва» бледны твар Лысага аж крывіўся ад смакаты, як ад болю, аж вочы плюшчыліся, аж закідалася назад і весела пагойдвалася галава!..

З вуліцы, цераз брамку, прыбеглі Сыты і Худы. Адразу ж далучыліся да музыкі. Худы, рухавы і спрытны малец, Сашкаў аднагодак, махнуўся па садзе, падняў канчар нейкай дошкі і камень, прысеў і пачаў барабаніць. А меншы, тоўсценькі карантыш Сыты, з нястачы хоць якога струманту, паўсаджваў адубелыя ручкі ў кішэні і, прысеўшы ад стараннасці, верашчаў з усёй сілы Лысаму ў тон. Тое самае «тува-ва» — то басам, аж гарлякі надзімаліся, то падрываючы угару, ды так высока, тоненька, нібыта хочучы, каб іх пачуў увесь свет!..

Я ледзь не лажу ад рогату. Маці Худога і Сытага, Каваліха, выйшла з вёдрамі ла ваду, спынілася на вуліцы, слухае і смяецца. Тоўстая Марта таксама пачула музыку, выйшла на двор,

— Пайшоў дахаты, здыхоцце ты! Я скажу, нябось, бацьку!

А малыя — яшчэ мацней.

Крычала, крычала Марта, ды — глядзіце! — ужо і яна рагоча. Успёрлася локцямі на нізкі плот і аж заходзіцца, ажно тоўстыя плечы ды тарбаватыя грудзі трасуцца,

— Божа мой, божачка! — кажа ледзь не праз слёзы.— і калі ў цябе будзе які-небудзь розум!..

...Ціхі, марозлівы вечар. Яшчэ зара не пагасла зусім, а зоркі ўжо відаць — адна, другая, трэцяя... «Дзяды» яшчэ не davараны — агні гараць пакуль што толькі ў вокнах кухняў.

Стаю на вуліцы, каля брамкі, маўчу. Кавалішын Толя, старэйшы брат Худога і Сытага, выйшаў трохі пазней, не заўважыў мяне і таксама стаіць — цераз вуліцу, перад сваім гародчыкам.

Ды вось направа ад мяне, каля суседавых варот, адліпла, запішчала завесамі, стукнула брамка і на сярэдзіну вуліцы выйшаў Лысы.

Стаў і свішча, няўмела яшчэ, па-малечы.

— На, Цюлік, на! — падмацаваў ён крыкам свіст.— На цю, на!..

— Навошта ён табе? — спытаўся Толя.

Сашка ладышоў да яго і прыцішана, па-дзелавому пачаў:

— Цюлік недзе прапаў. Ты толькі не кажы нікому, Анатоль, бо Марта будзе біцца. Яна сёння два пеўні зарэзала, нашага і Якубавых. Трэба Цюліку кішкі аддаць, каб было шыта-крыта! Дзяды, панімаеш?.. На, Цюлік, на!..

Усламінаю крык і таўстаморды смех над шэрымі штакетамі:

«Божа мой, божачка!,.»

І сам смяюся ціха.

Толькі з іншага.

Расказвае вясковая суседачка; пяць з палавінай гадоў і хустачка завязана «пад бараду».

— Мама паліла ў печы, і каб трошачкі, дык загарэлася б у нашым коміне. І мы вельмі спалохаліся. А таты не было. Ён самагонку гнаў. Тады ён прыносіць яе ў мяшку і кажа: «Давай зробім па чарцы. Дзякуй богу, што так абышлося». І мама таксама піла. А я не ўзяла ні грама.

Сямігадовы Шура:

— Хто табе, дзядзька, куртку чарнілам абліў?

Расказваю, як наша цётка, госця з далёкай вёскі, таўханула незнарок этажэрку і адтуль на куртку звалілася чарніліца.

— І цётка ваша тады адразу дахаты пай шла?

Гаспадыня крышыць капусту, а кватарантка-настаўніца сядзіць побач з малой дзяўчынкай на руках. Малая цягнецца да капусты.

— Раечка, не чапай!

— Ты ж ведаеш, мама, што малыя дзеці наогул любяць усё чапаць.

У доме адпачынку.

Шчаслівая пара корміць на людзях сына, здаравеннага дванаццацігадовага пестуна.

— Што ж ты, Вова? Гэта ж не дома. Можа, хоць каву будзеш піць?

Вова — басам:

— А яна натуральная?

Няньцы чатыры гады, меншай сястрычцы два. Госці ў бабулі на хутары, яны ідуць па садзе. Большая па прывычцы дае «нашай малой» чарговае настаўленне:

— Днём свеціць сонца, а вечарам лямпа...

Праз дзірку ў плоце вылазяць з саду на выган. Воддаль пасецца кабыла з жарабём. Туды няможна, а вельмі хочацца. І нянька гукае:

— Коська-а, ідзі сюды! І з рыжыбяткам! Толькі не задаўляйце нас...

Вясковыя піянеры вітаюць пісьменнікаў, што прыехалі выступаць. «Слова для прывітання» падрыхтаваў ім сам дырэктар. Стаіць сабе збоку і, па выгляду, не хвалюецца за выдатніц. Ды вось першая з іх, самая надзейная, памылілася:

— Дазвольце пажадаць вам гэты букет...

Тры наступныя паўтарылі за ёю — дакладна.

Дырэктар аж пачырванеў.

Чаго?

Пажылы артыст выступаў у школе.

Пакуль ён грымеў сваім падношаным ужо, рыпучым басам, сямі і васьмікласніцы хіхікалі з яго грымасаў. Пасля цікавалі праз дзверы, як ён за кулісамі частаваў сваю акампаньятарку цукеркамі з партфеля — «нібы з конскай торбы»,— а потым пераабуваўся з туфляў у валёнкі. І шкарпэткі яго былі абедзве з працёртымі пятамі...

Бацька адной з дзяўчатак расказаў пра гэта на рабоце.

Таварыш яго аказаўся суседам артыста. Пасмяяўся з гэтага дома, толькі з жонкай, калі ўжо іхняя малая спала.

Назаўтра малая, што «спала», сустрэлася з басам на лесвічнай пляцоўцы:

— Дзядзя Бора, а чаму гэта ў вас, калі вы спяваеце, усе шкарпэткі без пят?..

У дзіцячым доме выступалі паэт і празаік. Пасля выступлення адзін з астрыжаных пад машынку аматараў сур'ёзнай літаратуры звярнуўся да паэта:

— Дзядзя, вы таксама пішаце кнігі ці толькі вершыкі?

Збянтэжаны паэт:

— Ну, разумееш... з вершаў таксама складаюцца кнігі...

Вучань:

— Кнігі — гэта кнігі...

Мама прыйшла!..

Хлопчык сядзіць побач з ёю на сваім бальнічным ложку, есць салодкую булку, махае ножкага ў гіпсе і радасна расказвае:

— Сястра казала, што я такі худы, што няма дзе банькі ставіць — адны косці. А паставіла, дык палавіну банькі мяса нацягнула!..

У піянерскай газеце надрукавана анкета КЦС— «клуба цікавых сустрэч».

Праглядаю дзіцячыя пісьмы, адказы на анкетныя пытанні.

Пытанне:

«З кім са слаўных людзей нашай рэспублікі ты хацеў бы сустрэцца ў новым навучальным годзе на пасяджэннях нашага клуба? Чым цябе зацікавіў гэты герой?»

Адказ вясковага сямікласніка:

«З таварышам І. А. Грыбовічам. Ён не адказаў на два мае пісьмы».

Таварыш Грыбовіч — салідны, заакуляраны супрацоўнік рэдакцыі, адзін з арганізатараў таго КЦС.

Малец з чацвёртага класа піша ў піянерскую газету пра непаладкі ў іхняй школе.

— Здольнасці ёсць, але ж залішне ён нейкі сур'ёзны, не па гадах,— кажа сваім супрацоўнікам цёця рэдактар, поўная строгая дама. І яна вырашае заняцца гэтым талентам сама.

«Напішы нам, Валодзя, як вы святкавалі ёлку».

У адказ апісана ёлка ў вясковай школе, а потым — прыпіска:

«Наш дырэктар, Мікалай Пятровіч Чыжык, купіў на сабраныя вучнямі грошы цукерак і большую палавіну забраў сабе...»

Цёця рэдактар піша яшчэ больш педагагічны ліст:

«Напішы нам, Валодзя, пра вясну — як яна прыйшла ў ваш калгас, колькі радасці яна прынесла рабятам вашай школы. Паспрабуй апісаць гэта вершам».

Вершык прысланы доўгі, грунтоўны і... з празаічнай прыпіскай:

«А наш дырэктар усё ж такі злодзей».

Цётка рэдактар пакуль што ў часовым адчаі.

Хлопчык глядзіць на маладзік. Дадумаўся:

— Ён прабіў трохі неба і вылез!

Пра старэйшых сястрычак:

— Аню люблю да самага сонца, а Нінку толькі да правадоў.

Позна ўвечары, калі ён вяртаўся з завода, дома яго чакала амаль заўсёды тое самае.

Алеся ўжо спала. На радыятары пад акном сохлі ці проста грэліся да раніцы яе маленькія, нястомныя валёнкі. Чорны плюшавы мішка сядзеў побач з ложкам на тумбачцы. Цярплівы мядзведзік, з адной-адзінай лапай застаўся, і смешны сёння — абвязаны хусткай, з-пад якое відаць толькі вострая мызачка і чорныя гузікі бяссонных вачэй. Лялька Зося ляжыць побач з «мамай» Алесяй, клапатліва накрытая коўдрай. Сёння «мама» памыла яе сукенку, якая сохне на радыятары побач з валёнкамі.

Нібыта поўны парадак...

А гэта што?

Заяц у штоніках пакрыўджана ляжыць каля тумбачкі, уткнуўшыся носам у куток.

— Хадзі сюды,— усміхаецца малады гаспадар, Ён паднімае шарака і садзіць яго побач з мішкам. Зухаватае вуха вясёлага зайкі зноў апускаецца, як заўсёды, калі ён бывае ў добрым настроі, а на вусатай мордачцы ажывае усмешка. Так і здаецца, што вось ён возьме зараз і ўтрэ лапкай слязу са шчакі. Як у казцы.

— Сплю,— шэпча бацька, схіліўшыся над Алесяй.

— Не пабудзі,— ад стала кажа маці-настаўніца.— Ты ж з холаду. І яшчэ не памыўся.

Бацька, аднак, напінаецца і асцярожна цалуе сваю ненаглядную радасць, нібы здымаючы з цёпленькіх вуснаў салодкую ўсмешку. Дзе

там пабудзіш! — малая нават не зварухнулася. І губкі таксама смяюцца праз сон.

— Сцяжок успомніла,— усміхаецца, падыходзячы, мама — ужо не настаўніца.

— Які сцяжок?

— Ты ведаеш, яна ўжо добра, добра ўсё памятае. Прыйшла сёння з двара і пытаецца: «А калі я пайду са сцяжком, як тады? Калі будзе сонейка, траўка?..» Я заходзіла сёння на Камсамольскую. Няма яшчэ першамайскіх сцяжкоў...

Бацька смяецца: — У лютым?

Алесіна мама здаецца яму... ну, куды маладзейшай за свае дваццаць тры. І сёння — яшчэ больш падобнай да Алеі.

— Толькі і радасці з дзяцей, калі іх водзіш за ручку,— кажа заўчасна пастарэлая і стомленая маці.

Дзеці пакідаюць бацькоў (часамі вельмі няўдзячна), а потым вяртаюцца да іх у выглядзе ўнукаў. І таму, кажуць, бабулі любяць унукаў больш, чым калісьці любілі дзяцей.

Трымаць за ручку жыццё, якое вось і прайшло, і ўцякае!..

Дарога Ратэрдам — Амстэрдам.

Раўніна. Багаты лес: дубы, вязы, платаны, клёны, ліпы... Парнікі і адкрытыя грады. Прыгожыя домікі, ветракі, касцёлы, зноў ветракі... На сакавіта зялёных паплавах чорна-пярэстыя каровы. Вада не ўмяшчаецца ў незлічоных канавах, блішчыць нават на раллі, Раскошная аўтастрада. Абапал — вузкія, простыя палявыя дарогі, таксама асфальт у прысадах. Сонечны дзень...

Сонечны дзень у дажджлівай, пахмурнай Галандыі!.. У сярэднім ён тут бывае адзін раз на тыдзень. Цяпер, у кастрычніку, гэта зусім незвычайна, як дарагі падарунак.

А дзень — адзін, праездам, дзень у краіне, пра якую ты столькі ведаў здалёк і як быццам не ведаў нічога?..

Вось і настрой таму таксама сонечны.

Успамінаю маленства, стары рускі часопіс «Маяк», апавяданне пра падарожжа блізнятак Кіта і Кэт. Першае падарожжа з дзедам да мора.

Малыя сядзелі на нейкім мастку, потым у Кэт зваліўся ў ваду драўляны выступак. А за выступкам — абое блізнят. Дзядуля дастаў іх, засыпаў па шыю ў пясок, каб не змерзлі, пакуль высахне вопратка...

Прайшло брльш трыццаці гадоў. А мне — з акна турысцкага аўтобуса — толькі і хочацца глядзець на далягляд, шукаць вачыма паласу, мусіць, недалёкага мора, а на беразе яго — мілыя мордачкі Кіта і Кэт. Яшчэ ўсё над пірамідкамі пяшчотна цёплага пяску...

У паляшуцкай хаце. З вышытымі ручнікамі на сцяне, з прыёмнікам на століку.

Шасцігадовая дзяўчынка любіць мачаху, як маму.

Мачаха — маладзіца і праўда вельмі прыемная, але ж... Малая памятае сваю матулю ў труне і лічыць, колькі год ужо лічыць, што мачаха — мама яе, якая вярнулася...

Як яно будзе далей?

Бірабіджан.

Пасля купання ў маляўнічай, раскошнай Біры, за якою, пад самымі спякотна-зялёнымі сопкамі, здорава адгукаецца рэха, мы паехалі ў піянерскі лагер.

Акунуліся ў цудоўны свет усюды любых — куды там кветкі! — дзяцей. Выступалі перад імі. І зноў шкадаваў, што не пішу, што так мала пісаў для малых. Хадзілі лугам да возера, дзе мноства абшарпаных хлопчыкаў і акуратных дзяўчатак наперабой даставалі нам з вады, на ўспамін, калючыя вадзяныя арэхі і ракушкі.

Пацешная наіўнасць!.. Хлапчук, які сядзеў побач са мной, пакуль мы выступалі, усё абмацваў мяне сваёй увагай, як чужаземца, і, нарэшце, не вытрываў, спытаўся шэптам:

— Дядя, а цифры на ваших часах — белорусские?..

Далёка ўсё-такі з нашага Ўсходу на Захад!

Потым абедалі ў лагернай сталоўцы, елі гарачы флоцкі боршч, рысавую кашу з качкай, пілі кампот. Гарачыня, гасцінна вялізныя порцыі. Я прасіўся ў дзяжурнага, што не з'ем, і ён — «любімец усяго лагера», маленькі, рабенькі Фімка ў белым фартушку — паблажліва, сур'ёзна паляпваў мяне па плячы і падбадзёрваў:

— Ешьте, ешьте, дядя, ничего!..

Здымаліся з дзецьмі.

І Фімка Месамед, пры ўсёй сваёй сур'ёзнасці, не пярэчыў, калі я, пад агульны смех адабрэння, узяў яго, гаспадара,— «Я перешел в четвертый класс» — на рукі.

Напярэдадні быў дождж. Чатырохгадовы Міхась налазіўся па макрэчы, а цяпер чаравічкі не лезуць на ногі. Ён падумаў і вырашыў:

— Пахудзелі.

Напрадвесні яшчэ ўсё то лядок, то брудны снег, то лужыны, то голая зямля. Снег пад нагамі трымаецца, а ступіш на зямлю — так і зачэрпаеш лапцем гразі...

Але неба ўжо вясёлае. З прасветлінамі ў хмарах, хаця і халоднае.

Два хлопчыкі ідуць за мамай з вёскі ў вёску, па палявой дарозе.

Маці нясе пад пахай скрутак шарачку, загорнуты ў хустку. Высокая і дужая, яна маўчыць, ідзе шырока і цягавіта, нібы ў ярме сваёй удовінай долі. Тая ж маці, што толькі паўгода таму назад, калі мёртвы бацька ляжаў яшчэ на ложку, а ў хаце былі сама ды малыя — кідалася ад стала да парога і, нема галосячы, ірвала жменямі валасы. Адна, твар у твар са сваім неабдымным горам... Ды вось жыве, гаспадарыць. Толькі і радасці — дзеці. Андрэй і Мішка. Не скажаш, што горшыя, чым у добрых людзей. І вучацца ўжо абодва, і дружаць. Трохі, вядома, распусныя, трэба глядзець...

— Вы ўжо хоць там, у хроснага, не выскаляйцеся лішне,— кажа яна, не азіраючыся.— Трэба харошымі быць, каб усе хвалілі.

— Што ж мы, сабакі — выскаляцца?— адказвае большы, Андрэй.

— Ну, ты глядзі ў мяне! З цябе, нябось, усе свечкі і загараюцца!..

Андрэеў хросны, дзядзька Макар, кравец. Малы, гарбаценькі, з вялікай галавой, Порткі суконныя, шырозныя — ажно ў зборкі пайшлі. У высокіх валенках, аж ногі не гнуцца.

Толькі хлопчыкі з мамай увайшлі ў яго хату, устаў з-за машыны, пачаў:

— Лізавета Іванаўна, кума! Андрэйка, хросьнічак мой ненаглядны! Мішка!.. Сіроткі мае, чым жа вас ласаваць, чым сустракаць?..

І — эх! — заківаўся, замітусіўся па хаце. Кошык з бульбай кашкануў валенкам пад палок, лап'ё, што ляжала на лаве, шпурнуў у запечак... А хата, хата ў яго!.. Цёмная, нізкая, ток пабіла на ямы...

— Не прастарэкуй ты лішне, Макар. Садзіся вось ды шый.

— А як жа ты, Лізаветка,— ты ж нешта прынесла?

— Паспею. Дай хоць адсапціся.

— Сядзь, дарагая, сядзь. Сагрэй бяседай сэрцайка. Яно ж і спяваецца: «Ах, божа ж мой, адзінога мая, прападае ўся работа мая!..»

Хросны сеў за машыну, заварушыў вялізнымі валенкамі на рашотцы, і першы цуд яго беднай хаціны — магутны «Зінгер» — загаманіў.

Мішка спачатку, цікаўна застыўшы, сачыў, як скача-гуляе бліскучасты шпянёк, як круціцца белая шпулька. А потым — усё адно і тое ж, адно і тое ж... І ён пачаў патроху ныць:

— Мама, хадзем дадому... Мама...

— Паспееш. І дыхнуць з-за вас няма калі.

— Яны сумуюць, Лізаветка. Вось я вам, хлопцы, нештачка дам.

Хросны ўзяў зэдлік, паставіў пад бэлькай і цяжка ўзлез на яго: спачатку каленьмі, а потым ужо... Хата ў яго даўнейшая: упоперак бэлек яшчэ адна бэлька паложана — трам. Хросны сігануў рукой за гэты трам і дастаў адтуль другі цуд свае хаты — кнігу!.. Абабіў з яе пыл аб шырачэзныя порткі, абабраў рукой павуцінне, падаў бліжэйшаму, Андрэю.

— Яшчэ ў горадзе мне падарылі. Хадзяін, у якога я вучыўся шыць. Дзяцей мне госпад не дае, дык вось яна тут і ляжыць.

У кнізе той цацкі — ну, як жывыя!..

На перша й старонцы — зямлянка, градкі капусты, а на парозе стаіць сабе вожык.

На задніх лапках, у сіняй камзэлі, у чырвоных портках са шлейкамі, у выступках. Пакурвае люльку, глядзіць на грады, і вось-вось скажа: «П-пых!»

— Цікні,— шапнуў Мішку Андрэй.— Мой хросны!

І абодва яны аж зайшліся ад ціхага смеху.

— Ты, Андрэйка, чытай. Ты ж старэйшы. Бо гэта харошая кніжка. «Жыў сабе, быў сабе дзядзя Ёж...»

А яны рагаталі, як дурні.

Пасля пачалася прымерка.

Хросны раскаціў на стале шарачак і аберуч пагладзіў яго.

— Роўненькі, гладзенькі... Шоўк! Залатыя ручкі ў цябе, кумачка...

— От, мерай ты, Макар. Каторая пара.

— І паабедаеце, госцікі дарагія, у мяне. Пасоля з картопляй — чым багат, тым і рад. Прынцэсы мае няма: пайшла ўчора да цёшчы. Сам навварыў.

Ён узяў пакамечаны сшытак, разгарнуў яго і, жмурачыся, пачаў выводзіць тупым алоўкам:

лізавецін. мішка. пятровіч. Штаны.

Тады прыгнуўся са сваім «сантыметрам» да Мішкавых портак.

— Ага,— схамянуўся ён, адагнуўшыся.— А як жа будзем шыць: бручкі абыкнавенныя ці з засланкай?

— Ат, бручкі-шмучкі! Жартачкі — кавалеры! З засланкай Ды з нагруднікам. Абодвум.

— Даўжыня: сямдзесят два,— сказаў і запісаў хросны.— Подшаг,— шапнуў ён і, адной рукой прыцiснуўшы канец «сантыметра» ў Мішкавым куточку, другой рукой павёў «сантыметр» да лапцей.

Сам ён, хросны, маленькі і так, а сагнецца — дык і зусім. А за ім стаіць Андрэй, Разгарнуў тую кнігу на першай старонцы, дзе вожык у

портках, і — зараза! — падморгвае. Мішка надзьмуўся як сіла мага і маўчыць. Ды тут падвёў сам хросны. Ён цяжка адагнуўся і, з натугі:

— П-пых!

Хлопчыкі пырхнулі смехам.

І мама здагадалася, нарэшце, што тут да чаго. Забрала кнігу, крутанула Андрэя за вуха, а кнігу, нават не стаўшы на зэдлік, палажыла на трам.

Хросны маўчаў, зачырванеўшыся.

Ды хлопцам брыдка было нядоўга.

Трэцім цудам старэнькай хаціны — з падпечка раптам выйшаў чорна-пярэсты голуб. Чубаты. А на шыі і валляку Мігцела, пераліваласся ад хады сінявата-чырвона-зялёнае хараство. Знайшоў саломінку і горда павалок пад печ.

Хлопцы заціхлі заварожана: ці выйдзе зноў?..

— Яечкі панеслі,— з усмешкай, ціха сказаў, зусім ужо добры, хросны.— Чуеце, як ён брукуе? А гэта — яна. Так душэўна... А я вам, хлопчыкі, парачку дам. І прывучыць скажу як. О, чуеце?..

Потым елі «пасолю з картопляй». І харошым, разумным хацелася быць, але дзе ж тут набудзеш?.. У хроснага лыжкі драўляныя і круглыя, як жалудовыя місачкі. А на канцах чаранкоў— яшчэ і бульбачкі нейкія. Смешна! Ну, ды гэта яшчэ нішто... Бо вось ён, стары ўжо дзядзька Макар, трымае лыжку так, што тая бульбачка тырчыць у яго паміж пальцаў... Аж мама не вытрывала:

— Што ты мне гэтай хвігай тыцкаеш пад нос?

Хросны зірнуў на руку, здагадаўся і, чырвоны ад смеху, які спачатку хацеў стрымаць, прашаптаў:

— Сорак другі год так свянчуся... Ніяк не адвыкну...

І ад душы зарагатаў,

А з ім разам, вядома, і хлопцы.

Нават і мама, што так даўно не смяялася. Чацвёрты цуд!..

Мароз і сонца. У клетках гарацьвясёлай чырванню снегіры, таўкуцца шэрыя чачоткі, як сонечныя зайчыкі скачуць па пруціках шчыглы. Шмат галубоў. Непаэтычна неяк, груба гавораць пра іх галубятнікі,— нібы гэта ў іх сапраўды толькі гандаль, а не паэзія.

Самае незвычайнае, што я ўбачыў там, на птушыным рынку, за ўсе гады:

Хлопчык доўга стаяў, любаваўся, прыцэньваўся, пасля купіў чачотку,— па грашах,— адышоўся трохі з натоўпу і выпусціў яе з рукі. Глядзеў услед. Нават пасля таго, як знікла...

У міжгароднім аўтобусе. За маёю спіной малы гаворыць з бабуляй:

— А чаму ў цябе такі ногаць вялікі?.. Бабка, пагладзь маю ручку, пагладзь!..

Якая ж бездань паміж гэтай чыстай душой і нячыстай рукой яго бабы, нядаўна скінутай з пасады старшыні калгаса! «За злоўжыванне службовым становішчам...»

Стаім у мястэчку. Піжоністы рыжы сабака сядзіць на асфальце, на самай сярэдзіне шашы. А хлопчык непакоіцца, ледзь не да слёз:

— Цюцьку машына зарэжа!.. Бабка!..

Не адчуеш так поўна і непасрэдна.

А шчэбет ягоны — амаль непаўторны, бо ён не паддаецца перадачы словамі дарослага.

Думаў пра абнаўленне душы самай высокай паэзіяй — паэзіяй маленства. Безліч граняў гэтай паэзіі, як безліч сонечных промняў і пырскаў расы ў гэтых промнях.

Адпяваюць старога Навума. У хаце, дзе ўжо спявалі — па радыё — і Робсан, і Казлоўскі, і Ларэці, гудзе старэнькі поп, а дзве пеўчыя цягнуць, калісьці прыгожымі галасамі, пра «житейское море» і «тихое пристанище».

І ўсё гэта гучыць як не з гэтага, не з нашага свету.

А потым — ціхая паўза, і з сяней, таксама забітых людзьмі, чуецца голас малога, з бацькавых рук:

— А дзе мой дзед Аюм?

І па людзях-суседзях, што ведаюць малога Коліка, які вельмі сябраваў з нябожчыкам, пайшоў ціхенькі, толькі ў думках, смяшок.

А то, можа, мне проста здалося?

Бабуля расказвае:

— Адзін брат, бяздзетны багацей, хваліўся другому, бедняку, як ён гуляе па сваіх пакоях з «залатымі калясцамі».

А бядняк той пазычыў яшчэ раз міску мукі, зварыў сваім дзецям зацірку — эх, разгулялася тая малеча ад радасці...

«Вось табе,— думае ён,— залатыя калясцы!..»

Васемнаццацігадовая, дробненькая дзяўчына, хатняя работніца:

— У каго я, цётачка, малых ні няньчыла — усюды яны на мяне ўсе падобныя! Люблю я іх, хоць яны мне з самага малку рукі, цётачка, паўрывалі...

Цудоўны дзень,— з глыбокім снегам, што лёг учора, з марозікам, сонцам, з прыволлем, якім я толькі што любаваўся з гары, з цішынёй, што так добра лажыцца на душу,— цудоўны!..

Зайшоў на котлішча былога прыдарожнага хутара. Стаяў у зарасніку дзядоўніку, Ён — ну, італьянскія лініі: разгалісты і высокі, у рост чалавека.

Думалася пра шчасце пазнавання свету, пра майго хлопчыка з яго бясконцымі, нястомнымі «чаму?».

Як ён глядзеў бы на шматфарбны цуд — шчыгла ці снегіра на гэтых шчодрых шышках!..

Добра, што і мне яшчэ хочацца так пазіраць — яго вачыма, з яго усмешкай. Не баючыся, што «брыдка» — калі б хто ўбачыў,— «не саліднa» мне лезці сюды цераз глыбокі, заваленый снегам меліярацыйны роў.

У Находцы, аглядаючы порт, суднарамонтны завод і горад, я адчуваў яшчэ раз — да захаплення выразна, маштабна — магутнасць нашай краіны.

Была пасля багатая прыгажосць нашых двухсот кіламетраў — паміж зелянінаю сопак, на арліных перавалах, у далінах, прастрэленых вячэрнім сонцам.

Быў шум у паўцемры — шумела Японскае мора.

Была цішыня — у тайзе, калі мы спыняліся і ўражана глядзелі на бясконцыя пробліскі ў цемры казачных светлячкоў...

А я вось, прачнуўшыся ў нумары ўладзівастоцкай гасцініцы, успомніў — як найлепшае з усяго, перажытага ўчора,— смяшлівага, замурзанага, босага хлопчыка-карэйца, што ў вёсцы, дзе мы спыняліся, разам з рускімі сябрукамі гуляў у «хавачкі». І рагатаў сардэчна, і сарамліва маўчаў, і вельмі ж смешна яму было, ну проста не стрываць, калі адказваў на мае пытанні...

Чаму — падумалася цяпер — за сімвал міру ўзяты голуб, а не дзіця? Замурзанае, рассмяянае дзіця!..

Брыль Янка.

Жменя сонечных промняў.

Мінск, «Беларусь», 1965.

На белорусском языке.

Иван Антонович Брыль.
Горсть солнечных лучей.
Издательство «Беларусь» Государственного комитета Совета Министров Белорусской ССР по печати. Редакция художественной литературы. Минск, 1965.
Рэдактар Л. Арабей.
Мастак Б. Заборaў.
Мастацкі рэдактар Л. Прагін.
Тэхнічны рэдактар Н. Сцяпанава.
Карэктар А. Сачкова.
АТ 03855. Здадзена ў набор 12і11 1965 г. Падп. да друку 26.VI 1965 г. Тыраж 6700 экз. Фармат 60Х70З2Ф'З. друк. арк. 7,25. Ум. друк. арк. 6,82. Уч.-выд. арк. 5,8. Зак. 649. Цана 29 кап.
Паліграфічны камбінат імя Я. Коласа Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў Беларускай ССР па друку. Мінск, Чырвоная, 23.